Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СУБОТА № 210 (28320)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Санаторыі — наш брэнд? СТАР. 4



Святар-відэаблогер СТАР. 9



У закуліссі «Лістапада» СТАР. 17

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «НА ШЛЯХУ ПАБУДОВЫ ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ ТРЭБА ПАСЛЯДОЎНА І РАШУЧА РУХАЦЦА НАПЕРАД»



Фота БЕЛТА.

**Правядзенне ў Мінску пасяджэнняў кіраўнікоў урадаў Еўразійскага эканамічнага саюза і Садружнасці Незалежных Дзяржаў у Беларусі разглядаюць як прызнанне актыўнай інтэграцыйнай палітыкі краіны, заявіў Аляксандр Лукашэнка ў час сустрэчы з кіраўнікамі ўрадавых дэлегацый ЕАЭС і СНД, перадае карэспандэнт БЕЛТА.** СТАР. 2

■ Полюс інтарэсаў

## Не імідж, а практычная неабходнасць

### Стартавала дзявятая беларуская антарктычная экспедыцыя



Фота БЕЛТА.

**ПАЛЯРНІКІ сустрэліся з грамадскасцю, каб расказаць пра досвед мінулых экспедыцый і ва ўрачыстай абстаноўцы пачаць чарговую. Сёлета навуковая супольнасць краіны адзначае юбілей — ужо дзесяць гадоў Беларусь вядзе рэгулярныя навуковыя і экспедыцыйныя даследаванні ў Антарктыцы. Якія планы навукоўцаў на бліжэйшыя гады і што будзе зроблена непасрэдна падчас экспедыцыі?**

— Пачнецца рэалізацыя дзяржаўнай праграмы палярных даследаванняў на 2016—2020 гады, — расказаў **начальнік Беларускай антарктычнай экспедыцыі Аляксей ГАЙДАШОЎ.** — У адрозненне ад папярэдніх дзвюх праграм, мы паставілі вельмі амбіцыйныя мэты, дасягнуць якіх разлічваем ужо напрыканцы пяцігодкі. Па-першае, плануецца завяршыць будаўніцтва першай чаргі Беларускай антарктычнай станцыі. Па-другое, мы будзем падаваць заяўку на атрыманне статусу кансультатыўнага боку Дамовы аб Антарктыцы. Па-трэцяе, збіраемся ўпершыню правесці зімовачныя круглагадовыя мерапрыемствы ў 2019—2020 або ў 2020—2021 гадах. Безумоўна, будзе рэалізоўвацца і новая навуковая праграма, якая складаецца з даследаванняў па пяці кірунках. СТАР. 3

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Тарас НАДОЛЬНЫ, першы намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Сёння перад намі стаіць задача ўтрымаць інфляцыю на ўзроўні 12%. У 2017 годзе мы плануем выйсці на 9%, да 2020 года атрымаць вынік, які стане самым лепшым за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі, — 5%. Той інструмент манетарнага таргетавання, які мы цяпер выкарыстоўваем для кантролю шырокай грашовай масы, стварае ўсе перадумовы, каб мы дасягнулі такога выніку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9065 | ▼ |
| Еўра | 2,0820 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0306 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0747 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

16210

■ Ёсць нагода

Сяргей АБЛАМЕЙКА:

## «Прысутнасць БДУ ў рэйтынгах — наша візітная картка»

**«Апошнія гады я прытрымліваюся прынцыпу «жыццё ўдалося, але яшчэ рана скідваць хутхасць», — прызнаўся ў адным са сваіх інтэрв'ю рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, аўтар больш як 600 навуковых работ, доктар тэхнічных навук, прафесар Сяргей АБЛАМЕЙКА. Зусім нядаўна Сяргей Уладзіміравіч адзначыў свой 60-гадовы юбілей, а 30 кастрычніка 95-годдзе адзначыць галоўная ВНУ краіны, якую ён узначальвае з 2008 года. Восень атрымалася для кіраўніка БДУ надзвычай клопатнай, тым не менш ён не адмовіў у інтэрв'ю нашаму выданню...**



Фота Надзеі БУЖАН.

### АД СТУДЭНТА — ДА РЭКТАРА

***— Сяргей Уладзіміравіч, вы скончылі механіка-матэматычны факультэт БДУ ў 1978 годзе. А роўна праз трыццаць гадоў вас, вучонага з сусветным іменем, запрасілі ўзначаліць сваю альма-матар. Прызнайцеся, што для вас больш цікава: займацца навукай ці выхоўваць новае пакаленне людзей з нестандартным мысленнем? І ці часта вам даводзіцца лавіць сябе на думцы «а вось у мае часы...»?***

— Я і цяпер працягваю займацца навукай, але, канешне, у значна меншай ступені. А, можа, усяму свой час? Рухаць навуку наперад павінна найперш моладзь. Ёсць меркаванне, што асноўныя адкрыцці робіцца да 40 гадоў, а потым ты ўжо пераважна абагульняеш, кансультуеш, кіруеш іншымі. Спадзяюся, што свой уклад у навуку я ўжо зрабіў. Да таго ж пераход ад навукі да адміністрацыйнай працы ў мяне атрымаўся досыць плаўны, паколькі ў Акадэміі навук я ўзначальваў Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі, а да гэтага працаваў намеснікам дырэктара інстытута, таму адміністрацыйнай працы мне і там хапала. Праўда, тут яе яшчэ больш *(смяецца. — **Аўт.**)*, маштабы зусім іншыя... СТАР. 5

# «НА ШЛЯХУ ПАБУДОВЫ ІНТЭГРАЦЫЙНЫХ ПРАЕКТАЎ ТРЭБА ПАСЛЯДОЎНА І РАШУЧА РУХАЦЦА НАПЕРАД»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Разглядаем праўдзенне гэтых мерапрыемстваў у нас як праяўленне павагі да Беларусі, прызнанне яе актыўнай інтэграцыйнай палітыкі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

У сучасным свеце абвастраецца палітычная і эканамічная турбулентнасць. «Узмацнілася абгрунтаваная крытыка ў нашых краінах у сувязі з незадаволенасцю як тэмпамі, так і практычнымі вынікамі развіцця інтэграцыі. Чутны трывожныя сігналы ад бізнесу, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Буду шчыры: крытычная маса пытанняў, што назбіраліся, выклікае ў нас, у Беларусі, трывожныя настроі наконт перспектыў не толькі СНД, але і ЕАЭС».

Прэзідэнт падкрэсліў, што неабходна павысіць эфектыўнасць патэнцыялу інтэграцыі і яе канкурэнтныя перавагі. «Упэўнены, што мінскія сустрэчы дадуць магчымасць знайсці шляхі вырашэння існуючых праблем, асабліва ў эканамічнай сферы. Без эканомікі нікуды, таму што гэта фундамент любых адносін», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У сучасных умовах СНД поўнасцю захоўвае запатрабаванасць і актуальнасць як дзейсная, універсальная пляцоўка для абмеркавання надзённых праблем і ўзгаднення пазіцый дзяржаў-удзельніц, сказаў Аляксандр Лукашэнка. «У верасні ў Бішкеку мы прадметна разгледзелі пытанні адаптацыі СНД да сучасных умоў. Беларусь заўсёды выступала за захаванне Садружнасці як паўнацэннай міжнароднай арганізацыі, нацэленай на развіццё рэгіянальнай інтэграцыі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — З задавальненнем адзначаю, што і ў Беларусі ў нас такое ж меркаванне, і гэты падыход быў падтрыманы ўсімі кіраўнікамі дзяржаў Садружнасці і знайшоў сваё адлюстраванне ў прынятым рашэнні аб адаптацыі СНД».

Прэзідэнт звярнуў увагу на той факт, што ў аснове Садружнасці — стратэгія ўзаемавыгаднага і раўнапраўнага супрацоўніцтва, што дае магчымасць кожнай з дзяржаў-удзельніц рабіць свабодны выбар ступені свайго ўдзелу ў інтэграцыйным працэсе, грунтуючыся пры гэтым на нацыянальных інтарэсах. Ён выказаў перакананасць, што СНД поўнасцю запатрабавана.

«Пачата работа па ўдасканаленні палажэнняў дагавора аб ЕАЭС. Самае важнае — падысці да яе не фармальна, а выкарыстаць гэту магчымасць для вырашэння самых складаных пытанняў інтэграцыі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што няўзгодненасць дзеянняў прывяла ўжо да разбалансіроўкі ўнутраных інтэграцыйных працэсаў. «Таму я заклікаў бы кіраўнікоў урадаў дзяржаў ЕАЭС нацэліць сваіх экспертаў на сур'ёзную работу, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Мы ўбачылі, што трэба сёння актуалізаваць гэты дагавор. Што не атрымалася — адкінуць. Трэба яго ўдасканаліць, правесці рэвізію па ўсіх напрамках».

Але, беручы на сябе новыя задачы, заўважыў кіраўнік дзяржавы, трэба падумаць і над прадаўжэннем вырашэння доўгаіграючых праблем, па якіх дасягнуць выніку не ўдалося. «Толькі пераемнасць, паслядоўнасць і сістэмнасць у рабоце могуць стварыць неабходныя перадумовы для паскорання руху да тых мэт, якія мы паставілі перад саюзам», — упэўнены беларускі лідар.

«Падыход Беларусі празрысты: калі сказалі, што будзем будаваць Еўразійскі эканамічны саюз, то трэба быць паслядоўнымі і рашуча ісці наперад, як дамовіліся. Інакш інтэграцыйныя ідэі не будуць успрымацца сур'ёзна ні нашымі народамі, ні за межамі саюза», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што парадак дня маючага адбыцца пасяджэння Савета кіраўнікоў урадаў СНД выглядае аб'ёмным. «Акрамя пунктаў, якія развіваюць рашэнні Бішкекскага саміту, у ім ёсць вялікі блок вытворча-эканамічных пытанняў, уключаючы пытанне рэалізацыі Дагавора аб зоне свабоднага гандлю, закранаюцца тэмы абароны інтэлектуальнай уласнасці і праваў спажыўцоў, супрацоўніцтва ў транспартнай і гуманітарнай сферах», — адзначыў Прэзідэнт.

На яго думку, гэта яшчэ раз пацвярджае, што ў СНД можна знайсці невычэрпную колькасць напрамкаў для сумеснай работы. Галоўнае — выхад на канчатковы вынік.

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы сказаў, што тэма мадэрнізацыі Садружнасці не закрыта. «Напэўна, трэба крытычна паглядзець і на прававу базу СНД, — лічыць Аляксандр Лукашэнка. — За 25 гадоў мы падпісалі неймаверны аб'ём рашэнняў, дагавораў і пагадненняў. Ці ўсе яны сёння актуальныя і патрэбныя? Гэта таксама трэба даследаваць, каб на выхадзе мы ўбачылі сапраўды сучасную, аўтарытэтную і актыўную арганізацыю, удзел у якой будзе адпавядаць інтарэсам нашых краін».

«І мне вельмі хочацца, каб у перыяд старшынства Расіі ў 2017 годзе мы змаглі атрымаць дакладныя адказы: у імя чаго ўсе гэтыя гады вялася інтэграцыя і што маецца на мэце ў канчатковым выніку? Таму што, як і раней, амаль ва ўсім мы стаўку робім і лічым, што вельмі многае будзе залежаць ад Расійскай Федэрацыі», — выказаў меркаванне Прэзідэнт.

Ён адзначыў, што СНД — добрая пляцоўка для сустрэч і перагавораў, вырашэння тактычных пытанняў. Еўразійскі эканамічны саюз прадугледжвае ўжо глыбокую эканамічную інтэграцыю. «Яшчэ больш глыбокая інтэграцыя ў Саюзе Беларусі і Расіі. Ён з'яўляецца прыкладам і ўзорам», — падкрэсліў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы дадаў, што пры стварэнні ЕўрАзЭС краіны абапіраліся менавіта на многія беларуска-расійскія дамоўленасці.

«Калі нехта гатовы перайсці ад эканамічнага саюза да цеснага эканамічнага ваенна-палітычнага саюза ў рамках Саюза Беларусі і Расіі, дагавор адкрыты», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

## Прэзідэнт Беларусі і прэм'ер-міністр Расіі абмеркавалі пытанні двухбаковых адносін

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора сустрэўся з прэм'ер-міністрам Расіі Дзмітрыем Мядзведзевым, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

На сустрэчы абмеркаваны найбольш актуальныя пытанні двухбаковых адносін і ўзаемадзеяння ў інтэграцыйных аб'яднаннях.

## Перспектыўны напрамак

**Аляксандр Лукашэнка 29 кастрычніка накіруецца ў Блізкаўсходні рэгіён, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

У час афіцыйнага візіту ў Катар Прэзідэнт Беларусі правядзе перагаворы з эмірам краіны шэйхам Тамімам бен Хамадам аль-Тані. Па выніках сустрэчы чакаецца падпісанне шэрагу двухбаковых дакументаў.

Са сталіцы Катара Прэзідэнт накіруецца з рабочым візітам у Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Плануецца, што кіраўнік дзяржавы сустрэнецца з наследным прынцам Абу-Дабі, намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага Узброенымі Сіламі ААЭ шэйхам Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам. Таксама запланаваны перагаворы Аляксандра Лукашэнкі з віцэ-прэзідэнтам, прэм'ер-міністрам і міністрам абароны ААЭ, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашыдам аль-Мактумам.

## У цэнтры палітычнага жыцця

### Мінск выконвае свае абавязацельствы мірнай пляцоўкі перагавораў

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з першым намеснікам прэм'ер-міністра Азербайджана Ягубам Эюбавым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы ў пачатку сустрэчы падкрэсліў, што на гэтай беларуска-азербайджанскай пляцоўцы «нам ёсць аб чым пагаварыць». «Але перш за ўсё хачу павіншаваць з экзаменам, які вы, улада, добра здалі ў Азербайджане, — гэта рэферэндум. Яго вынікі — самае лепшае пацвярджэнне стаўлення азербайджанскага народа ў гэты няпросты час да ўлады. Гэта вельмі вялікая перамога, і я ведаю, як гэта ацэнена ў свеце. Усялякія размовы, усялякая балбатня адпалі адразу, і імідж вашай краіны значна павысіўся», — падкрэсліў Прэзідэнт. Ён таксама сказаў, што «мы дамовіліся з маім сябрам сустрэцца 28—29 лістапада. Нічога не мяняем, не адкладваем». «Ёсць шэраг праблем, якія мы сур'ёзна абмяркуем», — удакладніў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама акцэнтаваў увагу на тым факце, што беларуская сталіца ў гэтыя дні стала шырокай пляцоўкай міжнародных сустрэч. У прыватнасці, 27 кастрычніка адбылася сустрэча на ўзроўні ЕАЭС. Сёння сустрэнуцца кіраўнікі ўрадаў СНД. Акрамя таго, праходзіць вельмі маштабная міжнародная канферэнцыя ЕЭК ААН. У гэтыя дні засядае рабочая група па Украіне.

«Усё гэта сведчыць аб тым, што Мінск выконвае свае абавязацельствы мірнай пляцоўкі перагавораў», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, Ягуб Эюбаў сказаў аб тым, што «Беларусь і Аляксандр Лукашэнка для Азербайджана і азербайджанскага народа — самыя блізкія і родныя». «Шчыра кажучы, у гэты складаны перыяд для нашай краіны хто б, акрамя Беларусі, так ставіўся, так падтрымліваў Азербайджан, — сказаў азербайджанскі госць. — У Азербайджане ёсць праблемы, і вы, як ніхто іншы, ведаеце пра іх, таму што вы кіраўнік дзяржавы, вы — чалавек, якога любіць і падтрымлівае беларускі народ».

■ Актуальна

# САДРУЖНАСЦЬ ПРАЛІЧВАЕ БУДУЧЫНЮ

## Кіраўнікі ўрадаў СНД абмеркавалі стратэгію развіцця эканомікі да 2020 года

**У Мінску прайшло пашыранае пасяджэнне Савета кіраўнікоў урадаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў. На парадку дня было больш за 20 праектаў дакументаў, якія тычацца далейшага развіцця супрацоўніцтва па прыярытэтных кірунках дзейнасці СНД. Асноўную ўвагу кіраўнікоў урадаў надалі пытанням эканамічнага ўзаемадзеяння. У прыватнасці, абмеркавалі ход рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб зоне свабоднага гандлю. Не менш актуальным было пытанне аб прагнозе вытворчасці і спажывання энергарэсурсаў дзяржаў — удзельніц СНД да 2030 года. Прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ у пачатку пасяджэння адзначыў, што эканамічнае ўзаемадзеянне гістарычна займае цэнтральнае месца ў дзейнасці Садружнасці.**

«Намі распрацавана стратэгія эканамічнага развіцця на перыяд да 2020 года. Задача пастаўлена сур'ёзная: дакумент ахоплівае больш за 20 кірункаў і налічвае 290 практычных мерапрыемстваў. Іх рэалізацыя павінна стварыць рэальныя ўмовы для ўстойлівага развіцця эканомікі нашых краін, структурных пераўтварэнняў у розных сферах дзейнасці. Упэўнены, што рэалізацыя стратэгіі надасць дадатковую дынаміку Дагавору аб зоне свабоднага гандлю ад 18 кастрычніка 2011 года. Пакуль, на жаль, тэмпы ліквідацыі абмежаванняў гандлю не ўражваюць. Не без аб'ектыўных складанасцей ідзе padрыхтоўка праекта Пагаднення аб зоне свабоднага гандлю паслугамі», — растлумачыў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр Беларусі таксама падкрэсліў, што пакуль не ўдаецца звесці ў адзінае цэлае нацыянальныя пазіцыі па пераліку рэгуляваных паслуг, у тым ліку фінансавых, пашырэнні сферы ўжывання пагаднення на інвестыцыі і адмене абмежаванняў доступу на нацыянальныя рынкі паслуг. Кіраўнік урада нашай краіны заклікаў профільныя ведамствы дзяржаў СНД больш актыўна ўдзельнічаць у працы над пагадненнем і выпрацаваць агульны падыход.

Па завяршэнні пасяджэння **старшыня Выканаўчага камітэта, Выканаўчы сакратар СНД Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ** адзначыў, што кіраўнікі ўрадаў канстатавалі пазітыўнае развіццё ходу рэалізацыі Дагавора аб зоне свабоднага гандлю для краін СНД.

«Ідзе паслядоўная праца па падрыхтоўцы развіцця гэтага дагавора за кошт шэрагу пагадненняў, якія спрыялі ўмацаванню эканамічнай інтэграцыі», — адзначыў Сяргей Лебедзеў.

Таксама было падпісана некалькі важных пагадненняў па ўмацаванні супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы на прасторы СНД. Сярод іх — Пагадненні аб супрацоўніцтве дзяржаў — удзельніц СНД у горнаметалургічнай галіне, у аўтамабілебудаванні, у сферы працідзеяння вытворчасці і распаўсюджвання кантрафактнай прадукцыі, у галіне прававой асветы спажыўцоў, у галіне каранціну раслін. Як растлумачыў Сяргей Лебедзеў, гэтыя дамовы рэгламентуюць далейшае ўзаемадзеянне ў канкрэтных галінах. Акрамя таго, падчас пашыранага пасяджэння кіраўнікі ўрадаў падпісалі такія важныя дакументы, як Стратэгія супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД у пабудове і развіцці інфармацыйнага грамадства на перыяд да 2025 года і План дзеянняў па яго рэалізацыі. Таксама падпісалі доўгатэрміновы дакумент аб Прагнозах вытворчасці і спажывання энергарэсурсаў дзяржаў — удзельніц СНД на перыяд да 2030 года.

«Перыяд рэалізацыі дагавора пацвярджае, што СНД глядзіць далёка наперад. Садружнасць захоўвае сваю запатрабаванасць. Менавіта з гэтай прычыны Савет кіраўнікоў урадаў СНД прапанаваў шэраг мер па далейшым удасканаленні дзейнасці Садружнасці», — адзначыў Сяргей Лебедзеў.

Таксама было падпісана рашэнне аб выдзяленні асігнаванняў на стварэнне і развіццё аб'яднанай сістэмы супрацьпаветранай абароны дзяржаў СНД у 2017 годзе.

Акрамя таго, Віктар Гумінскі прызначаны першым намеснікам старшыні Выканкама — выканаўчага сакратара СНД. Апошнія чатыры скліканні Віктар Гумінскі з'яўляўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, быў старшынёй Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы, намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў. У адпаведнасці з палажэннем аб Выканкаме СНД першы намеснік прызначаецца Саветам кіраўнікоў урадаў СНД. Прызначэнне прайшло па ініцыятыве Беларусі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by* ■

# Прыярытэт — шматдзетныя сем'і

## Жыллё па льготных крэдытах у 2017 годзе будзе будавацца пераважна для шматдзетных сем'яў

**Пра гэта заявіла намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА на сустрэчы з актывам Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Пытанні забяспечанасці шматдзетных сем'яў жыллём разглядаліся ва ўрадзе, у тым ліку падчас абмеркавання фінансавання дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы. І льготныя крэдыты, прадугледжаныя на 2017 год, у большай ступені будуць накіраваны на падтрымку гэтай катэгорыі чаргавікоў. Такім чынам, вырашыць жыллёвае пытанне змогуць каля 4 тысяч сем'яў», — адзначыла Наталля Качанава.

Усяго ў краіне на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў знаходзіцца каля 26 тысяч шматдзетных сем'яў, у тым ліку больш за 4 тысячы — у Мінску. З іх амаль 19 тысяч сем'яў маюць права на ўключэнне ў склад ЖБСК.

«Пакуль забяспечыць усе шматдзетныя сем'і, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жылля, ільготнымі крэдытнымі рэсурсамі дзяржава не можа, для гэтага спатрэбіцца больш як Br700 млн. На 2017 год у бюджэце на льготнае крэдытаванне выдзелена Br160 млн. У першую чаргу на будаўніцтва будуць накіроўвацца тыя сем'і, якія стаяць у чарзе звыш трох гадоў», — сказала Наталля Качанава.



Фота БЕЛТА

Яна падкрэсліла, што падтрымка шматдзетных сем'яў — адзін з прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі ў сацыяльнай сферы. Ужо цяпер можна гаварыць пра поспех мер, якія прымаюцца. У Беларусі ўпершыню з 1992 года колькасць народжаных перавысіла колькасць памерлых — па выніках студзеня-верасня гэтага года адзначаны натуральны прырост насельніцтва, які склаў 518 чалавек.

■ Будзьце ў курсе

# ПЛЮС ТАВАРЫ ЛЕГПРАМА І ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

## Пашыраны пералік тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза для рэгістрацыі дэкларацый у электроннай форме

**Як вядома, з лютага 2016 года працэдура рэгістрацыі дэкларацый аб адпаведнасці прадукцыі патрабаванням ТР МС можа ажыццяўляцца ў электроннай форме.**

Заяўнікам (вытворцам, імпарцёрам — юрыдычным асобам, індывідуальным прадпрымальнікам) дадзена магчымасць рэгістраваць дэкларацыю аб адпаведнасці праз інфармацыйную сістэму «Паведамляльнае дэклараванне адпаведнасці». У Дзяржстандарце растлумачылі, што такая форма работы, у адрозненне ад традыцыйнага спосабу рэгістрацыі ў органе па сертыфікацыі, дазваляе заяўнікам эканоміць не толькі час — новай схемай можна карыстацца дыстанцыйна, але і сродкі — кошт рэгістрацыі дэкларацыі аб адпаведнасці — 29 рублёў незалежна ад схемы дэкларавання і колькасці лістоў дадаткаў да дэкларацыі аб адпаведнасці.

З моманту з'яўлення новаўвядзення больш за 40 суб'ектаў гаспадарання ўжо зарэгістравалі больш за 240 дэкларацый аб адпаведнасці. Больш за палову заяўнікаў (56%) — індывідуальныя прадпрымальнікі.

Цяпер такая працэдура магчыма ў дачыненні да ТР МС, якія датычацца тавараў легпрама (ТР МС 017/2011) і прадукцыі, прызначанай для дзяцей і падлеткаў (ТР МС 007/2011).

У адпаведнасці з пастановай Дзяржстандарту ад 21 верасня 2016 года № 71 пералік тэхнічных рэгламентаў для рэгістрацыі дэкларацый у электроннай форме пашыраецца яшчэ на 22. Яны ўстанаўліваюць патрабаванні да розных відаў тавараў, уключаючы харчовую, мэблевую, тытунёвую прадукцыю, упакоўку, электратэхнічныя вырабы, машыны і абсталяванне.

Такім чынам, пачынаючы з 12 лістапада гэтага года, зарэгістраваць дэкларацыі аб адпаведнасці ў электроннай форме можна будзе па 24 тэхрэгламентах Мытнага саюза.

Неабходную інфармацыйную і тэхнічную падтрымку ўсім зацікаўленым суб'ектам гаспадарання аказвае ўпаўнаважаны орган, якім з'яўляецца Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) (па правілах запаўнення заявы, шаблонаў, правілаў аплаты, можна звяртацца па тэл. 8 017 269 68 68, ps@belgiss.by, па пытаннях тэхнічнай падтрымкі — 8 017 269 69 11, support@belgiss.by).

Акрамя таго, БелДІСС на бясплатнай аснове праводзіць па дадзенай тэматыцы семінары. Найбліжэйшы з іх запланаваны на 22 лістапада.

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ**

■ Азбука бяспекі

## ПАМЯТАЦЬ І ДЗЕЦЯМ, І ДАРОСЛЫМ

**Напярэдадні канікул Беларуская чыгунка нагадае школьнікам аб правілах паводзін на аб'ектах чыгуначнага транспарту.**

На магістралі стартаваў комплекс мерапрыемстваў «Дзеці і бяспека». Па 7 лістапада асаблівая ўвага будзе ўдзелена дзецям і падлеткам, якія знаходзяцца без нагляду дарослых паблізу чыгуначных пуцей, на вакзалах, станцыях і ў паяздах.

З пачатку года на Беларускай чыгунцы зафіксавана 102 выпадкі невытворчага траўматызму. Гэта на 17 працэнтаў менш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Колькасць пацярпелых грамадзян зменшылася на 21 чалавека.

Разам з тым, асноўнай прычынай няшчасных выпадкаў па-ранейшаму застаецца ігнараванне людзьмі элементарных мер бяспекі. У прыватнасці, знаходжанне ў зоне павышанай небяспекі ў стане алкагольнага ап'янення, размовы па мабільным тэлефоне і праслухоўванне музыкі ў навушніках падчас перасячэння чыгуначных пуцей, парушэнне кіроўцамі правілаў дарожнага руху пры перасячэнні чыгуначных пераездаў і г. д.

■ Пачын

## НІ ДНЯ БЕЗ ДОБРАЙ СПРАВЫ!

**БРСМ абвясціў аб пачатку рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Тыдзень Добрых Спраў»: валанцёры руху «Добрае Сэрца» запланавалі правесці іх за гэты час больш за 450.**

Акцыя пройдзе пад дэвізам «Ні дня без Добрай Справы!». У ёе ходзе валанцёры «Добрага Сэрца» акажуць адрасную дапамогу ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, вязням канцлагераў, воінам-інтэрнацыяналістам, адзінокім і адзінока пражываючым пажылым людзям, а таксама інвалідам I і II групы ў прыбіранні прыдамавых тэрыторый, падрыхтоўцы дамоў і кватэр да зімы.

Напрыклад, валанцёры Дубровенскай раённай арганізацыі БРСМ наведаюць з добрай місіяй Заслужанага настаўніка БССР, ветэрана працы Вольгу Максімаўну Бабакаву, Жлобінскага раённага камітэта БРСМ — інваліда Вялікай Айчыннай вайны, ветэрана працы, Заслужанага хірурга Рэспублікі Беларусь Аляксандра Цярэнцьевіча Татарынава і акажуць гэтым паважаным людзям неабходную дапамогу па гаспадарцы.

Па-за ўвагай добраахвотнікаў БРСМ не застануцца і установы сацыяльнага тыпу. Маладзёжны працоўны дэсант Лідскай раённай арганізацыі БРСМ на працягу тыдня зоймецца добраўпарадкаваннем аддзялення кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, а Бабруйскай гарадской арганізацыі БРСМ — тэрыторыяй міжраённага анкалагічнага дыспансера.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Не імідж, а практычная неабходнасць

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Удзельнікі дзявятай беларускай антарктычнай экспедыцыі адправяцца на самы паўднёвы кантынент у лістападзе, вяртанне запланавана на май. У складзе каманды шэсць спецыялістаў: начальнік Аляксей Гайдашоў, інжынер-эколаг Юрый Гігіняк, інжынер-механік Аляксей Захватаў, механік па эксплуатацыі калёсных і гусенічных машын Ігар Зміеўскі, электраманцёр Пётр Папаламаў, інжынер-радыёметрыст Вадзім Свідзінскі. Трое з іх пабачаць Антарктыду ўпершыню. Галоўнай задачай палярнікаў стане мантаж платформы і першай секцыі (санітарна-гігіенічнага прызначэння) ужо другога аб'екта Беларускай антарктычнай станцыі.

— Наяўнасць станцыі ў Антарктыдзе — гэта не проста сімвал, не іміджавы момант, — падкрэсліў Аляксей Гайдашоў. — Гэта выключна практычная неабходнасць. Акрамя таго, статус кансультатыўнага боку Дагавора аб Антарктыцы, якога мы дабіваемся, прадугледжвае наяўнасць пэўнага апорнага пункту для даследаванняў. Калі казаць пра навуковую дзейнасць, то нашы спецыялісты будуць вывучаць аэразольны і газавы склад атмасферы, азонавы слой, геафізіку, біялогію і мікрабіялогію.

Ужо трэці раз у Антарктыду ў складзе беларускай экспедыцыі адправіцца вядучы навуковы супрацоўнік навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах Юрый Гігіняк — ён ужо быў на «белым кантыненце» падчас сезонаў 2010—2011 і 2013—2014 гадоў, а таксама першым з беларускіх біёлагаў аказаўся там яшчэ ў 1970 годзе! Цяпер навукоўцу 71 год, але мара зноў пабачыць вечныя льды стала рэальнасцю.

— Безумоўна, я вельмі рады, што прыму ўдзел у чарговай экспедыцыі, бо адношуся да тых людзей, што ў Антарктыдзе «нарадзіліся», — усміхаецца Юрый Гігіняк. — Але справа, вядома, не ў эмоцыях, а ў навуковым інтарэсе. Я буду праводзіць вельмі цікавыя і важныя для нашай навукі біялагічныя даследаванні. Марскія, прэснаводныя і наземныя экасістэмы, імхі і лішайнікі — усё гэта ў цэнтры нашай увагі. Будзем вывучаць уплыў тэмпературы і ўльтрафіялету на розныя віды, шукаць новыя спосабы прымянення мясцовай расліннасці. Акрамя таго, ёсць у мяне і пэўная роля па перадачы вопыту маладым навукоўцам — трэба паказаць ім, што гэта не адпачынак, а сур'ёзная праца з небяспекай для жыцця. Шкада, што гэтым разам мы прабудзем там няшмат часу — каля трох месяцаў, але, спадзяюся, наша работа дазволіць удзельнікам наступных экспедыцый заставацца ў Антарктыдзе на зімоўкі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны

# Увага рэстаўратараў — да гістарычнага цэнтра сталіцы

**Прадпрыемства «Мінская спадчына» ў найбліжэйшы час пачне рэстаўрацыю некалькіх аб'ектаў у гістарычным цэнтры сталіцы.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Як адзначыў **галоўны інжынер «Мінскай спадчыны» Міхась ЖЫХ**, у 2017 годзе ўвага сталічных рэстаўратараў будзе прыцягнута да Ракаўскага прадмесця, дзе асноўным аб'ектам рэканструкцыі стане будынак хлебазавода №1. Цяпер актыўна вядзецца работа па праектаванні часткі тэрыторыі Ракаўскага прадмесця ў межах былой вуліцы Завальнай (Раманаўскай Слабады) і Ракаўскай. Тут плануецца аднаўляць тры аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны. Самым праблемным з іх, на думку Міхася Жыха, з'яўляецца будынак шпалернай фабрыкі. Бо інвестыцыйны праект вынасу гэтага прадпрыемства за межы горада і ўзвядзення ў тым ліку і гістарычнай забудовы пакуль не знайшоў падтрымкі.

Работы будуць распачаты і на Рэвалюцыйнай,13. Раней гэты ўчастак знаходзіўся ў прыватнай уласнасці, аднак забудоўшчык не выканаў абавязацельстваў, таму было прынята рашэнне аб яго канфіскацыі. У першым паўгоддзі наступнага года плануецца правесці аўкцыён, па выніках якога будзе вызначаны новы забудоўшчык для тэрыторыі.

Па словах **начальніка аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення**



**па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Наталлі ХВІР**, сёлета на аднаўленне гістарычных аб'ектаў затрачана больш за 484 тыс. руб., а Міністэрствам культуры выдадзена 238 дазволаў на правядзенне рэстаўрацыйна-аднаўленчых работ. Па скончаных аб'ектах і этапах работ атрымана 74 заключэнні аб магчымасці прыёмкі іх у эксплуатацыю.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ Чулі?!

# ЧАС СЭКАНОМІЦЬ НА НЕХАРЧОВЫХ ТАВАРАХ

**Гандлёвыя арганізацыі Мінска ў лістападзе правядуць для пакупнікоў акцыі «Дні зніжак» на нехарчовыя тавары, паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама.**

Так, «ЦУМ Мінск» 12,19 і 26 лістапада прапануе наведвальнікам набыць тавары са зніжкай 17 працэнтаў. Зніжка ў 20 працэнтаў ва ўнівермагу «Беларусь» будзе дзейнічаць 4, 8, 15, 16, 22, 26, 27 і 30 лістапада. У «ГУМе» 3 лістапада можна будзе набыць тавары танней на 22 працэнты, 17 і 24 лістапада — на 20 працэнтаў. Таксама 20-працэнтная зніжка будзе дзейнічаць 2, 9,16, 23, 26 і 30 лістапада ў гандлёвым доме «На Нямізе». Танней на 15 працэнтаў будуць тавары ў УП «Кірмаш» 2, 9, 16, 23, 26 і 30 лістапада. Крамы гандлёвага цэнтра «Сталіца» 6 і 26 лістапада прапануюць зніжкі ад 5 да 50 працэнтаў. Акрамя таго, зніжку 15% прапануюць крамы «Старт-Х» 2, 9, 16, 23 і 30 лістапада, «Паўночніца» 10, 17 і 24 лістапада (на асобныя групы прамтавараў), «1000 дробязяў» 3, 10, 17 і 24 лістапада, «Крышталь» 2, 9, 16, 23 і 30 лістапада. У крамах «Гаспадар і Гаспадыня» 15 лістапада тавары будуць таннейшыя на 20 працэнтаў. 26 і 27 лістапада ў сталіцы абвешчаны «адзіны дзень зніжак» з прадастаўленнем пакупнікам бонусаў у памеры не менш чым 15—20 працэнтаў за кошт узгаднення зніжэння коштаў арганізацыямі-вытворцамі і гандлёвымі арганізацыямі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

**Янушковичский сельский исполнительный комитет проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для обслуживания одноквартирных жилых домов 01.12.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10**

| № п/п | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) | Расходы по документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 12, кадастровый номер 623288016101000068 | 0,1285 га | | 2480 руб. 85 копеек | 496 руб. 17 коп. | 1326 руб. 02 коп. |
| 2 | д. Хоружинцы, ул. Лесная, 13, кадастровый номер 623288016101000064 | 0,1285 га | | 2480 руб. 85 копеек | 496 руб. 17 руб. | 1326 руб. 02 коп. |
| 3 | д. Великие Бесяды, ул. Поселковая, 15 «А» кадастровый номер 623288001601000092 | 0,1369 га | подъездные пути удовлетворительные | 2158 руб. 98 коп. | 431 руб. 80 коп. | 1356 руб. 96 коп. |
| 4 | д. Аскрышино, У-1 кадастровый номер 623288000601000028 | 0,2500 га | подъездные пути удовлетворительные | 3740 руб. 84 коп. | 747 руб. 17 коп. | 519 руб. 38 коп. |

Задаток перечисляется на р/счет № 3600619171104 АСБ «Беларусбанк», код 795, УНП 600181536, ОКПО 04431642 Янушковичский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Аукцион состоится 01.12.2016 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются до 26.11.2016 г. (последний день подачи заявления 25.11.2016 г. до 17.00) по адресу: Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, д. 10.

**Контактные телефоны: (8 01774) 57 4 35, 57 4 99.**

**НА гэту рубрыку, або, як цяпер кажуць, праект мяне натхнілі камандзіроўкі ў глыбінку. У кожным сельсавеце, акрамя хіба Мотальскага ды яшчэ аднаго-двух, кіраўнікі мясцовых устаноў улады расказвалі пра населеныя пункты, якія ўжо фактычна зніклі з карты раёнаў альбо на падыходзе да стану, каб застацца гістарычнымі назвамі. Там дажываюць свой век апошнія жыхары. І як на тое, гэтыя вёсачкі вельмі часта знаходзяцца ў самых маляўнічых мясцінах, дзе вясной аж галава кругам ідзе ад чысціні паветра ды птушынага рознагалосся. Лёгка ўяўляецца, як раней было тут шматлюдна, як поўніліся вуліцы дзіцячым смехам, як гаманілі жанкі каля калодзежа, а іх падганялі воклікамі мужы, што спяшаліся на працу. І вось усё прайшло... Засталіся цішыня і тэлефоны ў кожным доме як адзіная сувязь з роднымі ды і з усім светам. Гэтыя апошнія жыхары рады кожнаму чалавеку, што зазірае ў вёску. Хоць, праінструктаваныя ўчастковым, яны незнаёмцу хутчэй за ўсё дзвярэй не адчыняць. Таму, выбіраючыся ў вёску, трэба браць некага, хто знаёмы тутэйшым людзям.**

■ Вёскі, якія знікаюць

# БАБА НАДЗЯ З ЧАРНІЧНАГА ЗБІРАЕЦЦА НА ЗІМУ Ў ГОРАД

Чарнічнае Кобрынскага раёна акурат у такой мясцінцы, з якой хоць карціны пішы. Ехаць у вёску давялося па лясных пакручастых дарогах. Дзіўна, але знака, які ўказваў бы на населены пункт, нідзе не сустрэлася. Аказалася, што ўказальнік быў, але нядаўна ён трапіў у амаль кур'ёзную гісторыю. Кажуць, праязджаў старшыня райвыканкама і звярнуў увагу на знак, які стаяў увесь прабіты кулямі, што адразу навяло на думку пра не вельмі разумныя забавы паляўнічых. Трэба думаць, атрымалі на арэхі кіраўнікі адпаведнага таварыства, таму ад граху далей прыбралі шыльду наогул. І цяпер на вёску нічога не ўказвае, Чарнічнага як бы і няма. А можа, спецыялісты з таварыства паляўнічых і рыбаловаў заказалі новы знак, каб замацаваць яго на раейшае месца? Будзем спадзявацца.

Ёсць указальнік ці няма, але вёска пакуль значыцца ва ўсіх дакументах як жылы населены пункт. Зарэгістраваныя ў ёй усяго двое жыхароў. Цікава, што і раней Чарнічнае было адным з самых малых паселішчаў Кобрыншчыны. І нават паўвека таму ў вёсцы значылася ўсяго 11 падворкаў. Але ж людзей налічвалася пад сотню, бо ў кожнай хаце пражывала вялікая сям'я. А электрычнасць сюды прыйшла, вы здзівіцеся, толькі ў 1979 годзе. У Чарнічным ніколі не было ніводнага аб'екта сацыяльна-культурнага прызначэння. Дзеці хадзілі ў школу ў Казішча, а жыхары атаварваліся ў суседняй вёсцы — Завужоўі.

Паколькі месца хапала, гаспадары сяліліся з размахам, кожная сядзіба займала не менш, чым паўгектара. І таму, калі тут засталіся дзве сталыя жыхаркі Надзея Сцяпанаўна Карнялюк і Любоў Фёдараўна Сяргута, то адлегласць паміж іх дамамі ў кіламетр стала ў нейкі момант непераадольнай для бабулек з хворымі нагамі. Суседкі не бачыліся больш за год, а можа, і ўсе два, расказвала Надзея Сцяпанаўна, але кожны дзень размаўлялі па тэлефоне.

— Пазвонім адна адной, каб упэўніцца, што жывыя, і ўжо весялей, — гаворыць Надзея Карнялюк. — Спазніліся вы — учора забралі маю суседку ў горад. Вось і я думаю, што на гэтую зіму пагаджуся пераехаць да дзяцей. І ім лягчэй, чым кожныя выхадныя ездзіць да мяне.

Паводле слоў апошняй жыхаркі Чарнічнага, нарадзілася яна ў самым канцы 1929 года, але запісалі 30-м. Значыць, ёй ідзе 87-ты. Пажылая жанчына адразу папрасіла прабачэння, што нешта можа забыць і не



Надзея КАРНЯЛЮК.

так расказаць, таму пачынала гутарку нібы неахвотна, але потым разгаварылася.

Нарадзілася Надзея Сцяпанаўна ў суседнім сяле, сюды замуж выйшла больш за 60 год таму. Маладую жонку муж прывёў у дом сваіх бацькоў, жылі ў старой хаце даволі доўга, пакуль пабудавалі сваю. Тая хата, якой дакладна больш за сто гадоў, і цяпер стаіць на падворку як памяць. Тут свякроў са свёкрам выгадавалі чацвярых дзяцей, перажылі вайну. У вайну страху нацярпеліся: лясы кругом, партызаны былі ў ваколіцах, а немцы жыхароў такіх вёсак, як вядома, не прывячалі. Жылі пад вечным страхам быць абрабаванымі, спаленымі і забітымі. Але пашанцавала, усе перажылі вайну.

Калі пажаніліся, сталі з мужам працаваць у калгасе. Мая суразмоўніца расказвае, якая нялёгкая была праца:

— На паляводства хадзіла. А дзялкі буракоў давалі вялікія, да іх далёка было дабірацца — на веласіпедзе даводзілася ездзіць. А якая цяжкая была касавіца! — уздыхае жанчына. — Тут навокал да самага Казішча распасціраліся балоты, і трэба пазней іх асушылі. Сена высушыць, вынесці з балота па калена ў вадзе трэба было. Цяпер, здаецца, не захацеў бы таго малака і карову трымаць, а тады інакш немагчыма было, бо дзяцей гадавалі.

Яны з мужам паставілі на ногі траіх дзяцей. Цяпер сыны і дачка жывуць у Кобрыне, Брэсце і Пружанах. Да маці прыязджаюць кожныя выхадныя, наносяць дроў, вады на тыдзень, прадуктаў прывязуць. Усё, што трэба, ёсць. А прапаліць у печы, прыгатаваць сабе бульбы на вячэру ці булён на абед — вось і ўся работа, з якой Надзея Сцяпанаўна спраўляецца.

З гаспадаркі ў яе застаўся адзін сабачка Тузік каля хаты, даволі добразычлівы. На нас брахнуў толькі для прыліку. Гаспадыня шкадуе, што курачак трымаць зусім няма як — лісы і каршуны не даюць такой магчымасці. Паводле слоў гаспадыні, раней тут паляўнічыя часта хадзілі, а цяпер не з'яўляюцца: «Тых, старых, ужо, відаць, няма, а маладыя выбіраюць іншыя месцы. Таму звяр'ё адчувае сябе вольна. Сядзіш, бывае, пад акном і бачыш, як зайчык прабяжыць зусім блізка».

Раз на месяц прыязджае супрацоўнік пошты, ажыццяўляецца так званая аўтадастаўка пенсіі, ён жа бярэ аплату за электрычнасць і тэлефон. Прыехаў малады хлопец, хуценька разлічыўся і паехаў. Даўно мінулі часы, калі прыходзіў паштальён з тутэйшых, з якім можна было пагаварыць. Таму кожны тыдзень чакае бабулька толькі сваіх.

— Цікава, што ад аўтакрамы, ад паслуг сацыяльнага работніка жыхаркі Чарнічнага наадрэз адмовіліся, — расказала **старшыня Тэвельскага сельскага Савета Іна КУЗНЯЦОВА**. Іна Валер'еўна яшчэ адзначыла, што тут мы маем справу з людзьмі, якія выхавалі вельмі добрых дзяцей, таму на старасці ў іх асаблівых праблем няма. Дзеці як след даглядаюць састарэлых матуль. А не забралі дагэтуль у горад, таму што бабулькі да апошняга трымаліся за свае хаціны, дзе прайшло жыццё, дзе ўсё такое роднае і знаёмае. Але рана ці позна гады бяруць сваё.

Мы на ўсялякі выпадак пад'ехалі да хаты Любові Сяргуты. На дзвярах візеў замок, а сабачая будка была пустая. «Сабаку забралі, значыць, гаспадыня з'ехала на зіму», — канстатавала старшыня сельскага Савета. Надзея Карнялюк таксама пацішу збіраецца да сваіх. Гэта будзе першая бязлюдная зіма ў Чарнічным. Асірацелая вёска застанецца чакаць вясну.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

■



Фота Ганны ЦІМАШУК.

Дом, якому больш за сто гадоў.

■ Аздараўленне па-нашаму

# «ЛЮКС» ЦІ НЕ ВЕЛЬМІ?

## Чагосьці ўсё ж не хапае айчынным санаторыям...

**У нашы санаторыі сёння едуць. І не толькі пенсіянеры. І не толькі самі беларусы. Напаўняльнасць забяспечваюць, галоўным чынам, расіяне. Але ў найбліжэйшай перспектыве іх актыўнасць можа істотна знізіцца — суседняя краіна сама пачала развіваць санаторна-аздараўленчы турызм. Можна было б павярнуцца ў бок іншых замежнікаў — у іх і грошы, і інтарэс, — але і тут ёсць пытанні, адказ на якія пакуль не гатовы. Скажам, як наконт бязвізавага рэжыму? Няхай бы людзі свабодна прыехалі ды пакінулі за час знаходжання ў краіне куды больш грошай, чым каштуе тая віза. Пытанне адкрытае...**



Фота БЕЛТА.

Не трэба думаць, што наш варыянт санаторна-курортнай установы (іх, дарэчы, 113) — гэта штосьці зусім саўдэпаўскае і з камфортам побач не стаяла. Сёння гэта шматпрофільныя ўстановы, размешчаныя ў экалагічна чыстых мясцінах, лясных масівах. Пражыванне і харчаванне ў большасці — на вельмі дастойным узроўні. Плюс медыцынская база, у многіх — бальнеалагічны профіль, з выкарыстаннем мінеральнай вады і сапрапелевых гразяў. Суадносіны «кошт-якасць» на ўзроўні. Хто не быў, напрыклад, у «Радоне», «Сасновым бары», «Парэччы», «Світанку-Любані» — трэба паехаць і пераканацца.

— Наш «Радон» — не такі дарагі, і яго лячэбная база пры гэтым даваляе дасягнуць выдатнага лячэбнага эфекту, працяглай рэмісіі, таму абсалютная большасць пацыентаў і звяртаецца паўторна, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара Белагразддраўніцы Віктар ПАНАМАРОЎ**. — Радонавыя воды з'яўляюцца аналагамі крыніц Расіі, Украіны, Грузіі, Германіі і іншых краін. У нашых санаторыях можна атрымаць лячэнне страўнікава-кішачнага тракту, мочапалавой сістэмы, апорна-рухальнага апарату, сардэчна-сасудзістых захворванняў. І сёння мы працуем у кірунку развіцця медыцынскага турызму. Адкрылі «янтарныя пакоі», кабінеты «лячэння сузіраннем», мінеральны басейн з эфектам Мёртвага мора, ёсць спелеакліматалячэбніцы, якія не маюць аналагаў у краіне... Набылі апараты для імпульснай ударна-хвалевай тэрапіі, гідрамасажныя цэнтрыфугі, устаноўку для гарызантальнага выцягвання ў радонавай вадзе.

— «Цэнтркурорт» займаецца рэалізацыяй пуцёвак на 50 санаторна-курортных аб'ектаў. У 2007—2010-х гадах кошт пуцёвак быў досыць нізкі, праўда, цікавілі тады нашы аздараўленчыя ўстановы пераважна замежнікаў, — кажа **начальнік аддзела продажу прадпрыемства «Цэнтркурорт» Святлана ЕШЧАНКА**. — Сёння нашы аб'екты цікавыя ўжо і самім беларусам, мы заўсёды рады прапанаваць найлепшае з таго, што ёсць. Даволі складана сёння здзіўляць, бо многія з нас шмат дзе былі, аднак санаторыі намагаюцца рабіць гэта. «Юнацтва», напрыклад, па праве становіцца адным з найлепшых. Тут не толькі выдатная лячэбна-дыягнастычная база, але і адзін з самых моцных СПА-цэнтраў, якіх няма больш на тэрыторыі краіны. У «Прыазёрным» ёсць зімой выдатная коўзанка, а летам — водна-спартыўны цэнтр з элементамі аквапарку. У «Соснах» на 25 гектарах лесу з'явіўся аптэчны сад, дзе можна сабраць любы лекавы збор. У Віцебскай вобласці ёсць санаторый, дзе і басейн з мінеральнай вадой, і стравы гатуюцца на мінеральнай вадзе, і бювет, і працэдуры мінеральныя, ды яшчэ нядаўна нафталанавыя ванны з'явіліся. А не жадаеш да мора — запрашаюць беларускія санаторыі ў Сочы, Туапсе, Місхоры, а таксама ў Прыбалтыцы.

Тым не менш, паводле слоў **намесніка дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Віталя ГРЫЦЭВІЧА**, ёсць як мінімум два сучасных моманты, на якія прапазняемся звярнуць увагу. Дзе ў нас персанал, у тым ліку медыцынскі, які валодае англійскай мовай? Ці не надта мы засяродзіліся на расійскіх турыстах, колькасць якіх у любую хвіліну можа зменшыцца? Больш таго, адзін-два нумары «люкс» на ўсю ўстанову — напэўна, малавата. Дый «люкс» часам досыць сціплы для тых людзей, што за «цаной не пастаяць». Ёсць катэгорыя замежнікаў, якія даўно заглядваюцца на нашы мясціны, але ж яны за сваё жыццё адпачывалі ў такіх гатэлях, што наш «люкс» не назавуць такім словам. Калі пра гэта не падумаць цяпер, заўтра нашы санаторыі перастануць хваліцца высокай напаўняльнасцю.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■

# «Прысутнасць БДУ ў рэйтынгах — наша візітная картка»




Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выкладаннем я займаюся большую частку свайго жыцця — з 1985 года, калі абараніўся і атрымаў званне кандыдата навук. Выкладаў паралельна з работай у Акадэміі навук і ў БДУ, і ў БДУІР, а пачынаў сваю выкладчыцкую дзейнасць у тагачасным політэхнічным інстытуце — сённяшнім БНТУ. Адным словам, прайшоў усе прыступкі: навука — выкладанне — менеджмент. А ў Белдзяржуніверсітэце ўсё сышлося ў адным пункце: і першае, і другое, і трэцяе. Я і цяпер з задавальненнем прыходжу да студэнтаў у аўдыторыю. І ні ў якім разе не падтрымліваю тых, хто скептычна ставіцца да сучаснай моладзі. Ва ўсе часы былі не толькі працалюбівыя і мэтанакіраваныя студэнты, але і гультаі, і тыя, каго цікавіць не сам працэс, а толькі хуткі вынік. І так будзе заўсёды...

Я часта сустракаюся са студэнтамі ў нефармальнай абстаноўцы і мне падабаецца іх разуменне свету. Яны вельмі дапытлівыя і разумныя. Дзякуючы інтэрнэту і сучасным тэхналогіям моладзь валодае інфармацыяй, якая была недаступная нам дваццацігадовым. Я ўвогуле лічу, што маладым значна цяжэй: яны павінны ведаць намнога больш, чым мы ў свае студэнцкія часы. Сёння нават школьнік разбіраецца ў гаджэтах і камп'ютарах лепш, чым акадэмік. Калі я вучыўся на мехмаце, праграмiраванне ў нас выкладалася толькі на пятым курсе. Тагачасныя камп'ютары былі вельмі вялікія — на паўпакоя ці нават больш, мы пісалі праграмы, па іх прабівалі перфакарты, праз перфакарты ўводзілі інфармацыю ў камп'ютары, прапічвалася праграма, раздрукоўваліся вынікі і памылкі, і мы па новай праходзілі ўвесь шлях. Толькі калі мне было гадоў 25 і я ўжо працаваў у Акадэміі навук, з'явілася магчымасць па некалькі гадзін у дзень працаваць на міні-ЭВМ. А персанальныя камп'ютары з'явіліся яшчэ гадоў праз восем-дзесяць...

## ЯРКІЯ І ПАСПЯХОВЫЯ

***— Тым не менш сваё «алімпійскае золата» ў навуцы вы атрымалі вельмі рана, абараніўшы доктарскую дысертацыю ў 34 гады. А ці можаце прывесці аналагічныя прыклады ў вашым цяперашнім універсітэцкім акружэнні?***

— Колькі заўгодна. На факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Яўген Жук абараніў доктарскую ў 30 з «хвосцікам». На фізічным факультэце за апошнія гады было некалькі абароненых доктарскіх дысертацый нашымі супрацоўнікамі ва ўзросце да 35 гадоў. А ўвогуле за 2015 год супрацоўнікамі і аспірантамі ўніверсітэта абаронена 5 доктарскіх і 53 кандыдацкіх дысертацый, у 2014 годзе — 11 і 52 адпаведна. На мой погляд, у плане абароны сваіх даследаванняў маладым сёння прасцей, бо калі я ў 33 гады выйшаў на абарону доктарскай, былі прафесары, якія лічылі мяне занадта маладым, заяўлялі, што рана прысвойваць мне званне доктара навук. Проста звычайна такія дысертацыі абаранялі ў больш сталым узросце. А сёння да маладых кандыдатаў і дактароў навук зусім іншае стаўленне.

**Самыя значныя крытэрыі — гэта акадэмічная рэпутацыя, індэкс цытавання навуковых прац, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, навуковая прадукцыйнасць, ацэнкі наймальнікаў і іншыя.**

Упэўнены, што сярод нашых выпускнікоў не менш яркіх і паспяховых людзей, чым было дваццаць-трыццаць гадоў таму. Заснавальнік і кіраўнік IT-кампаніі «Itransition» — выпускнік факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ 1996 года Сяргей Гвардзейцаў. Ён стварыў сваю кампанію «з нуля», а цяпер у ёй працуюць больш за тысячу чалавек і яна мае офісы ў шэрагу краін свету. Заснавальнік кампаніі «Wargaming» — аднаго з лідараў у сусветнай гейм-індустрыі — Сяргей Кіслы, выпускнік фізічнага факультэта БДУ. Я магу гэты спіс працягваць...

***— Студэнцкія каманды факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ традыцыйна ўваходзяць у фінал сусветных спаборніцтваў па праграмаванні сярод студэнтаў і займаюць там прызавыя месцы. Між іншым, кожны год я з цікавасцю назіраю, як перамоўцы рэспубліканскай і міжнароднай алімпіяд сярод школьнікаў па інфарматыцы выбіраюць паміж БДУ і БДУІР. Скажыце, ці адчуваеце вы канкурэнцыю і як змагаецеся за лепшых?***

— Мы з БДУІР дапаўняем адзін аднаго. Універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі больш моцны ў прыкладных навуках, там рыхтуюць цудоўных сістэмных адміністратараў, электроншчыкаў. Я заўсёды кажу маладым людзям, якім складана вызначыцца з выбарам: калі табе падабаецца працаваць з «жалезам», то трэба ісці ў БДУІР. А калі ты любіш матэматыку, то, калі ласка, да нас — у БДУ рыхтуюць выдатных распрацоўшчыкаў складаных сістэм. А з маім калегам, рэктарам БДУІР Міхаілам Паўлавічам Батурам, у нас поўнае паразуменне і ўзаемная павага. За абітурыентаў мы не сварымся, а канкурэнцыя, лічу, усім ідзе толькі на карысць.



**Універсітэцкі гарадок лічыцца адным з найпрыгажэйшых куткоў сталіцы. Тут створаны своеасаблівы музей гісторыі беларускага асветніцтва.**

***— А чаму самы вядомы юны праграміст Генадзь Караткевіч адправіўся атрымліваць адукацыю ў расійскую ВНУ? БДУ не змог яго зацікавіць?***

— Пра гэта трэба пытацца ў хлопца. Мяркую, што ён зрабіў выбар на карысць Расіі, паколькі ў вялікай краіне адкрываюцца большыя магчымасці. Гэта аксіёма. Канешне, нам хацелася б, каб Караткевіч вучыўся ў нас. Але малады чалавек выбірае не проста ўніверсітэт, а сваю будучыню. Вялікаму караблю — вялікае плаванне...

## ТЭСТ НА СТО БАЛАЎ?

***— Калі вы паступалі ва ўніверсітэт, на піку папулярнасці ў моладзі былі тэхнічныя навукі. А сёння ўсе рэкорды б'е факультэт міжнародных адносінаў (ФМА). Туды ідуць абітурыенты практычна з максімальна магчымай сумай балаў. Скажыце, а вы ніколі не цікавіліся іх чаканнямі: кім яны сябе бачаць на выхадзе з універсітэту?***

— Канешне, міжнароднікамі *(смяецца. — **Аўт.**)*. У 17—18 гадоў усе мараць ездзіць па свеце. Мараць пра дыпламатычную кар'еру. Але жыццё ўносіць свае карэкціроўкі... Нельга ж увесь выпуск прыняць на працу ў Міністэрства замежных спраў. Адзін-два выпускнікі трапляюць туды адразу пасля заканчэння ФМА, але гэта лепшыя з лепшых. Я наведваю шмат краін і паўсюдна сустракаю нашых выпускнікоў не толькі ў пасольствах і дыпламатычных прадстаўніцтвах, але і ў транснацыянальных карпарацыях, замежных прадстаўніцтвах беларускіх кампаній. Паспяховых сярод выпускнікоў факультэта міжнародных адносін хапае, але ж усе не могуць быць такімі.

***— Як вы мяркуеце: калі б вам давялося здаваць пры паступленні тэсты, вы б з імі справіліся? Ці ёсць у вас прэтэнзіі да сістэмы адбору кандыдатаў на студэнцкі білет?***

— Тэсты выкарыстоўваюцца ва ўсім свеце. Маладыя людзі іх здаюць, а потым толькі рассылаюць свае вынікі па розных універсітэтах. Сістэма цэнтралізаванага тэсціравання працуе і са сваёй задачай спраўляецца. А «плюсы» і «мінусы» можна знайсці ва ўсіх сістэмах ацэньвання. Прэтэнзій да вусных экзаменаў заўсёды хапала. Ці не таму ва ўсім свеце ў вышэйшай школе практыкуюцца пераважна пісьмовыя формы ацэньвання ведаў студэнтаў і абітурыентаў? Я ўвогуле б дазволіў абітурыентам здаваць не тры, а чатыры, пяць і больш тэстаў. А потым няхай думаюць, якія з дысцыплін ім даюцца прасцей.

Канешне, у тэсты я глядзеў: сумняваюся, што набраў бы сто балаў з першай спробы. Каб дасягнуць такога выніку, трэба сістэмна працаваць. Я зараз рухаюся па школьнай праграме разам са сваім унукам-пяцікласнікам, і прызнаюся вам, што становіцца ўсё складаней і складаней *(усміхаецца. — **Аўт.**)*. У маім школьным дзяцінстве задачкі былі прасцейшыя... Добра, калі ўсё адбываецца паслядоўна. А калі б мне цяпер далі задачку для адзінаццацікласніка, напэўна, трэба было б над ёй яшчэ падумаць.

У выкладчыкаў універсітэта да стабальнікаў ніякіх прэтэнзій няма — гэта мэтанакіраваныя дысцыплінаваныя студэнты, якія прызвычаіліся да сістэмнай працы. І ўвогуле, вынікі ЦТ вельмі добра суадносяцца з вынікамі першай экзаменацыйнай сесіі — значна лепш, чым з ацэнкамі ў школьных атэстатах.

## ГЛАБАЛЬНАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

***— Якасць БДУ пастаянна ацэньваюць розныя агенцтвы. Што вам гэта дае? Ці можна ўвогуле канкураваць з універсітэтамі, якія ўваходзяць у першую сотню?***

— Адукацыя — гэта сур'ёзны рынак, дзе ёсць многа гульцоў. Прысутнасць у сусветных рэйтынгах прэстыжна для любой ВНУ, бо за імі сочаць сусветная супольнасць. Гэта свайго роду візітная картка для шматмільённай аўдыторыі. Тваё месца ў рэйтынгу — адзін з галоўных параметраў для замежнага абітурыента, магістранта ці аспіранта. Работадаўцы цікавяцца рэйтынгамі, каб ведаць, якія ўніверсітэты рыхтуюць лепшых спецыялістаў. Высокія пазіцыі маюць значэнне і пры падпісанні міжнародных пагадненняў, і ўвогуле пры фарміраванні іміджу ўніверсітэта ў вачах замежных партнёраў, павышаюць яго інвестыцыйную прыцягальнасць. Канешне, у розных рэйтынгавых агенцтвах — свае крытэрыі ацэнкі дзейнасці ВНУ, але колькасныя паказчыкі, пакладзеныя ў аснову ўсіх аўтарытэтных сусветных рэйтынгаў, адлюстроўваюць аб'ектыўны стан вышэйшай адукацыі ў свеце. Самыя значныя крытэрыі — гэта акадэмічная рэпутацыя, індэкс цытавання навуковых прац, суадносіны колькасці выкладчыкаў і студэнтаў, навуковая прадукцыйнасць, ацэнкі наймальнікаў і іншыя.

***— А як вы ставіцеся да журналісцкіх ацэнак кшталту «БДУ здаў пазіцыі, але застаўся ў рэйтынгу» або «ў рэйтынгу лепшых універсітэтаў свету БДУ скаціўся на апошнія пазіцыі?»***

— Спакойна. Пісаць можна ўсё што заўгодна. Рэйтынг — гэта тое ж спаборніцтва, і немагчыма ўвесь час рухацца толькі наперад. У адным рэйтынгу можна прасунуцца наперад, а ў іншым — крыху адступіць. Не бачу ў гэтым трагедыі. У свеце налічваецца каля 30 тысяч універсітэтаў. А Беларускі дзяржаўны універсітэт стабільна трапляе ў 2% лепшых.

Напрыклад, у верасні гэтага года БДУ заняў 354-е месца ў сусветным рэйтынгу QS, а ў 2015 годзе дзяліў 421—430 пазіцыі. У самым масавым сусветным рэйтынгу Webometrics (WRWU) у студзені 2016 года сярод 22 000 ранжыраваных устаноў вышэйшай адукацыі Белдзяржуніверсітэт заняў 584-ю пазіцыю, а ў ліпені — 634-ю. У студзені бягучага года электронная бібліятэка БДУ заняла 100-ю пазіцыю сярод універсітэцкіх бібліятэк. Увогуле, бібліятэка БДУ з'яўляецца лідарам сярод электронных бібліятэк ВНУ краін СНД. Яна таксама ўваходзіць у 60 лепшых рэпазіторыяў еўрапейскіх універсітэтаў (у яе 59-е месца).

Але будзем рэалістамі: канкураваць на роўных з універсітэтамі, якія ўваходзяць у першую тройку і нават у першую сотню, мы пакуль не можам. Прывяду толькі адну лічбу: гадавы бюджэт Гарвардскага ўніверсітэта складае 60 мільярдаў долараў. Увогуле **бюджэт першай сотні ўніверсітэтаў брытанскага рэйтынгу вагаецца ад пяці да шасцідзесяці мільярдаў долараў. Бюджэт Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта — 1 мільярд долараў. А ў нас — каля 75 мільёнаў долараў.** На фоне сціплых фінансавых магчымасцяў рэзкі пад'ём БДУ ў сусветных рэйтынгах, куды рэдка трапляюць іншыя беларускія ВНУ, я лічу заслугай найперш нашага калектыву.

***— Ці мог бы паспрыяць прасоўванню БДУ на міжнароднай арэне асаблівы статус нацыянальнага ўніверсітэта?***

— Не сумняваюся ў гэтым. З улікам таго, што БДУ сёння ўключаны ў глабальную канкурэнцыю ў сістэме вышэйшай адукацыі, асаблівы статус пасадзейнічаў бы ў нашым намеры стаць на адзін узровень з прызнанымі флагманамі навукі і адукацыі. Гэта зусім іншае фінансаванне, мы маглі б запрашаць больш выкладчыкаў з замежных універсітэтаў. Мелі б большую свабоду ў правядзенні ўступнай кампаніі (Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт такое права мае). З'явілася б магчымасць абараніцца і атрымліваць навуковыя ступені ўнутры свайго ўніверсітэта...

***— Цягам апошніх дваццаці гадоў сродкі навучання моцна эвалюцыянавалі. БДУ не адстае ад агульнасусветных трэндаў?***

— Стараемся. Зразумела, што дошка і крэйда — гэта ўчарашні дзень. Студэнты ўвогуле не жадаюць нічога запісваць за выкладчыкам. Пагадзіцеся, што сучасная моладзь ацэньвае нас перш за ўсё па прысутнасці ў «сусветным павуцінні». Таму я патрабую ад выкладчыкаў стварэння электроннага партфоліа. Увогуле, стварэнне адукацыйнага мультымедыйнага кантэнту (відэазапісаў лекцый, лабараторных дэманстрацый, запісаў відэаканферэнцый, навучальных ролікаў і г.д.) — прыярытэтная задача ў інфарматызацыі ў БДУ. Для доступу да мультымедыйнага кантэнту ў найбліжэйшы час павінна быць укаранёная сістэма «відэа па запыце». Дарэчы, я таксама выкладаю на сайце ўніверсітэта свае лекцыі ў электронным выглядзе, інакш як можна патрабаваць гэта ад іншых?

***— Сяргей Уладзіміравіч, што значыць быць рэктарам самай прэстыжнай навучальнай установы ў краіне? Рэктар — гэта ў першую чаргу вучоны, топ-менеджар або, можа быць, адміністратар? Якімі якасцямі трэба валодаць, каб кіраваць такім гігантам, як Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт?***

— І першае, і другое, і трэцяе. Пра свае прафесійныя якасці мне складана разважаць, няхай лепш гэта робяць супрацоўнікі ўніверсітэта. Мяркую толькі, што людзі з матэматычным складам розуму бяруць ад матэматычнай сістэмы падыход да ўсіх жыццёвых і прафесійных сітуацый. Мне трэба ўсё раскласці па палічках, прапічыць лагістыку, каб рухацца далей. Я, дарэчы, у дзясятым класе меў першы дарослы разрад па шахматах. Можа быць, я і нядрэнны менеджар, калі мяне яшчэ трымаюць на гэтай пасадзе? *(Усміхаецца. — **Аўт.**)* Але і дэканы гуманітарных факультэтаў у нас таксама выдатныя менеджары. Значыць, справа не толькі ў матэматыках. А, можа, галоўнае — уменне працаваць у камандзе? Хачу падкрэсліць, што ва ўніверсітэце ў нас склалася проста выдатная каманда аднадумцаў.

***— А якім вы бачыце БДУ, скажам, гадоў праз 50?***

— Так далёка яшчэ не зазіраў, бо і дзесяць гадоў у сучасным зменлівым свеце — гэта зашмат. Я бачу ўніверсітэт буйным адукацыйным, навукова-даследчым і нават вытворчым цэнтрам, які забяспечвае лідарства нашай краіны па шэрагу навуковых напрамкаў і тэхналогій. Якасць падрыхтоўкі нават не абмяркоўваецца. Трэба расці і ў свеце, бо мы прадстаўляем усю вышэйшую школу і навуку Беларусі. **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — гэта нацыянальны брэнд. Так, давайце ўвойдзем у сусветных рэйтынгах спачатку ў 1 працэнт найлепшых, а затым і ў палову працэнта.** Адукацыя і навука сталі глабальнымі, і БДУ гатовы адказаць на гэты выклік.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БРЕСТОБУВЬТОРГ»

| Наименование объекта торгов, краткие характеристики | Местонахождение | Начальная цена продажи, без учета НДС, BYN | Задаток, BYN |
|---|---|---|---|
| **ЛОТ №1.** Капитальное строение (инв.№ 100/С-6681) — гараж на 2 бокса, пл. 106,6 м², расположенный на земельном участке пл. 0,2980 га; горка островная (код 12349); горка пристенная (код 12350) — 5 шт.; светильник ЛВО 4*16 (код 18475) — 2 шт.; стол 1-тумбовый (код 3181); стол упаковочный с тумбой (код 21578); электросчетчик СЕ 102S 145 (код 21299); ящик для инструментов (код 16731) | г. Брест, ул. Янки Купалы, 100 | 25 059,51 | 2 505,95 |
| **ЛОТ №2.** Торговый павильон, общ. пл. 53,84 м² на асфальтобетонной площадке пл. 60,4 м² (инв.№1255); сигнализация пожарно-охранная (код 12171); замок висячий (код 21479); замок висячий (код 22065); электросчетчик СС301.5 (код 21901) | г. Брест, ул. Янки Купалы, 111 | 10 007,56 | 1 000,76 |
| **ЛОТ №3.** Изолированное помещение (инв. № 100/D-1111) — склад, общ. пл. 720,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001007264, площадью 0,2980 га | г. Брест, ул. Янки Купалы, 100 | 137 726,09 | 13 772,61 |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| **Условия оплаты** | в соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича,10. УНП 201028245 | | |

**Аукцион состоится 30 ноября 2016 г. в 14.00**

**по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325, Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам 8-(0162)- 20-92-13, 21-88-81, (029) 626-72-52.**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений — 29 ноября 2016 г. до 17.00**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «КОБРИНСКИЙ ССК»

| Наименование объекта | Начальная цена продажи, руб. без НДС | Размер задатка, руб |
|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** Капитальное строение (инв. №123/С-29782) — навес, общ. пл. 536,8 м², расположенное на земельном участке пл. 0,2112 га с кадастровым номером 124350100002004639 по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 58Г | 13 800,00 | 1 380,00 |
| **ЛОТ № 2** Капитальное строение (инв. №123/С-17908) — здание растворобетонного узла, общ. пл. 364,8 м², расположенное на земельном участке пл. 0,1719 га с кадастровым номером 124350100002004638 по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 58Б | 20 700,00 | 2 070,00 |
| **ЛОТ № 3** Капитальное строение (инв. №123/С-17913) — здание автогаража, общ. пл. 391,5 м², расположенное на земельном участке пл. 0,0864 га с кадастровым номером 124350100002004500 по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Никольская, 64Е | 14 758,38 | 1 475,84 |
| **Организатор торгов** | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов | |
| **Условия оплаты** | оплата производится в соответствии с заключенным договором купли-продажи | |
| **Условия продажи** | без условий | |
| **Номер р/сч для перечисления задатка** | р/с 3012178938017 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция №100 по Брестской области, код 369, г. Брест, ул. Мицкевича,10 УНП 201028245 | |

**Аукцион состоится 30 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу:**

**г. Брест, ул. Наганова, 10 - 325 Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**Перечень документов для участия в аукционных торгах и иную информацию можно узнать по телефонам: (0162) 20-92-13 ; 21-88-81**
**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00 Последний день приема заявлений — 29 ноября 2016 г. до 17.00**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | Филиал СУ-159 ОАО «Трест №26 Железобетонмонтаж», г. Брест, ул. Янки Купалы,120/2. Тел: +375 296592523, +375 162 42 55 10, +375 17 256 90 01 |

**Предмет аукциона**

Транспорт, расположенный по адресу: г. Брест, ул. Гродненская, д. 55Д в составе:

| № п/п лота | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел.руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 750 | **Специальный автомобиль МАЗ 5337 (автокран КС-45729А), 2007 г.в.** | 25 185 руб. 06 коп. (251 850 600) | 1 259 руб. 26 коп. (12 592 600) |
| 2 | 728 | **Трактор колесный МТЗ-80, 1989 г.в.** | 2 106 руб. 22 коп. (21 062 160) | 105 руб. 32 коп. (1 053 200) |
| 3 | 804 | **Легковой автомобиль GAZ-31105, 2007 г.в.** | 1 122 руб. 12 коп. (11 221 200) | 56 руб. 11 коп. (561 100) |
| 4 | 373 | **Подмости ПВС 12, 1979 г.в.** | 9 521 руб. 06 коп. (95 210 600) | 476 руб. 06 коп. (4 760 600) |
| **Спецтехника, распложенная по адресу: г. Брест, ул. Янки Купалы,120/2 в составе:** | | | | |
| 5 | 734 | **Автогидроподъемник ВС222-01 на базе ЗИЛ -131** | 11 716 руб. 60 коп. (117 165 960) | 585 руб. 83 коп. (5 858 300) |

**Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Пинск, ул. Гайдаенко, д. 55В, Брестская область**

| № п/п лота | Наименование (назначение) | Составные части и принадлежности | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|---|
| 6 | Гаражи (здание специализированное транспорта) | Склад, уборная, ворота, калитка, забор | 280,6 | 130/С-30666 |

**Сведения о земельном участке:** общ.пл. 0.1459 (га), предоставлен на праве постоянного пользования для размещения промышленных объектов.

| | |
|---|---|
| Начальная цена с НДС 20% | **48 757, 03 белорусских рублей BYN**<br>**487 570 300 белорусских рублей BYR** |
| Шаг аукциона | **2 437, 86 белорусских рублей BYN**<br>**24 378 600 белорусских рублей BYR** |

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления:** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9-00 до 16-00, перерыв с 12-00 до 13-00. Ответственное лицо: Климчук Василий Григорьевич, контактный телефон +375 296592523. |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № 3012343260010; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

**Срок оплаты:** не более 10 (десяти) дней со дня заключения договора купли-продажи.

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 "О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица". К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона WWW.CPO.BY

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г.»Звязда» 23.09.2016г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **18.11.2016 в 14 ч.00 мин по адресу: филиал СУ - 159 ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Брест, ул. Янки Купалы,120/2.** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **16.11.2016** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ АУКЦИОНОВ

**по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества**

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г.Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «Витебские продукты», 210041, г. Витебск, ул.Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года части капитального строения (инв.№200/С-52276) площадью 22,4 кв.м на 1 этаже по адресу: г.Витебск, ул.Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 16,13 базовых арендных величин. **Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки). **Нач.цена (с учетом/до деноминации):** 76,16/761 600 бел.руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 7,62/76 200 бел.руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года части капитального строения (инв.№200/С-52276) площадью 41,7 кв.м на 1 этаже по адресу: г.Витебск, ул.Лазо, 8 (здание магазина). Размер ежемесячной арендной платы: 30,02 базовых арендных величин. **Целевое использование:** объект по оказанию услуг населению (кроме ритуальных услуг), офиса, объекта торговли непродовольственными товарами (в т.ч. аптеки). **Нач.цена (с учетом/до деноминации):** 141,78/1 417 800 бел.руб. **Задаток (с учетом/до деноминации):** 14,20/142 000 бел.руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 22.11.2016 в 15.00. по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 31.10.2016 с 8.30 по 21.11.2016 до 17.30. Ранее опубликованное извещение о проведении аукциона: газета «Звязда» 19.08.2016.

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г.Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90.

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 231,74 кв.м в т.ч. основные 171,34 кв.м (20,12; 0,55; 0,53; 17,81; 22,58; 17,95; 22,13; 17,81; 11,86; 26,52; 0,72; 0,22; 12,54 кв.м) и вспомогательные 60,4 кв.м (35; 25,4 кв.м), расположенных на 3 этаже капитального строения с инв.№240/С-18515 по адресу: Витебская обл., г.Орша, ул.Ленина, д.46 для размещения офисов, оказания услуг. Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Нач.цена** (с учетом/до деноминации): 787,92/7 879 200 бел.руб. **Задаток** (с учетом/до деноминации): 78,79/787 900 бел.руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 43,4 кв.м, расположенного на 2 этаже изолированного помещения с инв.№200/D-107228 по адресу: Витебская обл., г.Витебск, ул.Чкалова, 34, пом.1 (отделение связи №32) для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Нач.цена** (с учетом/до деноминации): 147,56/1 475 600 бел.руб. **Задаток** (с учетом/до деноминации): 14,76/147 600 бел.руб.

**Дата, время и место проведения аукциона:** 01.12.2016 в 15.00. по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, дом 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 31.10.2016 с 8.30. по 30.11.2016 до 17.30.

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр.лицом — резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос.регистрацию юр.лица; юр.лицом - нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос.регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями - оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона - лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г.Витебск, ул.Ленина, 17, УНП 390477566. Конт.тел: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**ООО «Стандарт оценки» (Организатор аукциона) по поручению управляющего в деле о банкротстве Частное предприятие «Эффективное Управление»**

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ СЛЕДУЮЩИХ КАПИТАЛЬНЫХ СТРОЕНИЙ:**

**1. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель с инвентарным № 336/С - 6139, площадью — 1799,8 кв.м;**

**2. Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель с инвентарным № 336/С - 6140, площадью — 1962 кв.м;**

**3. Здание обрабатывающей промышленности иного назначения с инвентарным № 336/С – 6141, площадью — 496,1 кв.м,**

**расположенных по адресу: Гомельская обл., Наровлянский р-н, г. Наровля, ул. Заводская, 16, на земельном участке с кадастровым номером 323850100001000387, предоставленном на праве постоянного пользования, площадью — 6,1728 га (водоохранная зона реки Припять).**

Продавец: ЧПУП «БелЕвроДом», Гомельская обл., Наровлянский р-н, г. Наровля, ул. Заводская, 16, к. 2, в лице управляющего в деле о банкротстве Частное предприятие «Эффективное Управление».

**Начальная цена продажи без НДС — 41 820 руб. 00 коп.**

**Шаг аукциона – 5% от начальной цены продажи.**

*Задаток – 5 000 руб. 00 коп. перечисляется на расчетный счет 3012401991019 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, МФО 153001749, получатель платежа ООО «Стандарт оценки», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 29.10.2016 г.*

**Аукцион состоится 14 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а**. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по **10 ноября 2016 г. до 16.00** по указанному адресу.

Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, порядок проведения аукциона и оформления его результатов, дополнительная информация об Объекте аукциона размещены на сайте **standard.by**.

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5% обязан:

в течение 5 (пяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона (размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных документов); в течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату в сроки, установленные договором купли-продажи, если в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за объекты недвижимости, в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи произвести оплату за объекты недвижимости.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.09.16г.

**Тел./факс: +375 (232) 21 21 61, + 375 (29) 654 03 91.**
**E-mail: 6854986@standard.by.**
УНП 810000758

Standard.by®

Департамент по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
27 октября 2016
Красинский А.Д.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного Общего собрания участников СООО «ВильнюсСтрой» от 12 октября 2016 года

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ третьего выпуска

**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» г. Минск**

Внести в Проспект эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска следующие изменения:

1. подпункт 2.4.1 пункта 2.4 изложить в следующей редакции:

«2.4.1. Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается поручительством следующих юридических лиц:

— Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ» в сумме 236 070 (двести тридцать шесть тысяч семьдесят) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 01 декабря 2014 года №01/12/П в редакции дополнительных соглашений от 22 мая 2015 года №1, от 10 июня 2016 года №2 и от 12 октября 2016 года №3.

Место нахождения Закрытого акционерного общества «МОРТЕКС БЦЗ»: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 8 этаж, кабинет 44; УНП 101186296.

Стоимость чистых активов Закрытого акционерного общества МОРТЕКС БЦЗ» на 01.07.2016 составляет 236 180,27 (двести тридцать шесть тысяч сто восемьдесят) белорусских рублей 27 (двадцать семь) копеек;

— Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО» в сумме 1 060 790 (один миллион шестьдесят тысяч семьсот девяносто) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 22 мая 2015 года №22/05П в редакции дополнительных соглашений от 10 июня 2016 года №1 и от 12 октября 2016 года №2.

Место нахождения Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО»: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж; УНП 100344404.

Стоимость чистых активов Совместного закрытого акционерного общества «БЕЛКАРГО» на 01.07.2016 составляет 1 391 221,01 (один миллион триста девяносто одна тысяча двести двадцать один) белорусский рубль 1 (одна) копейка;

— Общества с ограниченной ответственностью «Пирим» в сумме 147 010 (сто сорок семь тысяч десять) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 12 октября 2016 года №1/П.

Место нахождения Общества с ограниченной ответственностью «Пирим»: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, помещение 38; УНП 191505162.

Стоимость чистых активов Общества с ограниченной ответственностью «Пирим» на 01.07.2016 составляет 2 407 773,56 (два миллиона четыреста семь тысяч семьсот семьдесят три) белорусских рубля 56 (пятьдесят шесть) копеек;

— Общества с ограниченной ответственностью «ТехСтройЛюкс» в сумме 172 630 (сто семьдесят две тысячи шестьсот тридцать) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 12 октября 2016 года №2/П.

Место нахождения Общества с ограниченной ответственностью «ТехСтройЛюкс»: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, кабинет 49; УНП 190982068.

Стоимость чистых активов Общества с ограниченной ответственностью «ТехСтройЛюкс» на 01.07.2016 составляет 172 657,22 (сто семьдесят две тысячи шестьсот пятьдесят семь) белорусских рублей 22 (двадцать две) копейки.

По договорам о предоставлении поручительства поручители обязуются исполнить обязательства по Облигациям перед их владельцами в пределах суммы поручительства, предусмотренной договорами о предоставлении поручительства, в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения данных обязательств Эмитентом.

Договоры о предоставлении поручительства вступают в силу с момента их подписания Эмитентом и поручителями и действуют в течение всего срока обращения Облигаций, а также в течение 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций. Действие договоров о предоставлении поручительства прекращается (в зависимости от того, какое событие (срок) наступит ранее) после исполнения обязательств по Облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска Облигаций) либо по истечении 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций, если владельцы Облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по Облигациям к Эмитенту или поручителю.»;

2. пункт 2 части второй подпункта 4.2.5 пункта 4.2 изложить в следующей редакции:

«2. Обеспечение эмиссии третьего выпуска Облигаций поручительством в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 01 декабря 2014 года №01/12/П в редакции дополнительных соглашений от 22 мая 2015 года №1, от 10 июня 2016 года №2 и от 12 октября 2016 года №3, заключенным с Закрытым акционерным обществом «МОРТЕКС БЦЗ», договором о предоставлении поручительства от 22 мая 2015 года №22/05П в редакции дополнительных соглашений от 10 июня 2016 года №1 и от 12 октября 2016 года №2, заключенным с Совместным закрытым акционерным обществом «БЕЛКАРГО», договором о предоставлении поручительства от 12 октября 2016 года №1/П, заключенным с Обществом с ограниченной ответственностью «Пирим», и договором о предоставлении поручительства от 12 октября 2016 года №2/П, заключенным с Обществом с ограниченной ответственностью «ТехСтройЛюкс».».

ОТ ЭМИТЕНТА:
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская
ОТ ЛИЦ, ПРЕДОСТАВИВШИХ ОБЕСПЕЧЕНИЕ:
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ЗАО «МОРТЕКС БЦЗ» С.В.Сильченко
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор СЗАО «БЕЛКАРГО» Е.В.Пикарева
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Главный бухгалтер ООО «Пирим» А.В.Калишук
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ООО «ТехСтройЛюкс» О.И.Хурсевич
ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

УНП 191434087

# ЯНЫ ДРУКАВАЛІ «ЗВЯЗДУ»

## Дагэтуль няма адзінага меркавання, хто — Вячаслаў Нікіфараў або Ядвіга Савіцкая — быў рэдактарам другога, трэцяга і чацвёртага нумароў падпольнага выдання

**Пра подзвіг звяздоўцаў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны выпускалі газету ў акупаваным Мінску, не напісана, бадай, толькі ў школьным падручніку па гісторыі. Але быў час, калі некаторым з іх даводзілася адстойваць свой прафесійны гонар...**

Неаднойчы ставілася пад сумненне дзейнасць той жа Ядвігі Савіцкай, якая, па некаторых звестках, была рэдактарам 2-га, 3-га і 4-га нумароў падпольнай «Звязды». Іншыя даныя аспрэчваюць гэты факт, аддаючы адказную пасаду загадчыку аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага гарадскога падпольнага камітэта Вячаславу Нікіфараву.

### Змагар і патрыёт Вацік

Скончыўшы ў 1927 годзе адну з мінскіх сямігодак, Вячаслаў Нікіфараў вучыўся ў вячэрняй чыгуначнай школе, нават прайшоў курсы па падрыхтоўцы ў медінстытут. Медыцынскай адукацыі ён так і не атрымаў, але за плячамі ўжо была праца на чыгуначных станцыях Міханавічы і Мінск, вайсковая служба ў Вялікіх Луках. Пасля арміі Вячаслаў Кандратавіч займаў пасаду адказнага выканаўцы і загадчыка транспартнай групы Галоўнафтазбыту.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Нікіфараву было крыху больш за 30 гадоў. З першых дзён акупацыі сталіцы Вячаслаў уключыўся ў барацьбу з ворагам. Менавіта ён ініцыяваў стварэнне падпольнай групы «Нафтавікоў», якую ўзначаліў падпольшчык Грыгор'еў. Пэўны час кватэра Нікіфарава, якая знаходзілася на Чэрвеньскім тракце, была явачнай. Тут неаднойчы збіраліся патрыёты, захоўвалася забароненая літаратура і зброя.

Разам з Вацікам (падпольная мянушка Вячаслава Нікіфарава) у барацьбе з ворагам удзельнічаў і яго брат. Аляксандр Нікіфараў працаваў у аўтарамонтных майстэрнях і часта выконваў заданні старэйшага брата: збіраў і захоўваў зброю, распаўсюджваў лістоўкі, меў зносіны з партызанамі. Аднойчы разам з падпольшчыкам Іванам Сёміным яны вывезлі з Мінскага мясакамбіната 4 аўтамашыны мясакалбасных вырабаў, а з Мінскага хлебазавода — больш як 20 тон печанага хлеба. Шура, як называлі яго падпольшчыкі, быў павешаны падчас аднаго з публічных пакаранняў.

Пасля таго як у маі 1942 года загінуў першы рэдактар падпольнай «Звязды» Уладзімір Амельянюк, Вячаслава Нікіфарава прызначылі адказным рэдактарам 2-га, 3-га і 4-га нумароў газеты. Асабіста прымаў удзел у абсталяванні тыпаграфіі па Выдавецкай вуліцы. Дакументы сведчаць, што менавіта Нікіфараў падбіраў людзей для падпольнай рэдакцыі.

— Я прыйшоў з раніцы заканчваць набор 3-га нумара газеты, а праз гадзіну-дзве гаспадыня хаты (Тацціяна Якавенка. — **Аўт.**) паведаміла мне (яна заўсёды дзяжурыла, калі я працаваў), што ідуць таварышы Казачонак і Вацік, — пісаў у сваіх успамінах наборшчык падпольнай «Звязды» Хасан Александровіч. — Яны патрэбныя былі мне для ўзгаднення размяшчэння матэрыялу да вёрсткі. Мы разам сталі складаць макет 3-га нумара газеты. Не паспелі скончыць гэтую працу, як гаспадыня паведаміла, што ідзе паліцай. Казачонак і Вацік выйшлі ў іншы пакой, а мяне зачынілі на замок. Было вырашана, калі паліцэйскі захоча зайсці ў пакой, дзе я працаваў, забіць яго халоднай зброяй...

Чацвёрты і пяты нумары «Звязды» ствараліся ўжо на кватэры па вуліцы Беламорскай, дзе гаспадарылі Пётр і Альбіна Хадасевічы. Але і там было не менш небяспечна. 25 верасня 1942 года, за дзень-два да выхаду пятага нумара, гестапаўцы арыштавалі 21 падпольшчыка. Сярод іх былі і Хадасевічы са сваімі непаўналетнімі сынамі, і Вячаслаў Нікіфараў...

— У пачатку верасня 1942 года Уладзімір Казачонак прынёс у тыпаграфію матэрыял для 5-га нумара падпольнай «Звязды», — расказваў Барыс Александровіч, сын наборшчыка падпольнай газеты. — Бацька ўвесь гэты матэрыял набраў, зрабіў карэктуру і завярстаў, за выключэннем толькі зводкі Саўінфармбюро, якую павінен быў прынесці рэдактар. Аднак ва ўстаноўлены тэрмін Вячаслаў Нікіфараў не прыйшоў. Праз некалькі дзён стала вядома, што яго арыштавалі.

Яшчэ пасля арыштаў у сакавіку 1942 года, калі гітлераўцы наведаліся на кватэру да Вячаслава Нікіфарава, стала зразумела, што трэба быць асцярожней. Нікіфараву тады пашанцавала: яго не было дома. Затое арыштавалі яго брата. Але работа над выпускам «Звязды» працягвалася. Больш таго, удзельнічаў Вячаслаў Нікіфараў і ў распаўсюджванні газеты.

— Калі выйшаў чацвёрты нумар «Звязды», Вячаслаў Нікіфараў сказаў мне, што збіраецца ісці ў партызаны, — прыгадвала калега па рэдакцыі Ядвіга Савіцкая. — На гэтым настойвалі члены падпольнага гаркама партыі, бо фашысцкія сышчыкі яго шукалі. Нікіфараў абяцаў на развітанне прыйсці да нас, каб грунтоўна перагаварыць аб усім. Але ў прызначаны дзень мы яго так і не дачакаліся...

Тое, што за Нікіфаравым сапраўды сачылі, пацвярджала і падпольшчыца Аляксандра Януліс: «...Сайчык (актыўны ўдзельнік Мінскага падполля. — **Аўт**.) быў вельмі занепакоены, бо ведаў, што за Вацікам сачылі. Вацік неяк расказваў яму, што за ім ішлі па пятах з гестапа і ён з вялікімі цяжкасцямі, цераз разваліны нейкага двара, уцёк».

Падпольшчык, а потым камандзір партызанскага атрада «Мсцівец» Анатоль Сакалоў, які напярэдадні арышту Вячаслава Нікіфарава бачыўся з ім, успамінаў: *«І вось апошняя сустрэча, апошняе развітанне. На развілцы, на Камароўцы, стаіць Вацік, ён усміхаецца. А ўсміхацца ёсць чаму — у самай гушчы варожых салдат і афіцэраў рухаецца добрая група, чалавек да 30, напалову ўзброеная, якая ўжо заўтра пачне іх знішчаць, але пакуль гэтая група па-за падазрэннем. Падыходжу да Ваціка, некалькі сказаных на дарогу слоў і некалькі пачак махоркі, і мы расстаёмся. Хто з нас у той час думаў, што назаўсёды...»*

Арыштаванага Нікіфарава жорстка катавалі. Зверскімі спосабамі яго прымушалі адмовіцца ад камуністычнай партыі. Вядома, што 8 снежня 1942 года яго перавезлі ў мінскую турму. Пасля зноў трапіў у СД. Далейшы лёс змагара і патрыёта невядомы. Указам 10 мая 1965 года Вячаслаў Кандратавіч Нікіфараў пасмяротна быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.


Хата па Выдавецкай вуліцы, дзе былі надрукаваны 2-гі і 3-ці нумары падпольнай «Звязды».

### Непрызнаная Тамара

Той факт, што побач з Вячаславам Нікіфаравым над выданнем падпольнай «Звязды» працавала і Ядвіга Савіцкая, — бясспрэчны. Іншая справа, ці лічыць яе рэдактарам газеты.


Вячаслаў НІКІФАРАЎ.

Афіцыйных загадаў, якія б сведчылі аб прызначэнні Тамары (падпольны псеўданім Савіцкай) на такую адказную пасаду, няма. Затое ёсць іншыя дакументальныя звесткі, якія пацвярджаюць гэты факт. І аспрэчваюць таксама.

Хоць падстаў для зацвярджэння Савіцкай на пасаду рэдактара было дастаткова. Яна добра ведала паліграфічную справу: з 1929 па 1937 год працавала наборшчыкам і старшым наборшчыкам. Пасля заканчэння Мінскага камуністычнага інстытута журналістыкі была загадчыцай аддзела навукі і культуры газеты «Звязда», пасля — аддзела партыйнага жыцця рэспубліканскай газеты на польскай мове «Sztandar Wolnosci». У падпольную работу ўключылася з восені 1941 года.

Тое, што Ядвіга Савіцкая была рэдактарам падпольнай «Звязды», пацвярджаюць два важныя дакументы. Па-першае, радыёграма, якую ў кастрычніку 1942 года на імя начальніка Беларускага штаба партызанскага руху Пятра Калініна даў сакратар Мінскага падпольнага абкама партыі Іван Варвашэня: «Да нас з Мінска прыбыла рэдактар падпольнай газеты «Звязда» Савіцкая Я. М.» Па-другое, ведамасць фінансавай часці ЦК КПБ, завізіраваная яе начальнікам Піпкіным, згодна з якой Савіцкай, як рэдактару падпольнай газеты «Звязда», выплацілі заробак за перыяд з чэрвеня па кастрычнік 1942 года з разліку 1600 рублёў у месяц і, як кіруючаму супрацоўніку падпольнага партыйнага (партызанскага) друку, за перыяд з кастрычніка 1942 па май 1944 года.

Але ў пасляваенны час Ядвіга Савіцкая вымушана была адстойваць сваю ролю ў выданні падпольнай «Звязды». У студзені 1979 года камісія па ўстанаўленні і прызнанні ўдзельнікаў Мінскага партыйнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны разглядала зварот Ядвігі Міхайлаўны аб прызнанні яе рэдактарам падпольнай газеты. Заява ад яе ў ЦК Кампартыі Беларусі на імя Пятра Машэрава паступіла ў сакавіку 1978 года.

«...Галоўным на сённяшні дзень з'яўляецца «гістарычнае» заключэнне аб маёй дзейнасці ў падполлі, дадзенае Пачаніным і Давыдавай, — піша першаму сакратару ЦК КПБ Савіцкая. — З іх лёгкай рукі я, можна сказаць, і выпала з брашуры «Аб партыйным падполлі ў Мінску», апублікаванай у 1961 г. З гэтага часу і пачалося актыўнае выгнанне мяне з друку як рэдактара газеты. Пачанін і Давыдава выклікалі ў рэдактараў выдавецтваў, часопісаў і газет недавер да мяне. З усіх артыкулаў мяне выкрэсліваюць, і ў той жа час Інстытут гісторыі партыі працягвае выдаваць мне даведкі як рэдактару газеты «Звязда».

Звяртаючыся да Машэрава, вось што яшчэ кажа Ядвіга Савіцкая: *«Я ў партыі 46 гадоў. Я ветэран вайны і ветэран працы. Сумленна жыла і ваявала. Чаму ж мне, як старому члену партыі, не дапамогуць аднавіць ісціну? Не хочуць разбірацца ў маім пытанні, пакараць тых, хто доўгія гады здзекуецца нада мной, падрывае маё здароўе... Мне, можа быць, засталося мала жыць. За апошнія 7 гадоў я зрабіла 3 сур'ёзныя аперацыі. Але пакуль жывая, хачу сваё пытанне давесці да канца. Хачу, каб дзеці мае і ўнукі пераканаліся ў маёй праваце...»*

Яе падпольную дзейнасць у якасці рэдактара пацвярджаюць актыўныя падпольшчыкі: Варвара Мацюшка, Марыя Осіпава, Генадзь Будай, Васіль Сайчык і іншыя. «Рашэнне аб зацвярджэнні Савіцкай рэдактарам адбылося ў маі 1942 года на маёй падпольнай кватэры па вуліцы Дабралюбава», — сведчыць Варвара Мацюшка. Дакументальных крыніц, якія пацвярджалі б гэта, няма. Затое ёсць выказванне яшчэ аднаго падпольшчыка, які кажа пра тое, што «ў сувязі з разгромам ГК КП(б)Б восенню 1942 года большай частцы людзей удалося выратавацца. Выратавалася і рэдактар падпольнай газеты Савіцкая».

— Ад Нікіфарава я ведала, што Тамара (падпольная мянушка Савіцкай. — **Аўт.**) з'яўляецца рэдактарам газеты «Звязда», — успамінала Герой Савецкага Саюза Марыя Осіпава. — Аб гэтым чалавеку, як аб рэдактары, Нікіфараў вельмі цёпла адзываўся. Я і ведала яе як рэдактара газеты. Гэты факт быў яшчэ пацверджаны пры маёй сустрэчы з Нікіфаравым і Коцікавым (таксама падпольшчык. — **Аўт.**) на бетонным мосце ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1942 года. Размова ішла і пра Казачонка, якога я не ведала. Нікіфараў сказаў, што ён, падлюга, доўгі час нічога не рабіў. Варыць мыла, спекулюе ім, збірае грошы і лезе зараз у кіраўніцтва друку. Тамара з работай рэдактара спраўляецца, і мяняць яе няма ніякага сэнсу.

Але ў пэўных колах жанчыну не прызнавалі рэдактарам падпольнай газеты. Вось што дырэктар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ Іларыён Ігнаценка пісаў сакратару ЦК КПБ Аляксандру Кузьміну: *«У пачатку 60-х гадоў у В. С. Давыдавай склалася іншая думка. Яна мяркуе, што рэдактарамі «Звязды» былі Казачонак, Карпусенка і Савіцкая. Такі вывад быў зроблены на падставе заключэння экспертызы матэрыялаў аднаго з нумароў газеты. Вывучэнне акта экспертызы ад 19 мая 1961 года паказала, што гэты дакумент не можа служыць падставай для вырашэння пытання аб рэдактары газеты «Звязда». Экспертызе падвяргаліся перапісаныя адрэдагаваныя матэрыялы для набору. Экспертыза пацвердзіла, што гэтыя матэрыялы перапісаны рукой Савіцкай, Казачонка, Карпусенкі і дзвюх іншых асоб, прозвішчы якіх не ўсталяваны. Для адказу на пытанне аб рэдактары трэба было даследаваць матэрыял, які рэдагаваўся, з рэдактарскай праўкай. Але гэтых матэрыялаў у архіве няма».*

Па словах Настассі Карпусенкі, яна была ў газеце літсупрацоўнікам і на рэдактарства ніколі не прэтэндавала. Казачонка яна бачыла адзін раз у Савіцкай, калі Нікіфараў размяркоўваў абавязкі. «У маі мне прапанавалі працаваць у падпольнай газеце «Звязда», — успамінала Настасся Апанасаўна. — У выпуску першага нумара газеты я не ўдзельнічала, але з другога нумара я працавала з Савіцкай. Я не помню, каб нам хто-небудзь дапамагаў. І Казачонка я там не бачыла».

У той жа час яшчэ адзін супрацоўнік падпольнай газеты — наборшчык Хасан Александровіч — наконт функцыі Савіцкай у «Звяздзе» меў іншае меркаванне. Вось што ён пісаў у сваёй аўтабіяграфіі пасля вайны: *«Мне не ясна, чаму таварыша Савіцкую лічаць рэдактарам падпольнай газеты. Не зразумела, чаму прыпісваюць ёй актыўную, вядучую ролю ў арганізацыі тыпаграфіі і газеты з першага па пяты нумары. Гэта абсалютна няправільна і несправядліва. Як можна лічыць сябе рэдактарам і не бачыць звярстанай газеты, не чытаючы гранак, вёрсткі, не ўдзельнічаць у распаўсюджванні матэрыялу, не бываючы і не ведаючы, хто робіць і дзе робіцца газета. Яна нават не ведала, дзе набіралася газета. Мне здаецца, што працавалі ўсе, была і рэдкалегія, але навошта Савіцкую вылучаць, а іншых заціраць? Працавалі калектыўна, і калектыў трэба паказваць. Праўда, Савіцкая арганізоўвала матэрыял і апрацоўвала яго. Калі яна была сапраўды зацверджана рэдактарам, то чаму таварыш Савіцкая не адчувала ніякай адказнасці за даручаную ёй справу, за палітычны бок газеты, за яе своечасовы выхад, не цікавілася як рэдактар, а перадаверыла гэтую работу іншым?»*


Ядвіга САВІЦКАЯ.

Вось як сама Савіцкая каментавала сітуацыю, якая склалася вакол яе персоны: «Памылка мая заключалася ў тым, што я пазбягала пісаць аб падпольнай рабоце. Меркаванне аб тым, што Мінскі падпольны гаркам быў гестапаўскім, адбіла ахвоту пісаць аб сваёй падпольнай дзейнасці не толькі ў мяне, але і ў многіх падпольшчыкаў. Тым больш, што будучы ў брыгадзе імя Варашылава, я знаходзілася на валаску ад смерці за гэтае падполле».

Пасля таго як у верасні 1942 года арыштавалі журналістаў-падпольшчыкаў, Ядвіга Міхайлаўна пайшла ў партызанскі атрад. Працавала ў партызанскіх газетах «Патрыёт Радзімы» і «Калгаснік Капыльшчыны». Са жніўня 1943 па май 1944 года з'яўлялася намеснікам рэдактара газеты «Белорусская правда» Беластоцкага падпольнага абкама КПБ. Была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі «Партызану Айчыннай вайны», «За Перамогу над Германіяй» і іншымі.

Камісія па ўстанаўленні і прызнанні ўдзельнікаў Мінскага партыйнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны пастанавіла «лічыць устаноўленым, што таварыш Савіцкая рыхтавала артыкулы і рэдагавала 2-гі, 3-ці і 4-ты нумар газеты «Звязда», органа Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б». Пра тое, што Ядвіга Савіцкая была рэдактарам газеты ў гады Вялікай Айчыннай вайны — там ні слова. Можа, таму, што ім быў Нікіфараў?..

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Гардэроб

# АДДАЦЬ ЗАРОБАК НА ПАЛІТО

## Пачым рэчы ад беларускіх дызайнераў?

**Шэсць тысяч рублёў. Столькі каштуе маленькая чорная сукенка ад Valentino, якая абавязкова павінна быць у гардэробе кожнай жанчыны. Сказаць «сціпла, але з густам» язык не паварочваецца. Беларуская мода, вядома, маладзейшая за дом Valentino, але, як той казаў, дызайнерскія рэчы таннымі не бываюць. Мы схадзілі на Вялікі модны маркет і паглядзелі, што цікавага прадаюць нашы мадэльеры і за колькі можна набыць эксклюзіў.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Шарсцяная камізэлька ад дызайнера Леора Гофмана за 390 рублёў.

### Зніжкі 40 працэнтаў

На кірмашы дызайнерскіх рэчаў заўсёды можна знайсці адзенне з апошніх модных паказаў. Напрыклад, калекцыю Леора Гофмана ў стылі сафары. Баваўняная кашуля з трапічным прынтам каштуе 140 рублёў, чорная сукенка з аплікацыяй у выглядзе кошкі — 340. А калі дадаць яшчэ 50, можна набыць пясочную шарсцяную камізэльку — незаменная рэч, калі ў вас на працы пераважае дзелавы дрэс-код.

— Хіты продажаў — гэта спадніцы з кошкамі, шэрыя шарсцяныя касцюмы, блузы з бантам, — расказвае дызайнер.

Пытаемся пра зніжкі. Леор Гофман адказвае, што яны ёсць. Для пастаянных пакупнікоў — ад 5 да 15 працэнтаў. Як і любы нармальны брэнд, мадэльер ладзіць сезонныя распродажы — там зніжкі значна большыя.

У дызайнера Анастасіі Мірановіч рэчы з мінулых калекцый можна набыць са зніжкай 40 працэнтаў. Так, шарсцяныя штаны са «стрэлкай» патаннелі са



Беларускія модніцы гатовы плаціць за эксклюзіў.

120 рублёў да 75. Амаль па такім жа кошце штаны прадае айчынны леграм.

Адзенне з новай калекцыі, вядома, даражэйшае. Сукенкі розных расфарбовак (цёмна-смарагдавая, сіняя, у клетку і «гусіную лапку») — па 150 рублёў, доўгія паліто — амаль па 650. Анастасія — фанат канструявання, таму кашулі ў яе з незвычайным каўнерыкам. Але і цана за такі эксклюзіў — 165 рублёў.

**Цікавая знаходка — паліто ў камплекце з трыкатажнай гарлавінай. Калі вы не любіце падбіраць шалікі і маеце ў кашальку лішнія паўтысячы, гэта рэч якраз для вас.**

— У кожнай калекцыі мусіць быць утульная рэч. Тут гэта джэмпер з фігурнай спінкай. Памацайце, які мяккі. Гэта італьянская воўна, — паказвае нам навінку дызайнер і дадае, што ў асноўным выкарыстоўвае для пашыву тканіны з Італіі і Германіі.

Памеры — ад 40-га да 46-га. Для жанчын у целе, як заўсёды, нічога няма.

Малады брэнд Zibra пышак таксама не песціць: памерны рад — ад XS да M.

— «Эльку» (памер 1, або 48—50. — **Аўт.**) мы звычайна шыем на заказ, каб улічыць усе нюансы поўнай фігуры, — тлумачыць адна з дызайнераў маркі Аляксандра Жук.

У сваіх калекцыях Zibra спалучае класіку і спорт і арыентуецца хутчэй на дзяўчат. Нам спадабаліся прамыя трыкатажныя сукенкі з ручной вышыўкай за 150 рублёў (калі правільна падабраць абутак і аксесуары, такую сукенку можна апранаць з любой нагоды) і шэрае свабоднае паліто, падобнае на кімано, за 440 рублёў. Брэнд, дарэчы, кожную зіму выпускае яшчэ і вязаныя шапкі. Сёлетнія прадаюцца па 45 рублёў.

Калекцыю, якую вясной прэзентавалі на подыуме, прадае і Юлія Бабій. Цікавая знаходка — паліто ў камплекце з трыкатажнай гарлавінай. Калі вы не любіце падбіраць шалікі і маеце ў кашальку лішнія паўтысячы, гэта рэч якраз для вас.

### Для жанчын з гумарам

Прыглядаемся да аксесуараў. Дызайнер Макс Міронаў прадае сумкі ў стылі «нічога лішняга». Форма падкупляе, але кошт вяртае на зямлю. Светла-ружовы ранец і сіняя сумка на плячо з ручкай-касічкай (адна з «фішак» дызайнера) прадаюцца па 400 рублёў. А за суму, роўную заробку экскурсавода ў Хойніках (260 рублёў), можна набыць ярка-чырвоную міні-сумачку з лакавай скуры.

Тым, хто хоча выглядаць арыгінальна, беларускія дызайнеры прапануюць... драўляны клатч. Насамрэч ён зроблены са скуры, якая зверху абабіта шпонам. Нягледзячы на незвычайны матэрыял, рэч функцыянальная: тэлефон і памада (а што яшчэ трэба, калі збіраешся на выхад з такім клатчам?) дакладна змесцяцца. Цана пытання — 350 рублёў.

На адным са стэндаў знаходзім стыльны зімовы варыянт сумкі — са скуры і футра поні. Лаканічны дызайн, з упрыгажэннямі — толькі кутасік на маланцы. «Ucepleniya» сумкі прадаюцца ў бэжавым, вішнёвым, цёмна-зялёным і сінім колерах. Аддадуць за 300 рублёў. Пасля знаёмства з цэннікамі іншых творцаў, здаецца, не так і шмат.

Упрыгажэннямі здзівіць складана. Цяпер на кірмашах чаго толькі не ўбачыш: і каваныя бранзалеты, і завушніцы з пялёсткаў кветак у ювелірнай смале. Нашу ж увагу прыцягнулі брошкі «Чыкулі» Таццяны Саковіч. Буйныя ўпрыгажэнні ў выглядзе дзяўчат-модніц можна доўга разглядаць: для кожнай такой лялькі памерам з далонь дызайнер стварае арыгінальную пару туфляў, шые адзенне і падбірае аксесуары (акуляры, сумачку і нават памаду). Мы губляемся: пад што насіць гэтыя яркія «чыкулі»?

— Трэба адважыцца прычапіць адзін раз, і гэта брошка будзе пад усё, — раскрывае сакрэт Таццяна Саковіч.

Такое ўпрыгажэнне, здаецца, павінна быць даспадобы дзяўчатам, але, кажа дызайнер, яго заказваюць жанчыны рознага ўзросту. Нават дамы за 50. Галоўнае — мець пачуццё гумару.

Таццяна тлумачыць, што цана брошкі — 80—90 рублёў — абумоўлена дарагімі матэрыяламі: вочы лялек — з камянёў Сваровскі, адзенне — з натуральнай скуры. Дый часу на выраб такой «чыкулі» ідзе шмат — адны толькі валасы з пластыку ўкладваюцца тры гадзіны. Але за эксклюзіўную беларускія модніцы гатовы плаціць. Заказы на брошкі распісаны да снежня.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*



Упрыгажэнні на любы густ і кашалёк.

■ Зачапіла




**С. ЯСКЕВІЧ.**

### «ПРЫМУСАМ НІКОГА НЕ АШЧАСЛІВІШ»

*(«Звязда» ад 21 кастрычніка)*

— Я, можна сказаць, чытаў гэты матэрыял разам з праглядам перадачы Брэсцкай студыі тэлебачання пра сям'ю з Жабінкаўскага раёна, якая жыла ў XIX стагоддзі. У сям'і было шасцёра сыноў, адзін з іх нават стаў дэпутатам Расійскай Думы, другі — навукоўцам. Першая думка была: а каб тая маці не захацела так многа дзяцей, не нарадзіўся б вучоны альбо дзяржаўны дзеяч.

Але не ўсё так проста, і нельга наш час параўноўваць з ранейшым. Тады асноўная роля жанчыны заключалася ў тым, каб нараджаць і выхоўваць. Цяпер усё памянялася, а мы хочам, каб жанчына і працавала, і нараджала многа. Шмат гаворым аб неабходнасці паднясці прэстыж сям'і, пра тое, каб шматдзетнасць зрабіць моднай. А на справе гады дэкрэтнага водпуску выкінулі са спісу, па якім будуць налічвацца пенсійныя выплаты. Такім чынам, бяздзетная ці маладзетная равесніца будзе выглядаць матэрыяльна нашмат больш упэўнена, чым шматдзетная пенсіянерка. Таму вельмі ўзважана трэба падыходзіць да стымулявання нараджальнасці. А дзеці заўсёды павінны быць жаданымі.

**Аркадзь Барысавіч**, *г. Брэст.*

**В. КАНЮТА.**

### «ІВАН З БЕЛАРУСІ»

*(«Звязда» ад 21 кастрычніка)*



— Прачытаў не адну кнігу пісьменніка. Колькі глыбіні ў часам вельмі простых вершаваных радках Івана Муравейкі! Дзіва ці не, а, як некалі прызнаўся сам майстар, пішуцца яны ў яго на хаду.

Але, нягледзячы на свой талент, я нават сказаў бы, Божы дар, Іван Андрэевіч вельмі сціплы чалавек. Яму ніколі не трэба было спецыяльных пакояў і ўмоў для творчасці, не меў ён, так бы мовіць, і сваіх людзей у сталічных выдавецтвах. Проста пісаў, піша, і шчасце, што сказанае ім даходзіць да чытача.

Толькі мне асабіста вельмі крыўдна, што і дагэтуль у Івана Муравейкі няма звання народнага пісьменніка Беларусі. Не кожны майстар слова здолеў дажыць да такога ўзросту. Прычым не проста фізічна, але і дажыць як пісьменнік — бо ён творыць і да гэтага часу. Думаю, для чалавека, які столькі зрабіў для айчыннай літаратуры, самым лепшым падарункам было б пісьменніцкае званне. Хоць для многіх ён даўно ўжо народны...

**Міхась**, *г. Мінск.*

**М. ВЕСЯЛУХА.**

### «ГІСТОРЫЯ ЯЕ ДУШЫ»

*(«Звязда» ад 22 кастрычніка)*

— Вельмі цікавая размова пра даўно чаканую кнігу. Гутарка двух таленавітых людзей спалучае аповед пра не зусім звычайнае выданне збору твораў і пра незвычайны лёс паэткі, якая маланкай празіхацела на небасхіле беларускай літаратуры. Думаю, мы атрымалі вельмі цікавы першы том збору твораў, дзе звесткі прадстаўленыя ў фармаце, дагэтуль не шырока распаўсюджаным у выдавецкай практыцы. Такі падыход — калі разам, побач падаць твор і крытычны роздум пра яго — дае магчымасць чытачу глыбей адчуць аўтара. Размова журналіста і ўкладальніка, безумоўна, прыцягвае ўвагу найперш да кнігі! Я ўпэўнены, што, прачытаўшы гэты дыялог, чытачы абавязкова звернуцца да выдання.

**Марат Баскін**, *г. Нью-Ёрк, ЗША.*

**С. КУРКАЧ.**

### «ГАНДАЛЬ НЕ ЖАДАЕ ЗВЯРГАЦЬ ШКЛЯНОГА БОГА»

*(«Звязда» ад 25 кастрычніка)*



— Гандлёвыя сеткі, мабыць, у нас і сапраўды сур'ёзную вагу ў грамадстве маюць. Міліцыя яшчэ толькі пачала распрацоўваць нейкія там змены ва ўмовах гандлю алкаголем, а гандаль ужо пачынае палохаць нас усіх нейкім эканамічным апакаліпсісам. І цэны на прадукты яны павялічаць, і крэдыты банкам не аддадуць... І ўсё гэта ад таго, што гарэлку і піва перастануць прадаваць у кожным гандлёвым закутку? Няўжо магазіны такі сур'ёзны прыбытак ад алкаголю маюць? Калі гэта так, то трэба выпраўляць сітуацыю. Неабходна зрабіць так, каб «навар» ад алкагольнага гандлю быў мінімальны.

А яшчэ трэба абавязкова нешта рабіць з півам, з тым, дзе градус алкаголю больш за 4,5%. Такое моцнае піва стала папулярным у моладзі, бо яно і эфект алкагольны мае, і каштуе часам, як звычайнае. Гэта ж катастрофа, калі падобныя напоі нават школьнікі пачынаюць каштаваць. Але гандлёвыя сеткі не жадаюць «звяргаць шклянога бога», ім гэтыя «п'яныя» грошы нават не смярдзяць?

**Аніта Мазур**, *г. Мінск.*

— Барацьба з п'янствам у нас ужо была ў часы СССР. Вінаграднікі знішчалі, забаранялі прадаваць спіртное ў асобных жылых раёнах гарадоў і нават у некалькіх населеных пунктах, і шмат чаго яшчэ... Забараняць лёгка, а вось зрабіць так, каб людзі не злоўжывалі — тут цяжэй.

Мне здаецца, што трэба распрацаваць нейкую нацыянальную ідэю. Каб людзям было цікава некуды схадзіць, паўдзельнічаць у тых ці іншых масавых праектах. Алкаголю павінна быць нейкая замена. А адстойваць яшчэ адну чаргу ў краме я не жадаю.

**Леанід**, *г. Віцебск.*

## Айцец Аляксандр КУХТА:

# «ХРЫСЦІЯНІН — ГЭТА ТОЙ, ХТО СУМЛЕННА РОБІЦЬ СВАЮ СПРАВУ»

**Звычайна, каб ахарактарызаваць чалавека, мы перш за ўсё называем яго пасаду: «старшыня», «дырэктар», «загадчык», «галоўны...». Але радзей — заснавальнік. Чалавек, які меў ідэю і здолеў перанесці яе з уласных уяўленняў у рэчаіснасць. Аляксандр Кухта — 24-гадовы свяшчэннік Беларускай праваслаўнай царквы (служыць у пасёлку Міханавічы Мінскага раёна), першы і пакуль адзіны ў Беларусі святар-відэаблогер. Па вялікім рахунку, і на прасторы СНД таксама, бо тыя з бацюшак, хто спрабуе здымаць ролікі, робяць гэта выключна па-аматарску. Айцец Аляксандр праводзіць здымкі ў студыі, прафесійна апрацоўвае знятае і выкладвае на свой канал «Batushka ответит» у «YouTube». Яго ролікі за тры месяцы выхаду пабачылі тысячы гледачоў, напісаны сотні каментарыяў прыхільнікамі такой віртуальнай пропаведзі і яшчэ больш — праціўнікамі. Тым не менш ён не спыняецца і кожнаму злоснаму каментатару рады, «бо чалавек не застаўся абыякавым». У размове сам-насам айцец Аляксандр прызнаўся, што дзякуючы знятым відэа нарэшце стаў спаць спакойна...**



***— Адкуль з'явілася ідэя?***

— Паваротнага моманту не было. Каб прачнуўся раніцай і вырашыў: заўтра іду здымаць першы ролік. Думаў пра гэта яшчэ калі вучыўся ў семінарыі. На 2-3 курсе пісаў багаслоўска-папулярныя тэксты, арыентаваныя на равеснікаў, максімальна простыя і адкрытыя. Ідэя стварэння ролікаў існавала ў маёй галаве з моманту з'яўлення «YouTube». Глядзеў на тых, хто іх здымае, і разумеў, што і сам здольны зрабіць штосьці такога ж кшталту. Набыў сабе камеру і пачаў працаваць над першым ролікам. Здымаў яго вельмі доўга. Той, што ў выніку быў выкладзены, толькі 12 ці 13 версія ад першапачатковай. Перабіраў розныя планы, тэксты, эфекты, пераходы.

**«Атэістычны светапогляд дакладна трэба рушыць не сілай. Не законамі тыпу «Аб абразе пачуццяў вернікаў». Адзіны шлях — гэта калі кожны з нас будзе добра выконваць сваю справу, як і належыць хрысціяніну».**

***— І, як разумею, работа пачалася на чыстым энтузіязме.***

— І дагэтуль усё трымаецца на ім. Я ўкладваю досыць вялікую частку ўласных грошай у канал. На гэтым этапе ўжо зразумеў: кантэнту створана столькі, што варта пачынаць укладаць грошы ў рэкламу і распаўсюджваць ролікі на больш ці менш шырокую аўдыторыю. Гэта калі казаць пра глабальнае. Але існуе шмат дробязяў накшталт таго, што ты здымаешся ноччу да чатырох раніцы і думаеш: застацца спаць у студыі ці ехаць на таксі дадому? А дома не быў два дні. Ці калі перагарэла лямпачка, без якой здымаць не атрымаецца, а яна каштуе нямала... Таму грошай укладваецца шмат, а сіл і часу — яшчэ больш. Адзін ролік ад задумы да загрузкі на канал «YouTube» займае гадзін 8-10. Гэта не ўлічваючы затрачаны час на адказы ў каментарыях і мінімальную работу па прасоўванні ролікаў у інтэрнэце.

Мая мэтавая аўдыторыя — звычайны студэнт. Я не стаўлю сабе задачу ўсіх прыцягнуць у Царкву, бо разумею, што гэта немагчыма. Мая мэта — даць жыццё думцы аб тым, што хрысціянства значна больш складаная і цікавая з'ява, чым прынята пра гэта думаць. І яно не заключаецца ў гадзінніку Патрыярха, Pussy Riot і айцу Усеваладзе Чапліне.

***— Навошта вы гэта робіце?***

— Я адчуваю сябе на сваім месцы і такім чынам цалкам рэалізоўваюся як хрысціянін. Мне не сорамна, засынаючы ўвечары, думаць аб тым, як прайшоў дзень. І не сорамна перад Богам. Насамрэч, я вельмі лянівы і разгільдзяй *(смяёмся)*. Шмат у чым падчас работы над ролікамі даводзіцца сябе ламаць. А па рэакцыі людзей на іх бачу, што ім падабаецца, мэтавая аўдыторыя, на якую арыентаваўся, станоўча ці не вельмі, але адгукаецца. Крытыкі ў мой бок ідзе шмат, як і пахвал, парад. Галоўнае, што ёсць рэакцыя — станоўчая ці адмоўная. Чалавек не паленаваўся, каб напісаць каментарый. Значыць, гэта пакінула яго неабыякавым.

***— Як рэагуеце на крытыку?***

— Адзінае, за што чалавек можа пазбавіцца магчымасці пакідаць каментары пад маімі відэа — гэта прамая абраза Бога. Ёсць група людзей, якім моцна не падабаецца тое, што я раблю. Самі па сабе яны неблагія. Адзін з іх працуе фізікам у даследчым інстытуце ў Германіі. Другі — па жыцці філосаф. Калісьці мы разам з імі вучыліся. Ёсць наўпрост тролі. Яны шукаюць дробязі, да якіх можна прычапіцца і раздуць з іх вялікую праблему. І чым больш вострае пытанне, на якое я адказваю, тым цікавейшыя і больш непрадказальныя павароты думак такіх крытычных гледачоў. Таму з цягам часу стаў рабіць ролікі максімальна простыя, даступныя і зразумелыя.

***— Хто з сяброў, калег, блізкіх падтрымлівае ідэю?***

— З найбліжэйшага атачэння — усе. Вядома, жонцы не падабаецца, што мяне ніколі няма дома, каб элементарна ўбіць цвік у сцяну. Але з іншага боку, яна мяне ўсё ж такі падтрымлівае і нават можа ўчыніць маленькі хатні скандал, калі штосьці ў роліку ёй не спадабалася *(смяецца)*. Яна ж для маёй суполкі яшчэ і малюе коміксы. Таксама ў мяне ёсць дарагі, любімы настаўнік — айцец Сергій Цімашэнкаў, кіраўнік Сінадальнага місіянерскага аддзела Беларускай праваслаўнай царквы. У цэлым ён мяне разумее, дапамагае, вельмі мудра і мякка выпраўляе, калі трэба, за што яму шчыра ўдзячны.

***— Я ведаю, што ваша жонка таксама вядзе блог.***

— Ганна мае старонку ў сетцы «УКантакце» пад назвай «Балбатлівая жонка». Жартую, што з цягам часу мы аб'яднаемся і створым праект «Балбатлівы бацюшка адказа» *(смяецца)*. Цяпер увогуле ёсць тэндэнцыя, калі маладыя дзяўчаты ствараюць уласныя старонкі-блогі ў сацыяльных сетках, у якіх дзеляцца думкамі пра жыццё, пішуць невялікія па памерах апавяданні. Ганна часам саромеецца, што цяпер гэта стала ўсеагульнай модай і яна ў гэтай плыні.

***— Але кожны яе запіс — з іскрынкай, якую не адна мода не сапсуе. Калі разважаць адпаведна часу, то вы — маладая сям'я, якой, як і любой іншай, патрэбны перш за ўсё сродкі для існавання. А тут — ролікі, якія яшчэ і ўкладанняў патрабуюць.***

— Я — частка грамадства, якое на гэтым этапе падпарадкоўваецца ідэалогіі кансюмерызму (спажывальніцтва). І мае равеснікі таксама. Я разумею законы «YouTube» і ўсведамляю, што не змагу стварыць годны прадукт для тысяч людзей без укладання сродкаў. Я не хацеў гэта рабіць, але давялося размясціць даныя электроннага кашалька ў сваёй суполцы. Першыя грошы ад ананімуса ўжо паступілі (на жаль, даведацца, хто гэта, немагчыма). Усе яны пойдуць на рэкламу, якая дапаможа, спадзяюся, павялічыць аўдыторыю гледачоў у тры разы. Але з цягам часу, калі ўсё атрымаецца, зусім невялікі, але прыбытак з канала будзе, і я змагу прынесці яго дадому, паказаць жонцы і сказаць: «Тое, чым я займаюся, мае пэўны сэнс».

***— Што можа падштурхнуць сучаснага маладога чалавека стаць святаром?***

— З дзяцінства бацькі расказвалі, што на небе ёсць Той, хто ўважліва сочыць за тым, што мы робім. Таму трэба сябе добра паводзіць і ні ў якім разе не хваляваць маці. Хадзіў у нядзельную школу, якая дала не столькі веды, колькі светапогляд. Пасля 9 класаў выпадкова паступіў на фізмат ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта: пайшоў за кампанію з сябрам здаваць іспыты. Ужо ў той момант ведаў, што далей пайду ў Мінскую духоўную семінарыю. У выніку — шчыра рады, што ўсё склалася такім чынам. Бо ліцэй — гэта для Беларусі ўнікальная мадэль атрымання адукацыі, не ўніверсітэт і не школа.

Адзінае, што ад нас патрабавалі — гэта веды. Не мела значэння, колькі пар ты наведаў. Галоўнае, каб на іспыце адказы на ўсе пытанні былі дадзены. Для таго, каб гэтыя веды атрымаць, былі створаны ўсе ўмовы: цудоўныя выкладчыкі, любыя гурткі на выбар, усе даступныя ліцэю інтэрактыўныя сродкі, дадатковыя заняткі, калі неабходна. На любую кафедру можна было зайсці і сказаць: «Добры дзень! У мяне ёсць пытанні па прадмеце». І выкладчык абавязкова адшукае час і магчымасць з табой пазаймацца. У калідорах на перапынках гучала музыка кшталту NRM ці Ляпіса Трубяцкога. Там жа стаялі тэнісныя сталы. У ліцэі вучань — гэта асоба, якая мае свабоду і якую ўсе, безумоўна, паважаюць.

***— На гэты момант як увогуле прадстаўлена праваслаўе ў інтэрнэце і сацыяльных сетках?***

— Цяпер праз «Google» можна адшукаць адказы на любыя пытанні. Адзінае — давядзецца прайсці праз тоны смецця, перш чым адшукаць ісціну. Адпаведна, інфармацыю з сеціва трэба абавязкова фільтраваць, і ў дачыненні да пытанняў веры таксама. Што тычыцца сетак, то ствараць суполкі для праваслаўных трэба, няхай напачатку з хібамі і памылкамі, але праз гэта вучыцца напаўняць іх правільна. Бо інтэрнэт — гэта эфектыўны інструмент, з дапамогай якога можна прабіцца да свядомасці паствы. Лепшага інструмента я не ведаю.

Існуюць два віды груп пра праваслаўе ў сацыяльных сетках. Першы змяшчае цытаты святых айцоў, другі — дужа малакалькасны, які ў пэўным сэнсе выконвае місіянерскую функцыю — «Абражаны веруючы», «Менш пекла». У іх аўтары (у кожным выпадку гэта адзін чалавек, мужчына і дзяўчына адпаведна) пішуць невялікія тэксты на тэму веры. Гэта месца, дзе ў віртуальнай прасторы могуць гутарыць людзі веруючыя і не. Таксама я разумею, што мой «You Tube» канал служыць, як і другая група гэтых суполак, пакуль маленькай, тонкай, амаль незаўважнай падушкай, у якую выліваецца негатыў з боку грамадства ў адрас Царквы. Пішуць мне, «які ж ты дрэнны поп», я не спрачаюся, моўчкі пагаджаюся.

**«Вядома, жонцы не падабаецца, што мяне ніколі няма дома, каб элементарна ўбіць цвік у сцяну. Але з іншага боку, яна мяне ўсё ж такі падтрымлівае і нават можа ўчыніць маленькі хатні скандал, калі штосьці ў роліку ёй не спадабалася».**

***— Сёння нярэдкая з'ява «намінатыўнага» праваслаўя, калі чалавек лічыць сябе вернікам, але па факце ім не з'яўляецца і мае погляды, процілеглыя рэлігійным. Як прапануеце гэта змяніць?***

— Атэістычны светапогляд дакладна трэба рушыць не сілай. Не законамі тыпу «Аб абразе пачуццяў вернікаў». Адзіны шлях — гэта калі кожны з нас будзе добра выконваць сваю справу, як і належыць хрысціяніну. Гэта і ёсць нармальнае, здаровае хрысціянства. Яно заклікае нас да асэнсаванасці свайго жыцця, калі шчыра прызнаешся сабе самому, у што верыш і чаму. І ў гэтыя хвіліны шчырасці перад сабой галоўнае пытанне: у якой ступені я хрысціянін? І калі мы зразумеем, наколькі адпавядаем ці не евангельскаму вобразу, убачым уласныя недахопы і пачнём змяняцца ў бок дасканаласці, тады і грамадства будзе рухацца ў лепшы бок.

**Веранiка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

**Бацюшка ў сваіх роліках адказвае на пытанні гледачоў вельмі сцісла (4-6 хвілін). Некаторыя з адказаў на самыя папулярныя з іх:**

**Пра Царкву і грошы**

*«У савецкія часы падатак на зарплату праваслаўнага святара складаў 200, а тое і 300%. Таму некаторыя з іх вымушаны былі браць грошы «ў кішэню». Часы прайшлі, а ўклад месцамі застаўся. Па шчырасці, грошы зямной часткі Царквы патрэбны, бо гэта неад'емная частка нашага жыцця. Рука, якая дае грошы Царкве, можа быць, але толькі з адным надпісам — «добраахвотна». Калі ў вас няма магчымасці ахвяраваць, ніхто ў храме не мае права ў вас патрабаваць грошы. Малітва і благадаць не разменьваюцца на манеты і банкноты. Але як утрымліваць храм, не маючы на тое сродкаў?»*

**Бог існуе?**

*«Навуковага доказу існавання Бога няма. Бо калі б ён быў, тады гэта быў бы жалезны аргумент «супраць» атэістаў. І пытання не паўставала б. Я, як і большасць хрысціян, не лічу, што Бог — гэта барадаты мужчына, які сядзіць на аблоках. Калі ён і ёсць, то існуе за межамі сусвету. Інакш бы мы яго вылічылі з дапамогай фізікі. А пасля пачалі шукаць спосабы дамовіцца і падмануць... Бог прыходзіць толькі да тых, хто здольны яго прыняць. Ён не навязваецца і не праяўляе гвалт. Але адназначна даказаць існаванне хрысціянскага Бога немагчыма, як бы мы ні імкнуліся».*

**Стаўленне да абортаў**

*«З пункту гледжання хрысціянскай філасофіі, тое, што можа стаць чалавекам — ужо чалавек. Няхай гаворка ідзе пра маленькую зіготу, якая толькі з'явілася ў маці. Але хрысціяне лічаць, што ўмешвацца ў працэс развіцця новага чалавека няправільна. Тое, што павінна стаць чалавекам — ужо валодае ўсімі яго правамі. Калі кіравацца логікай тых, хто выступае за аборты, трэба забіць усіх, хто насяляе турмы, бо яны ядуць хлеб за кошт падаткаплацельшчыкаў, перастаць дапамагаць інвалідам і ўвогуле інваліднасць забараніць. І я не магу зразумець, чаму лянота перамагае чалавечнасць...»*



**Ганна, жонка айца Аляксандра, скончыла Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт і цяпер працуе выкладчыкам англійскай мовы ў школе. Фота зроблена на семінары «Місія і міласэрнасць», у арганізацыі якога дапамагаюць сужэнцы.**

Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў
ФАРПОСТ СПАКОЮ
№ 11 (29)

■ Профі

# ЗАЎСЁДЫ НА ДЗЯЖУРСТВЕ

## Да міліцыянераў сталічнага палка ППСМ — асаблівыя патрабаванні

**У палка патрульна-паставой службы міліцыі (ППСМ) ГУУС Мінгарвыканкама асаблівае прызначэнне — яго міліцыянеры часцяком першымі ўстаюць на абарону жыцця і здароўя грамадзян у самых складаных жыццёвых сітуацыях. Пры гэтым на прыняцце рашэнняў ім застаюцца долі секунды, а самі канфліктныя сітуацыі патрабуюць фізічнай дасканаласці, прафесійнай вывучкі і ўменняў імгненна арыентавацца і правільна дзейнічаць.**
**Хто ж ён сёння, міліцыянер палка патрульна-паставой службы сталіцы?**
**Пра гэта мы запыталіся ў начальніка ГУУС Мінгарвыканкама генерал-маёра міліцыі Аляксандра БАРСУКОВА.**

***— Аляксандр Пятровіч, пытанне як да былога камандзіра палка ППСМ сталічнай міліцыі: які ён, сённяшні міліцыянер гэтага падраздзялення?***

— Я пачынаў сваю службу ў 1985 годзе з пасады міліцыянера палка ППСМ Гомеля. Скажу так: у першую чаргу міліцыянер палка ППСМ — гэта фізічна дужы, уважлівы, кемлівы і чулы да чужога болю супрацоўнік органаў унутраных спраў. Некаторыя пампалкова лічаць гэтую службу не самай элітнай і вельмі памыляюцца. Менавіта служба ў ППСМ дае пуцёўку ў далейшае міліцэйскае жыццё, адкрывае кар'ерныя перспектывы перад тымі, хто доблесна вытрымаў будні ў гэтым «нялёгкім» падраздзяленні. Чаму «нялёгкім»? Адказ на гэтае пытанне крыецца ў назве — «патрульная» і «паставая» служба. Гэта значыць, што, нягледзячы на якія б там ні было аб'ектыўныя ці суб'ектыўныя прычыны асабістага характару, міліцыянер палка ППСМ нясе службу, не выбіраючы складанасць пастаўленай задачы. Здарылася бяда — ён абавязаны своечасова прыняць усе меры, каб ліквідаваць канфліктную сітуацыю і пазбегнуць ахвяр. Часам гэтыя супрацоўнікі аказваюцца ў вельмі складаных умовах, калі няма часу на пошук аптымальнага рашэння і прыходзіцца дзейнічаць інтуітыўна. Менавіта гэтая акалічнасць і вылучае сапраўднага міліцыянера, загартоўвае яго, дае багаты жыццёвы вопыт.

> **«Праца многіх іншых падраздзяленняў органаў унутраных спраў, як правіла, не кідаецца ў вочы. Менавіта таму ў большасці мінчан меркаванне аб міліцыі ў цэлым асноўваецца на дзейнасці патрульна-паставой службы».**

***— Сталіца — асаблівы горад ва ўсіх адносінах. Як складаецца аператыўная абстаноўка ў ім і які ўплыў на яе з боку супрацоўнікаў палка ППСМ?***

— Безумоўна, Мінск адрозніваецца асаблівым рытмам жыцця. Тут праходзяць найбольш важныя спартыўныя, масавыя, культурна-відовішчныя мерапрыемствы. На ўсіх іх да аховы правапарадку прыцягваюцца і супрацоўнікі палка ППСМ. І крымінагенная карціна тут некалькі іншая, не тая, што ў абласных і раённых цэнтрах. З пачатку года асабовым складам палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама раскрыта каля 540 злачынстваў, з іх 7 забойстваў, 22 цяжкія цялесныя пашкоджанні, 70 крадзяжоў, 30 рабаванняў і гэтак далей. Таксама раскрыта 170 злачынстваў, учыненых у грамадскіх месцах. Затрымана больш за 300 уцекачоў, якія знаходзіліся ў вышуку.



За адміністрацыйныя правапарушэнні было затрымана каля 37 тысяч мінчан. З іх за дробнае хуліганства — звыш 5,2 тысячы чалавек, а вось 25 тысяч — па «алкагольных» матывах: альбо за распіццё спіртнога ў неналежных месцах, альбо за знаходжанне ў нецвярозым стане ў грамадскім месцы. Сумна, што 350 з іх — непаўналетнія. У спецыялізаваны ізалятар (медвыцвярэзнік) дастаўлены звыш 2,2 тысячы чалавек.

***— У якіх умовах нясуць службу сённяшнія супрацоўнікі палка ППСМ? Што змянілася ў плане матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння з тых часоў, калі вы ўзначальвалі падраздзяленне?***

— Наватпараўноўваць не прыходзіцца! Сёння аснашчэнне патрульнага міліцыянера цалкам адпавядае патрабаванням часу. Поўнасцю змяніўся аўтапарк палка, ён даўкамплектаваны новай аўтатэхнікай. Бо службовы аўтамабіль павінен без праблем перасоўвацца як у гарадскіх умовах, так і па перасечанай мясцовасці, быць манеўраным і ёмістым, у меру магутным і пры гэтым эканомны. Гісторыя паказала, што лепш за «УАЗ» аўтамабіля для нас няма. Ужо з гэтага года заводвытворца пастаўляе ўдасканаленыя мадэлі з бяспечнымі адсекамі для затрыманых.

Цяпер міліцыянерам вельмі істотна дапамагаюць несці паспяховую службу комплексы радыёсувязі стандарту DMR. Яны забяспечваюць абароненую беспераоойную сувязь. Да таго ж гэта дазваляе дзяжурнаму эфектыўна кіраваць нарадамі, яны адлюстроўваюцца на маніторы. Дзяжурны бачыць, які з іх знаходзіцца бліжэй да месца падзей, і накіроўвае туды менавіта яго, што дазваляе сэканоміць каштоўныя хвіліны.

Планамерна забяспечваем пешыя патрулі відэарэгістратарамі. Працэс відэазапісу сам па сабе працвярэзвае не ў меру разгараčаных правапарушальнікаў. А зафіксаваная на відэа падзея дазваляе зрабіць адназначную выснову не толькі аб паводзінах апанента, але і аб правамернасці прымянення да яго фізічнай сілы або спецсродкаў.

З поспехам выкарыстоўваюцца і электронныя мабільныя планшэты. Яны наўпрост падключаны да баз даных, што дазваляе супрацоўніку палка ППСМ у лічаныя хвіліны даведацца ўсю неабходную інфармацыю пра чалавека. Магчымасці гэтых прылад дапамагаюць таксама карыстацца паслугамі сістэмы навігацыі, даведачных даных.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць будучы супрацоўнік палка ППСМ?***

— Кандыдат павінен быць фізічна моцным, кемлівым, уважлівым да дэталяў. Перавага аддаецца юнакам, якія прайшлі школу арміі. Кандыдатаў чакае дасканалае вывучэнне асобы, фізічнай формы і маральнай адпаведнасці патрабаваным навыкам. Потым — самая скрупулёзная медыцынская праверка, тэсціраванне, праверка на «дэтэктары хлусні». Пра асаблівасці прыёму на службу міліцыянерам палка ППСМ можна даведацца па тэлефоне 270-22-94 або па адрасе: вуліца Сямашкі, 15а, кабінет 5.

Напрыканцы хацеў бы дадаць, што аб дзейнасці міліцыі большасць грамадзян робіць вывады менавіта па рабоце міліцыянера палка ППСМ, бо праца многіх іншых падраздзяленняў органаў унутраных спраў, як правіла, не кідаецца ў вочы. Менавіта таму ў большасці мінчан меркаванне аб міліцыі ў цэлым асноўваецца на дзейнасці патрульна-паставой службы, якая нясе кругласутачнае дзяжурства па ахове правапарадку. Хачу пажадаць міліцыянерам спраўляцца з гэтай місіяй паспяхова, забяспечваючы парадак на вуліцах нашых гарадоў. Бо ППСМ — самая блізкая людзям, самая прыземленая і неабходная, але пры гэтым і, напэўна, самая цяжкая служба ў шэрагу іншых.

**Аляксандр ЛАСТОЎСКІ**

■ Ракурс

# ПРАВААХОЎНІК ЯК СІМВАЛ ДАБРАБЫТУ КРАІНЫ

## Падведзены вынікі конкурсу да 100-годдзя беларускай міліцыі

**Юбілей МУС адзначыць толькі ў сакавіку, аднак маштабная падрыхтоўка да падзеі пачалася нашмат раней. Некалькі месяцаў таму быў аб'яўлены конкурс на лепшыя літаратурныя, мастацкія і музычныя творы аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь.**

Усяго намінацый 7: дзіцячы малюнак, твор выяўленчага мастацтва, фотаработа, плакат, літаратурна-мастацкі і паэтычны твор, песня. Ніякіх узроставых або прафесійных абмежаванняў ва ўдзельнікаў не было, акрамя адной намінацыі — дзіцячы малюнак: яго маглі прадставіць на суд журы толькі юныя мастакі да 15 гадоў. Адсюль і разнастайнасць творчых падыходаў. Толькі ў катэгорыі выяўленчага мастацтва — больш за 800 работ. Членам журы, якія сабраліся ў Нацыянальнай бібліятэцы, каб вызначыць пераможцаў, рашэнне далося нялёгка. Дарэчы, месца пасяджэння было выбрана нездарма: тут праводзілася выстава лепшых работ.

У журы, акрамя прадстаўнікоў міліцэйскага ведамства, — вядомыя дзеячы беларускай культуры: генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Уладзімір Пракапцоў, начальнік сектара рэкламы ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Іна Гаўрыльчык, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў, член грамадскага савета пры МУС Аляксандр Дранец, загадчык аддзела фотаілюстрацый газеты «Звязда» Анатоль Кляшчук, дацэнт інстытута журналістыкі БДУ Кацярына Гуртавая.

Як адзначыў дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі, член грамадскага савета пры МУС Раман Матульскі, які ацэньваў літаратурна-мастацкія творы, аднак азнаёміўся і з выставай карцін і малюнкаў, конкурс накіраваны на ўмацаванне ўзаемаразумення паміж грамадствам і органамі ўнутраных спраў. Гэта вельмі важна, бо міліцыя эфектыўна працуе толькі пры падтрымцы большасці грамадзян. Спакой у краіне пануе ў выпадку, калі ўсе падзяляюць агульныя каштоўнасці і імкнуцца да адзіных мэт. І конкурс — выдатны паказчык настрою ў грамадстве. Па словах дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі, яго ўразіла разнастайнасць тэм, якія закранаюцца. «На малюнках пераважаюць добрыя, светлыя матывы. Адразу становіцца відавочным сэнс работы міліцыі, дзеля чаго ўсё гэта». Уладзімір Пракапцоў падкрэсліў унікальнасць выпадку спалучэння такой сур'ёзнай тэмы, гістарычнага кантэксту і творчага падыходу, які ўразіў нават спрактыкаваных у гэтым пытанні членаў журы.

На мастацкіх творах — вехі гісторыі, гераічныя ўчынкі, штодзённыя абавязкі і, самае галоўнае, мірная краіна. Напярэдзе ў іх — тэматычныя выставы, а лепшыя малюнкі ў хуткім часе нават з'явяцца на білбордах. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў адбудзецца 11 лістапада ў Палацы культуры прафсаюзаў.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

**Пераможцы конкурсу**

**Плакат — УУС Мінскага аблвыканкама (1).**
**Дзіцячы малюнак — Аляксей Матысік, 14 гадоў, г.п. Вялікая Бераставіца (2).**
**Твор выяўленчага мастацтва — Андрэй Шугай, г. Кобрын (3).**
**Фотаработа — Сяргей Марозаў, г. Гродна.**









■ Сітуацыя

# «ЧАКАЦЬ ТРЫ ДНІ — ГЭТА МІФ!»

## Што рабіць, калі знік чалавек?

**Галоўнае, што ў дадзеным выпадку варта запомніць усім грамадзянам нашай рэспублікі: супрацоўнікі міліцыі неадкладна шукаюць кожнага зніклага, незалежна ад яго ўзросту, сацыяльнага статусу таго, хто звярнуўся з заявай, і колькі прайшло часу з моманту знікнення. Пра тое, як, не паддаючыся серыяльным стэрэатыпам, варта дзейнічаць у такой сітуацыі, расказаў начальнік галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі МУС Анатоль САКОВІЧ.**

— У гэтай справе ёсць два галоўныя правілы: аператыўнасць і пэўнасць. Нават у савецкі час не трэба было чакаць, пакуль пройдзе нейкі вызначаны перыяд для пачатку пошукаў, так што «славутыя» тры дні — гэта абсалютны міф. Калі ваш блізкі чалавек знік, не цягніце — звяртайцеся ў міліцыю. Да гэтага можна, на ўсялякі выпадак, патэлефанаваць у Бюро рэгістрацыі няшчасных выпадкаў, у якім ёсць інфармацыя аб усіх асобах, якія трапілі ў розныя медыцынскія ўстановы, — расказаў Анатоль Саковіч. — Супрацоўнікам міліцыі трэба паведаміць усю вядомую вам інфармацыю: тэлефонныя нумары, акаўнты ў сацыяльных сетках, адрасы, па якіх чалавек можа знаходзіцца, кантакты асоб, якія ўваходзяць у яго бліжэйшы круг. Тое, што вам здаецца нязначнай дэталлю, можа дапамагчы прафесіяналам напасці на след. І, калі вы ўсё ж такі звярнуліся па дапамогу, трэба расказаць усё як ёсць: і пра алкагольную залежнасць, і сумніўных знаёмых, і частату знікненняў. Гэта істотна паскорыць працэс пошукаў. Усё, што вы па тых ці іншых прычынах хацелі ўтаіць, усё роўна будзе раскрыта.

За 9 месяцаў гэтага года паступіла больш за 6 тысяч заяў аб знікненні чалавека, больш за дзве трэція з іх — мужчыны. Прычым некаторыя «сыходзяць з дому» не адзін раз, а аж да дзясятка. Такія паводзіны часта ўласцівыя падлеткам, іх у спісе — 14%. У асноўным гэта дзеці з «цяжкіх» сем'яў, якія зноў адпраўляюцца ў «свабоднае плаванне» адразу пасля таго, як іх вернуць дадому. У пацвярджэнне таму — свежы прыклад: 16-гадовая вучаніца аднаго з бабруйскіх каледжаў за год сыходзіла з дому 5 разоў. Больш прывабным ёй здаваліся «кватэры з нядобрай рэпутацыяй», 19 кастрычніка супрацоўнікі міліцыі вярнулі дзяўчыну бацькам і ў той жа дзень зноў атрымалі паведамленне пра яе знікненне. Цяпер яна зноў дома, але адкрытым застаецца пытанне: ці надоўга? «Перасягнула» бабруйчанку 14-гадовая жыхарка Мінска: сёлета яна збягала з дзіцячага дома цэлых 7 разоў. У апошні раз — адправілася ў госці да прыяцеля. На стук у дзверы ніхто не рэагаваў, таму супрацоўнікам міліцыі прыйшлося паўдня правесці ў засадзе, каб сустрэць яе на вуліцы і вярнуць па месцы жыхарства.

**Каля 97% усіх зніклых удаецца знайсці на працягу першых 10 дзён.**

Асаблівую катэгорыю складаюць тыя, хто з'ехаў на заробкі. Пераважная большасць адпраўляецца ў пошуках «кавалка хлеба» ў Расію і часта трапляе ў рукі нядобрасумленных работадаўцаў. Перад тым, як з'ехаць у іншую краіну, абавязкова варта паведаміць сваякам дакладнае месца знаходжання, а лепш — яшчэ і назву арганізацыі-наймальніка і яе кантакты.

Нягледзячы на тое, што значная частка «прапажаў» тлумачыцца бестурботнасцю зніклага — не думаў, што будуць хвалявацца, забыўся патэлефанаваць — ніколі нельга выключаць верагоднасць, што тут ёсць крымінальная аснова. Асабліва падазрэнне гэта выклікае, калі ў чалавека ёсць сям'я, больш-менш стабільная праца, а пра свае намеры ён не паведамляе нікому з блізкіх. Такім чынам забойства можа быць замаскіравана пад знікненне. Калі родныя або сябры адразу ж звяртаюцца ў праваахоўныя органы, злачынства нярэдка раскрываецца па гарачых слядах.

У жніўні гэтага года ў Гродна таксіст не вярнуўся пасля начной змены дадому. Як аказалася, два хлопцы папрасілі адвезці іх за горад, дзе напалі на яго і забілі. Адзіная мэта — «лёгкі» заробак. Прычым цікавілі злачынцаў толькі грошы: аўтамабіль быў пакінуты каля абочыны. Непадалёку ў полі падчас вышуковых работ быў знойдзены і труп забітага. Здзейснілі злачынства маладыя людзі ў стане алкагольнага ап'янення. Сквапнасць стала прычынай яшчэ аднаго страшнага злачынства, якое адбылося ў Магілёве ў маі гэтага года. На гэты раз два бізнес-партнёры не падзялілі выручку. Яны займаліся рамонтам аўто: у той час як адзін укладваў грошы ў развіццё бізнесу, другі — у свае асабістыя патрэбы. Агульную справу вырашылі падзяліць — і зноў не дамовіліся. Тады той, які, на яго думку, больш грошай уклаў у бізнес, прыйшоў ноччу разам з памочнікам да экс-партнёра і жорстка з ім расправіўся. Мужчына, які нічога не падазраваў, сам палегчыў злачынцам задачу: ён застаўся начаваць у гаражы, каб не турбаваць жонку, якая незадоўга да гэтага нарадзіла дзіця. Труп вывезлі на тэрыторыю аднаго з закінутых заводаў, дзе закапалі ў назіральнай яме, якую пасля залілі бетонам. Злачынства было раскрыта за некалькі дзён.

А вось даведацца, што адбылося з без вестак зніклай жыхаркай Пінска, пасля раскрыцця новых фактаў удалося толькі праз 8 гадоў. Аказалася, маці пазбавіў жыцця ўласны сын, а цела схаваў у гаспадарчай пабудове. Нягледзячы на ўнушальны тэрмін, лёс жанчыны не застаўся нявысветленым.

— Зараз працягваецца сезон знікнення людзей у лесе. З пачатку года аб гэтым паступіла 121 заява. Нават на дадзены момант у лясах па ўсёй рэспубліцы знаходзяцца 11 чалавек, якія згубіліся. У асноўным гэта пажылыя людзі, якія кіруюцца думкай «я гэты лес ведаю з дзяцінства», аднак не ўлічваюць узроставыя магчымасці. Многія з іх пакутуюць на старэчыя змены свядомасці, — адзначыў палкоўнік міліцыі. — Прачасаць лес — гэта досыць працаёмкі працэс. Нам часта дапамагаюць салдаты і валанцёры — збіраюцца дзясяткі і нават сотні чалавек. Калі ваш блізкі згубіўся ў лесе, не варта марнаваць час на самастойные пошукі — такі масіў усё роўна не ахапіць, — лепш адразу ж паведаміць у міліцыю, а ўжо пасля — далучыцца да працы прафесіяналаў ■

### Як правільна арганізаваць паход у лес:



— Паведаміце пра свае планы родным ці знаёмым, удакладніўшы, куды менавіта вы збіраецеся адправіцца.

— Апынуўшыся на месцы, звярніце ўвагу на буйныя арыенціры: рака, дарога, чыгуначная станцыя.

— Калі ёсць магчымасць, абавязкова вазьміце з сабой мабільны тэлефон, папярэдне цалкам яго зарадзіўшы і папоўніўшы баланс.

— Не лішнім будзе свісток: ён можа аказацца значна больш дзейсным, чым тэлефон.

— Лепш выбіраць вопратку яркіх тонаў, бо камуфляж можа істотна ўскладніць пошукі.

— Пры сабе неабходна мець запас ежы, цёплыя рэчы, нож, компас, зручны абутак. У ідэале — мінімальны набор лекаў, у тым ліку бінт і ёд для апрацоўкі ран, воданепранікальныя запалкі, дажджавік, невялікі запас грошай.

### Як дзейнічаць, калі вы заблудзілі ў лесе:

— Галоўнае — не паддавайцеся паніцы!

— Калі вы былі не адзін, паспрабуйце вярнуцца на тое месца, дзе расталіся з астатнімі.

— Выберыце арыенцір — сцежку, прасеку або лініі электраперадач — і рухайцеся ўздоўж яго. Ні ў якім разе не зварочвайце.

— Ніколі не пераходзьце раку і тым больш балота. Заўсёды надзейней ісці ў процілеглы ад іх бок.

— Для начоўкі лепш выбраць месца на ўзвышшы, паблізу вялікага дрэва. Абавязкова варта распаліць вогнішча.

— Ляжаць трэба тварам да вогнішча і ўсімі сіламі імкнуцца не заснуць: дапамога можа быць недзе побач.

■ Грамадства

# Спачатку ўсе вакансіі прапануюць беларусам, а толькі потым замежнікам

## Зменены Закон аб працоўнай міграцыі

**Цяпер замежныя кампаніі могуць прыцягваць нерэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь толькі для работы ў сваіх прадстаўніцтвах і колькасцю не больш за 5 чалавек. Асабліва адчувальна гэта можа закрануць кітайскія кампаніі, якія актыўна задзейнічаюць сваіх суайчыннікаў. Цяпер яны працягваюць працаваць у ранейшым рэжыме, аднак пасля заканчэння дзеяння спецыяльнага дазволу, згодна з указам Прэзідэнта «Аб рэалізацыі інвестыцыйных праектаў», такое права захаваецца ў 6 кампаній.**

Як адзначыў намеснік **начальніка Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Аляксандр ТАТУРА**, у цэлым прынятым змяненням і дапаўненням у Закон «Аб знешняй працоўнай міграцыі» варта даць станоўчую ацэнку, паколькі яны ліквідуюць шэраг недахопаў, закрываюць некаторыя спрэчныя пытанні, якія ўзнікалі на практыцы. Навоўвядзенні накіраваны на ахову айчыннага рынку працы, што павінна спрыяць занятасці вольных працоўных месцаў грамадзянамі Беларусі, а таксама замежнікамі, якія пастаянна пражываюць у нашай краіне.

Кожная вакансія павінна не менш за 15 дзён знаходзіцца на біржы працы, толькі пасля гэтага яе можна прапанаваць замежнікам. Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі МУС пільна сочыць за гэтым працэсам і спыняе ўсе спробы схітраваць: некаторыя кампаніі свядома значна заніжалі заработную плату, каб беларускія спецыялісты адмаўляліся ад вакансіі, аднак, як толькі яны бралі на працу замежніка, сума адразу ж узрастала ў некалькі разоў.

Беларусь зацікаўлена ў прыцягненні высокакваліфікаваных спецыялістаў: ніякіх абмежаванняў па іх колькасці няма. Аднак для таго, каб адносіцца да гэтай катэгорыі, трэба адпавядаць пэўным крытэрыям: мець вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, стаж работы ад 5 гадоў, а таксама заработную плату не менш 3400 рублёў. Палегчаны працэс працаўладкавання для студэнтаў або маладых спецыялістаў з іншых дзяржаў, якія вучыліся ў Беларусі і плануюць развівацца ў сваёй прафесійнай сферы.

Навоўвядзенні дазволяць, з аднаго боку, стымуляваць прыцягненне асобных катэгорый работнікаў з ліку замежнікаў, у якіх зацікаўлена Беларусь, з другога боку, своечасова рэагаваць на змяненне міграцыйнай сітуацыі ў свеце і не дапусціць на беларускі рынак працы ўезду нелегальных мігрантаў.

Спецыяліст нагадаў, што для працаўладкавання ў Рэспубліцы Беларусь замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не маюць дазволу на пастаяннае пражыванне, наймальнік абавязаны атрымаць: дазвол на прыцягненне замежнай працоўнай сілы — пры выкарыстанні працы замежнікаў у колькасці, якая перавышае дзесяць чалавек, а таксама спецыяльны дазвол на права займацца працоўнай дзейнасцю на кожнага замежніка.

Пік актыўнасці замежных грамадзян прыйшоўся на 2014 год за кошт перасяленцаў з Украіны. Калі ў 2012 годзе агульная колькасць працоўных мігрантаў склала каля 9 тысяч чалавек, у 2013-м — крыху больш за 18 тысяч, то ў 2014-м — рэкордны лік у 38 тысяч. У мінулым годзе колькасць скарацілася да 32 тысяч, паказчыкі працягваюць зніжацца: за першыя 6 месяцаў гэтага года ў краіну ўехала каля 11 тысяч працоўных мігрантаў. Больш за 50% з іх прадстаўнікі працоўных спецыяльнасцяў, якія задзейнічаны ў тым ліку і ў сельскай гаспадарцы. Па агульнай колькасці работнікаў лідзіруюць Кітай, Украіна і Расія. Аднак сустракаюцца і больш экзатычныя краіны: у пошуках лепшага жыцця ў Беларусь прыехала па адным работніку з Сэнт-Кітс і Нэвіса, Сьера-Леонэ і Кот-д'Івуара. Асаблівыя адносіны ўсталяваліся з краінамі-ўдзельніцамі ЕАЭС. Грамадзяне Расіі, Казахстана, Кіргізіі і Арменіі па-за залежнасцю ад кваліфікацыі могуць працаваць на тэрыторыі нашай дзяржавы без спецыяльнага дазволу ■

**У ТЭМУ:**

У Люксембургу была падпісана дэкларацыя аб партнёрстве Рэспублікі Беларусь з Еўрасаюзам у сферы мабільнасці. Гэтая дэкларацыя з'яўляецца першым асноватворным дакументам, які рэгулюе ўзаемаадносіны нашай дзяржавы з ЕС у сферы міграцыі. Праект ахоплівае адразу некалькі кірункаў: агульны кантроль за міграцыяй, у прыватнасці, павышэнне ўзроўню легальнай мабільнасці, а таксама прадухіленне незаконнай міграцыі і гандлю людзьмі; наладжванне працэсу вяртання на радзіму дэпартаваных грамадзян; надзейнасць дакументаў, якія засведчваюць асобу; кіраванне межамі і механізмы дачы прытулку і міжнароднай абароны. Падпісанне дэкларацыі з'яўляецца важным крокам на шляху спрашчэння візавых працэдур паміж Беларуссю і краінамі ЕС.

■ Бывае ж!

# ЗВОЛЬНІЎ — У ТУРМУ

## Як паляк ледзь не стаў ахвярай помсты крыўдлівага беларуса

У маі мінулага года ў пункце мытнага афармлення «Варшаўскі мост» грамадзянін суседняй краіны Кшыштаф Ліхаграй быў затрыманы супрацоўнікамі мытнай службы. Як высветлілася, у бамперы яго аўтамабіля пад пластыкавай абшыўкай былі выяўленыя таблеткі, якія змяшчалі небяспечнае псіхатропнае рэчыва. Грамадзянін Польшчы сваю віну катэгарычна адмаўляў, аднак факты гаварылі больш пераканаўча і затрыманага змясцілі ў СІЗА, а яго аўтамабіль быў канфіскаваны. Праз тры дні яго выпусцілі пад заклад.

Разбіральніцтвы зацягнуліся, таму Кшыштаф прыняў рашэнне звярнуцца ў Шостае ўпраўленне (па Брэсцкай вобласці) Галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй (ГУБАЗіК) МУС Рэспублікі Беларусь. Супрацоўнікі ўпраўлення ў хуткім часе высветлілі, што сапраўдны вінаўнік здарэння — жыхар Брэста. Такім чынам ён вырашыў правучыць паляка за звальненне жонкі, якое, дарэчы, было здзейснена «па законных і аб'ектыўных прычынах». Цяпер «мсцівец» адбывае тэрмін пакарання ў месцах пазбаўлення волі.

Што тычыцца Кшыштафа Ліхаграя, то з яго ўсе абвінавачванні былі знятыя і нядаўна ён даслаў ліст на імя міністра МУС Рэспублікі Беларусь са словамі: «Я дзякую супрацоўнікам Шостага ўпраўлення (па Брэсцкай вобласці) ГУБАЗіК МУС Рэспублікі Беларусь і жадаю ім далейшых поспехаў у рабоце!» ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО. kasko@zviazda.by

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «ПОКУПАЙ СЕМЕЧКИ – ВЫИГРЫВАЙ ДЕНЕЖКИ!»

**Настоящие правила проведения рекламной игры «Покупай семечки – выигрывай денежки!» (далее – Правила), направленной на продвижение продукции, производимой под товарным знаком «Сан Саныч», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 №51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры ««Покупай семечки – выигрывай денежки!» (далее – Рекламная игра).**

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 7 июля 2011 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №191682518 (далее – Организатор).

Юридический адрес Организатора: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 10, пом. 24.

**2. Заинтересованное лицо**

Заинтересованным лицом является Общество с дополнительной ответственностью «НП-Сервис», УНП 100080849, зарегистрированное Решением Минского городского исполнительного комитета от 28 сентября 2000 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100080849.

Юридический адрес Заинтересованного лица: 220056, г. Минск, ул. Героев 120-й дивизии, 15-81.

**3. Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет, а также иностранные граждане и лица без гражданства, достигшие 18 лет, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно проживающие в Республике Беларусь.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Название Рекламной игры:** «Покупай семечки – выигрывай денежки!»

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь

**6. Дата начала Рекламной игры:** 10 ноября 2016 г.

**7. Дата окончания Рекламной игры:** 30 января 2017 г.

**8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:**

• Сан Саныч Семечки 120 г подсолнечника жареные неочищенные x20

• Сан Саныч Семечки 120 г подсолнечника жареные неочищенные соленые x20

• Сан Саныч Семечки 180г подсолнечника жареные неочищенные x24

Указанные выше товары далее по тексту именуются «Игровой продукт».

**9. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств Заинтересованного лица и имущества Организатора в размере **26 978,53** (двадцати шести тысяч девяти сот семидесяти восьми) белорусских рублей и 53 копеек в денежных знаках образца 2009 г. или **269 785 300** (двухсот шестидесяти девяти миллионов семисот восьмидесяти пяти тысяч трех ста) белорусских рублей в денежных знаках образца 2000 г.

*Таблица 1: Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:*

| Наименование приза | | Кол-во, шт. | Стоимость с НДС за ед., бел. руб. (в ден. знаках 2009 г.) | Стоимость с НДС за ед., бел. руб. (в ден. знаках 2000 г.) | Общая стоимость с НДС, бел. руб. (в ден. знаках 2009 г.) | Общая стоимость с НДС, бел. руб. (в ден. знаках 2000 г.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Денежный приз** | 1 000,00 бел. руб. | 4 | 1 000,00 | 10 000 000 | 4 000,00 | 40 000 000 |
| | Денежное вознаграждение | 4 | 134,63 | 1 346 300 | 538,53 | 5 385 300 |
| **Пополнение счета мобильного телефона** | Электронные коды оплаты номиналом 1,00 бел. руб. (Velcom) | 6 732 | 1,00 | 10 000 | 6 732,00 | 67 320 000 |
| | Электронные коды оплаты номиналом 1,00 бел. руб. (МТС) | 8 976 | 1,00 | 10 000 | 8 976,00 | 89 760 000 |
| | Электронные коды оплаты номиналом 1,00 бел. руб. (Life) | 6 732 | 1,00 | 10 000 | 6 732,00 | 67 320 000 |
| **ИТОГО:** | | | | | **26 978,53** | **269 785 300** |

**9. Условия участия в Рекламной игре:**

10.1. Для участия в розыгрыше Приза «Пополнение счета мобильного телефона» необходимо:

10.1.1. Приобрести любой Игровой продукт в специальной упаковке с описанием механики Рекламной игры (далее – Рекламная упаковка) в период с 10 ноября 2016 г. по 4 января 2017 г.;

10.1.2. Найти в упаковке карточку-вкладыш с Уникальным кодом (далее – карточка-вкладыш);

10.1.3. Ввести Уникальный код с карточки-вкладыша и Персональные данные на странице Рекламной игры www.1000rubley.by, а именно:

• Фамилия, имя, отчество Участника Рекламной игры;

• Номер мобильного телефона Участника;

• Мобильный Оператор Участника (Velcom, Life:), МТС).

Уведомление об успешной регистрации Уникального кода и Персональных данных участник получает во входящем SMS-сообщении, высланнном на номер, указанный Участником при вводе Персональных данных.

Входящее SMS-сообщение Участник получает в течение 48 часов с момента ввода данных на сайте www.1000rubley.by.

Стоимость входящего SMS-сообщения составляет 0 (ноль) бел. руб.

**10.2. Для участия в розыгрыше приза «Денежный приз» необходимо:**

10.2.1. Приобрести любой Игровой продукт в специальной упаковке с описанием механики Рекламной игры (далее – Рекламная упаковка);

10.2.2. Найти в упаковке карточку-вкладыш с одной из 5 (пяти) букв слова «САНЫЧ» (далее – карточка-вкладыш с буквой) и Уникальный код, соответствующий каждой букве;

10.2.3. Собрать 5 карточек-вкладышей с буквой для получения слова «САНЫЧ»;

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом* – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).**

**Последний день приема заявлений - 23 ноября 2016 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок:45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**


«Сінаптычныя сувязі» Ганны СІЛІВОНЧЫК.


«Flashback» Алега КАСЦЮЧЭНКІ.

■ Падзея месяца

# САЛОН — ГУЧЫЦЬ ГАНАРОВА

## Выстава 162 сучасных мастакоў цягне не проста на падзею месяца, а на падзею года

**Парыжскі салон, што пачынае гісторыю з XVII стагоддзя, — традыцыя легендарная. Практыка арганізоўваць рэгулярныя выставы актуальнага мастацтва пачалася з прэзентацыі аўтараў Акадэміі выяўленчага мастацтва і перарасла ў экспазіцыі найлепшага сучаснага мастацтва цалкам. А ў 1903 годзе аб'яднанне дзеячаў французскага мастацтва назвала сябе Суполкай восеньскіх салонаў і адкрыла сваю першую выставу. З тых часоў падобныя імпрэзы ў розных краінах спасылаюцца на парыжскую практыку і спрычыняюцца да гісторыі сусветнага мастацтва, французскі складнік у якой — найбагацейшы. Сваё месца ў парыжскіх Восеньскіх салонах першай паловы XX стагоддзя мелі мастакі з Беларусі Марк Шагал, Хаім Суцін, Міхаіл Кікоін, Яўген Зак, Осіп Любіч ды іншыя. А з мінулага года Беларусь мае свой уласны Восеньскі салон — арганізаваную Белгазпрамбанкам выставу-продаж жывапісу, скульптуры, графікі, інсталяцый, фатаграфіі, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва цэлага шэрагу сучасных аўтараў.**

Сёлета «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» сабраў у Палацы мастацтваў і ў спецыяльным анлайн-каталогу artcenter.by каля 500 работ 162 сучасных беларускіх творцаў. Для параўнання, летась, калі выстава прайшла ўпершыню, было прадстаўлена толькі 90 аўтараў.

Кожны з пяцісот экспанатаў можна купіць. На першым салоне, напрыклад, арганізатары прадалі 30 працэнтаў выстаўленых работ (каля сотні твораў). Сёлетняя статыстыка стане вядомай пасля завяршэння выставы, якое адбудзецца ўжо заўтра, 30 кастрычніка.

Цягам амаль месяца, пачынаючы з 7 кастрычніка, наведвальнік меў магчымасць скласці для сябе пэўны вобраз сучаснага выяўленчага мастацтва Беларусі. «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» — гэта маштабная актуальная выстава, фарміраванне прэстыжу беларускага мастацтва, уклад у стварэнне арт-рынку краіны ды імпульс для творцаў, якія такім чынам ствараюць уласную суполку кшталту Суполкі восеньскіх салонаў.

За якасць выставы можна не хвалявацца, бо будучых удзельнікаў Салона адбірала спецыяльная экспертная камісія. З запрашэннем да ўдзелу кожны аўтар атрымлівае выставачную пляцоўку, увагу з боку патэнцыйных пакупнікоў і ў выпадку абрання конкурсным журы магчымасць паўдзельнічаць у Восеньскім салоне ў Парыжы (пройдзе на Елісейскіх палях у кастрычніку 2017 года). Дарэчы, яго прэзідэнт Сільвія Кошлін з'яўляецца членам міжнароднага журы «Восеньскага салона

**Для наведвальнікаў застануцца імёны беларускіх творцаў, магчыма, новыя любімчыкі, раптам — прыгожыя, канцэптуальныя, незвычайныя пакупкі, створаныя таленавітымі суайчыннікамі.**

**Сёлета «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» сабраў у Палацы мастацтваў і ў спецыяльным анлайн-каталогу artcenter.by каля 500 работ 162 сучасных беларускіх творцаў.**

з Белгазпрамбанкам», у склад якога ўвайшлі таксама Аляксандр Бароўскі з піцерскага Рускага музея, арт-крытык з Кіева Канстанцін Дарашэнка, прадстаўнік Берлінскай галерэі Гіда Фасбэндэр і дырэктар вільнюскай галерэі «Arka» Давіле Тамкутэ.

— Мінскі Восеньскі салон з Парыжскім аб'ядноўваюць хіба што назва ды сама энергетыка — нарэшце, мы прычыніліся да традыцыі, якая ў Еўропе існуе больш за сто гадоў, — кажа Рыгор Сітніца, старшыня Саюза беларускіх мастакоў, які з'яўляецца адным з арганізатараў выставы. — Белгазпрамбанк увогуле — вялікі руплівец на ніве вяртання на радзіму спадчыны знакамітых землякоў і разам з тым шмат робіць, каб вывесці нашу творчую моладзь на больш шырокія абсягі, дапамагчы ёй упісацца ў агульнаеўрапейскі мастацкі кантэкст. Арганізацыя Салона — вельмі харошая ініцыятыва, вакол якой канцэнтруецца шмат новай творчай энергіі. Ёсць людзі, асабліва сярод моладзі, якіх трэба падштурхоўваць да ўдзелу. Але імпрэза, ды яшчэ і конкурс, дзе малады мастак мае шанц атрымаць узнагароду, трапіць у каталог і нават прадаць свой твор, канечне, выклікаюць цікавасць. Пры камерцыйным чынніку праект мае дужа высокую якасць: эксперты выбіраюць творы, якія не проста маюць шанц знайсці пакупніка, але валодаюць і мастацкай каштоўнасцю. У нашай прасторы гэта ў прынцыпе новая практыка, бо такога размаху і маштабу мы дакладна не мелі. Мяне цешыць, што вакол Палаца мастацтваў віруе такое жыццё, і спадзяюся, Восеньскі салон стане традыцыйным.

Падчас работы выставы ў Палацы мастацтваў таксама праходзілі лекцыі, квэсты і заняткі з дзецьмі. 30 кастрычніка выстава завершыцца, журы назаве пераможцаў, арганізатары — колькасць прададзеных работ. Для наведвальнікаў жа застануцца імёны беларускіх творцаў, магчыма, новыя любімчыкі, раптам — прыгожыя, канцэптуальныя, незвычайныя пакупкі, створаныя таленавітымі суайчыннікамі.

**З запрашэннем да ўдзелу кожны аўтар атрымлівае выставачную пляцоўку, увагу з боку патэнцыйных пакупнікоў і ў выпадку абрання конкурсным журы магчымасць паўдзельнічаць у Восеньскім салоне ў Парыжы.**

Для ўдзельнікаў застанецца больш шчыльная далучанасць да агульнай арт-прасторы краіны і, што важна, да арт-рынку, які носіць у Беларусі даволі сціплы характар. Так ці інакш, дзеянне «Восеньскага салона з Белгазпрамбанкам» кастрычнікам не абмяжоўваецца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

■

# У ДРАМАТЫЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ

**Беларуская частка фестывалю «ТЭАРТ» сёлета выклікала ці не большую цікавасць, чым замежная. І калі ўвага да тэатраў лялек у нас падтрымліваецца работамі асобных рэжысёраў, якія нацэлены на актыўны дыялог і не баяцца правакаваць гледача на эмоцыі, то драматычныя тэатры больш асцярожныя (так падаецца).**
**Таму калі з'яўляюцца пастаноўкі, якія ламаюць звыклы шаблон, да іх увага асаблівая.**
**У тым ліку з боку арганізатараў тэатральнага форуму, якія пастараліся прадставіць усё тое, што атрымала рэзананс у грамадстве. Рэзананс, які тлумачыцца проста: тут увага да самога грамадства, пытанні, што патрабуюць вырашэння, а тэатр іх агучвае.**
**А яшчэ — дае выкід эмоцый, якія могуць накопліваццa і выклікаць працяглую дэпрэсію, паралізуючы волю, без якой немагчымы далейшы рух.**


«Опіум».

Наогул няшмат у нас пастановак, дзе ёсць канцэнтрацыя крайніх эмоцый, дзе паказаны людзі ў вельмі вострых перажываннях, што апынуліся ў сітуацыях, ад якіх не застрахаваны ніхто. За такі няпросты матэрыял бяруцца вельмі неабыякавыя творцы, якія не баяцца рызыкаваць: актуальнае можа выглядаць спекуляцыяй на балючым альбо каньюнктурай — усё залежыць ад спосабу падачы. У рэжысёра складаная задача: трэба ўразіць і адначасова зрабіць даходліва, таму што першасны для нас усё ж сэнс. Ён можа прагучаць ці не. Можа быць вельмі глыбокім, ці павярхоўным. А яго даносяць людзі — артысты.

**Да тэмы Другой сусветнай у нас настолькі асаблівыя адносіны, што яны могуць перакрэсліць ці спрасціць, ці зрабіць дэкаратыўным любы геніяльны твор.**

Так, у сучасным тэатры ім усё больш дапамагае тэхніка, але ў яе ўсё роўна роля другога плана, як, напрыклад, у спектаклі «Опіум». Пра гэты праект мы расказвалі нашым чытачам, калі ён толькі нарадзіўся. Некалькі наступных паказаў засведчылі: людзі яго падтрымалі не толькі фінансава, спектакль карыстаецца ўвагай гледачоў. Таму што сама сітуацыя вельмі вострая. Два браты жывуць у маленькім горадзе. Малодшаму паступаць у інстытут. Старэйшы апынуўся без работы. Грошай маці сям'і не хапае. Старэйшы едзе на заробкі ва Украіну — і толькі праз цуды тэхнікі з ім трымаецца сувязь. Бачыш яго ў колерах хакі — і турбуешся. А тым часам вайна прыходзіць у хату з іншага боку...

П'еса Віталя Каралёва, увасобленая рэжысёрам Аляксандрам Марчанкам, мае дакладнае публіцыстычнае гучанне. Антываеннае. Але галоўная думка даносіцца без пафасу, які ў нас па традыцыі злучаецца з гэтай тэмай. Але ж справа ў тым, што нярэдка пафас пераводзіць жывыя і чалавечыя з'явы ў рэчышча тых, што ўспрымаюцца як штучныя. Гэта супярэчыць мэце. Артысты, якія пажадалі ўдзельнічаць у праекце, выдатна разумелі, што паказваюць. Паказвалі людзей, якіх мы бачым на вуліцы, якія прыходзяць у залу. Якія вось так спрачаюцца з сябрамі з нагоды таго, што адбываецца навокал. У нейкім сэнсе гэта спектакль-напамін пра тое, якое крохкае жыццё. Не важна, дзе жывеш. Міжволі думаеш пра яго каштоўнасць. Што можа быць наогул больш актуальным, чым жыццё?

На форуме «ТЭАРТ» спектаклі беларускіх драматычных тэатраў казалі пра сэнс, сутнасць і каштоўнасць жыцця праз супрацьлегласць смерці. Экзістэнцыяльны аспект заўсёды своечасовы, і гэта не звязана з модай, таму што чалавек імкнецца асэнсаваць сваю прысутнасць у свеце: што ад яе добрага іншым ці наадварот.

Асэнсаваць прысутнасць праз адсутнасць прапанавала ўкраінская аўтарка Наталля Варажбіт. Дзмітрый Багаслаўскі паставіў яе п'есу «Саша, вынесі смецце» як рэжысёр у Дзяржаўным маладзёжным тэатры. У камернай атмасферы ішла гаворка пра любоў, смерць і чалавечыя даўгі, ад якіх не вызваляецца (ці не вызваляе сябе) душа нават пасля смерці. Гаворка не ў катэгорыях веры (але яна так ці інакш адбілася на менталітэце), і нават не праз маралізатарства.

Гісторыя сям'і, дзе памірае гаспадар. Мужчына, вайсковец, але тут проста муж і бацька. Які працягвае прысутнічаць у прасторы сваёй сям'і, але існуе нібыта ў паралельным вымярэнні, побач з тымі, каго любіць. Не важна, якім ён быў у жыцці (ці якім здаваўся). Мае значэнне сапраўдная вартасць яго душы: жаданне нават пасля смерці выконваць свае абавязкі — перад самім сабой, перад роднымі, і нават перад радзімай, калі ў дзверы стукаецца вайна. Каштоўнасць жыцця вымяраецца каштоўнасцю душы з тым наборам якасцяў, якія яна напрацавала за зямны шлях. Мерай спеласці душы зноў становіцца вайна, нават для Сашы, што памёр.


«Час сэканд-хэнд».

І яшчэ пра гэта... Саўлюс Варнас паставіў «Крэйцараву санату» ў Магілёўскім абласным драматычным тэатры. Талстой. І не нудотна! Забойства жонкі мужам з-за рэўнасці. Нельга сказаць, што распаўсюджаная з'ява, каб узнімаць гэтую праблему ў наш час (калі маральныя рамкі наогул размываюцца). Тым не менш Варнас здолеў актуалізаваць тэму дзякуючы самому Талстому: праз яго развагі пра смяротнае пакаранне, такім чынам задаўшы кірунак для асэнсавання гледачам: за ці супраць? Гэтаму спрыяе расповед галоўнага героя пра гісторыю свайго злачынства і тыя акцэнты, што расставіў стваральнік спектакля. А Варнас вядзе сваю лінію вельмі дакладна (рэжысёр сам рабіў інсцэніроўку). Напачатку робіць акцэнт на духоўнай сапсаванасці Пазднышава, — яна, нібыта атрута, цягам часу падточвае адносіны з жонкай, у якіх рамантыку выцясняюць падазрэнні. Але і адзін стан галоўнага героя-апавядальніка, і другі мы адчуваем не толькі дзякуючы пераканаўчай ігры артыста (Іван Трус), але і праз дробныя дэталі, якія ствараюць атмасферу. Іх няшмат (спектакль не перагружаны), іх роўна столькі, колькі неабходна для таго, каб прасачыць, калі і як у душы звычайнага чалавека пасяліліся чорныя пачварныя істоты. Яго супершчыры расповед — нібыта спроба ад іх пазбавіцца праз сілу пакаяння.

Ці гэта насамрэч тыя, хто катуе яго душу пры жыцці. Бо гэты чалавек, што адбыў пакаранне, толькі здаецца жывым — нам гэта паказваюць праз трапныя метафары, якія працуюць на патрэбныя эмоцыі, за якімі — сэнс. Форма знойдзена такая, каб яго перадаць. Ні больш, ні менш. Прадуманае выказванне, за якім зразумела: дзеля чаго.

Таму што форма (калі на яе робіцца акцэнт у тэатры) сэнс можа калі не забіць, дык заблытаць. Арыгінальнасць дзеля арыгінальнасці цікавая хіба што ў першыя хвіліны, а далей у форме хочацца разгледзець сутнасць. А яна ёсць (павінна быць!) у спектаклі паводле паэмы «Дзяды» А. Міцкевіча, які прадставіў Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы. Польскі рэжысёр Павел Пасіні разам з трупай беларускага тэатра адразу паспрабаваў уразіць: знішчылі адлегласць паміж сцэнай і гледачом. Знаходка вельмі кладзецца на гэты твор Міцкевіча: гледача ў літаральным сэнсе ўцягнулі ў кантэкст паэмы — выцягнулі на сцэну, дзе кожны быў часткай прасторы, у якой адбывалася дзея. Кожны трапляў у знакавае і сімвалічнае поле, дзе павінен панаваць звычай, традыцыя, зразумелая людзям адной культуры — пашана да продкаў, адчуванне сувязі з імі. Нездарма было часам адчуванне, што седзячы на сцэне ў коле, пасярэдзіне якога прамаўляюць артысты, ты нібыта прымаеш удзел у рытуале.

**Экзістэнцыяльны аспект заўсёды своечасовы, і гэта не звязана з модай, таму што чалавек імкнецца асэнсаваць сваю прысутнасць у свеце: што ад яе добрага іншым ці наадварот.**

Да нейкай мяжы задума спрацоўвала. Але стваральнікі спектакля хацелі ўзмацніць гучанне тэмы памерлых продкаў для Беларусі, зачапіўшы больш блізкі нам кантэкст і перыяд — Другую сусветную вайну і яе ахвяр. Паколькі для Беларусі гэта тэма святая, напэўна, мелася на мэце сувязь традыцыйных Дзядоў: продкі спакон веку нас пакідалі і ахоўваюць, там шматлікія пакаленні, але сувязь паміж імі абарваная. Нездарма ў сцэнаграфіі выкарыстоўваецца сімвал абсечанага карэння, што крывавіць. Але, на жаль, далей з ім нічога не адбываецца: памерла — так памерла. Да тэмы Другой сусветнай у нас настолькі асаблівыя адносіны, што яны могуць перакрэсліць ці спрасціць, ці зрабіць дэкаратыўным любы геніяльны твор. І тады проста глядзіш на тое, як артысты нешта іграюць, нягледзячы на тое, што адлегласць удалося звесці да мінімуму.

Можа, у любой іншай краіне спроба падобнай актуалізацыі паэмы Міцкевіча і зрабіла б сваю справу. Наш, мясцовы кантэкст, здольны пераважыць твор, які прапануе мастацкае асэнсаванне пэўнага кавалка рэчаіснасці. Каб аказацца вышэй, трэба не проста эксперыментаваць, а ствараць мастацтва, дзе ёсць бездакорнае спалучэнне формы (няхай і вельмі аўтарскай) са зместам. Каб сам эксперымент не памёр у вачах айчыннага гледача.

Так атрымалася (відаць, не змушана), што ў праграме беларускага шоу-кейса драматычныя тэатры прадставілі спектаклі з тэмай смерці за асобным выключэннем. «Беларусь 4:33...» Таццяны Арцімовіч паводле кнігі А. Клінава — развагі ў модным цяпер ключы, калі літаратурная аснова агучваецца і ілюструецца з дапамогай візуальнага рада. Асноўнай дамінантай становіцца тэкст і думкі, якія ў ім заключаныя (нехта скажа — смерць тэатра, але можа быць зноўтакі яго пераход у іншы стан, па аналогіі з адной з папярэдніх гісторый). Ці яшчэ «Час сэканд-хэнд» паводле Святланы Алексіевіч, увасоблены рэжысёрам Уладзімірам Пятровічам у Магілёве: гаворка пра тое, як балюча і пакутліва сыходзяць у нябыт эпохі, пакідаючы людзей з паламанай свядомасцю, якія не знаходзяць сябе ў новым часе. Ці ёсць у іх будучыня? Гэта значыць жыццё і працяг? Як ні круці, а зноў выхад на экзістэнцыяльныя пытанні, толькі для соцыумаў...

Сышліся ж пастаноўкі ў адным фестывалі, каб нас крыху страснуць ад стабільна-радаснага баўлення часу, што ў асноўным прапануюць нашы драматычныя тэатры. Так больш рацыянальна: браць правераныя сцэнай тэмы і формы (стабільныя). Таму нешта ірацыянальнае з аднаго боку прыцягвае, а з другога: каб яно адгукнулася, работа павінна быць бездакорнай.

...У адным з перформансаў (вечар «ТЭАРТу» быў прысвечаны гэтаму жанру ў Беларусі) укрыжавалі аўтара Ілью Сіна. Укрыжавалі сучаснымі сродкамі — тэхналагічнымі і тэхнічнымі адходамі, якія могуць не толькі дапамагаць, а і абцяжарваць існаванне людзей. Сімвалічны перформанс, не без сэнсу. У тым ліку і ў дачыненні да нашага тэатра: у ім ёсць сродкі сэканд-хэнд — маўляў, іншыя так ужо робяць, дык давайце карыстацца. А яно, можа, нам і не падыходзіць, як, напрыклад, былое ва ўжыванні аўто з левым стырном — розум не так настроены. Гэтак жа з перформансамі ці іншымі найноўшымі тэатральнымі формамі, якія паспяхова недзе прымяняюцца.

Ёсць своеасаблівыя сучасныя тэатральныя гаджэты — бяры і асвойвай, будзь прасунутым. Але ў іх можа аказацца столькі «наваротаў», што лёгка заблытацца і зламаць галаву, губляючы час. Ёсць, наадварот, вельмі тэхналагічныя і выключна рацыянальныя варыянты, якія не патрабуюць вялікіх выдаткаў (о, тое, што цяпер і трэба — так і просіцца думка), нібыта аўтаномныя выпраменьвальнікі, што дазваляюць лепш арыентавацца ў часе і прасторы. Але ступень выпраменьвання можа быць небяспечнай, калі няма сродкаў індывідуальнай абароны. Вось так і ў сучасным тэатры ўсё магчыма. Галоўнае скарыстоўваць гэта дзеля жыцця.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
*tsimoshyk@zviazda.by*

*Працяг. Пачатак у выпуску «Жырандолі» за 22 кастрычніка.*

*Працяг тэмы міжнароднага «ТЭАРТу» будзе.*

■ Фестываль

# ШТО ПЕРШАСНАЕ: ІНДУСТРЫЯ АЛЬБО КІНО?

## Як «Лістапад» развівае беларускую кінавытворчасць

**На сёлетнім Мінскім міжнародным кінафестывалі «Лістапад» другі раз будзе арганізавана Індустрыяльная платформа — спецыяльная пляцоўка, якая працуе не з кіно, а з працэсам стварэння фільмаў ды іх шляхам на вялікі экран.**
**З 5 да 10 лістапада ў Галерэі TUT.BY прафесіяналы і аматары кіно абстрагуюцца ад творчага складніка і сканцэнтруюцца на індустрыі. Нямецкі прадзюсар Сімонэ Баўман раскажа пра капрадукцыю, адборшчыца кінафестывалю ў Карлавых Варах Ленка Тырпакава распавядзе пра структуру і індустрыю форуму, тэмай выступлення прадстаўніка фестывалю ў Сан-Себасцьяне Раберта Куэта стануць шляхі развіцця нацыянальнай кінаіндустрыі. У Дзень беларускіх ініцыятыў — 6 лістапада — выступіць актрыса Алеся Грыбок, рэжысёр Андрэй Кудзіненка прадставіць праект «Хранатоп. ART:Reboot», а Андрэй Курэйчык — «PartyZan Film». Дадаём Дзень віртуальнай рэальнасці, майстар-клас польскага рэжысёра Паўла Лазінскага, Сцэнарнае сватанне — праграма выглядае даволі прадстаўнічай (і карыснай). Падрабязней — у размове з каардынатаркай платформы Лізаветай БОБРЫКАВАЙ.**



***— Хто з'яўляецца патэнцыйным удзельнікам Індустрыяльнай платформы?***

— Сёлета мерапрыемствы платформы падзелены на тэматычныя дні. Ёсць імпрэзы «агульнага характару», прызначаныя шырокаму колу наведвальнікаў, — напрыклад, на ўдзел у Дні віртуальнай рэальнасці (тут будуць паказаны фільмы, створаныя на аснове тэхналогій віртуальнай рэальнасці, пройдзе абмеркаванне выкарыстання новых тэхналогій у кінематографе. — **Аўт.**) за першыя суткі мы атрымалі 400 заявак. Больш вузкая аўдыторыя прадугледжана для мерапрыемстваў, скіраваных на папулярызацыю беларускіх праектаў, — сюды прыдуць тыя, хто цікавіцца беларускім кінематографам і працэсамі, што ў ім адбываюцца: рэжысёры, прадзюсары, кінакрытыкі і гледачы. Удзельнічаць у спецыялізаваных мерапрыемствах мае сэнс толькі практыкуючым кіношнікам — рэжысёрам, аператарам, прадзюсарам, кінаагентам, што займаюцца пошукам партнёраў і фінансавання, развіццём і прасоўваннем кінапраектаў. У майстар-класах і сустрэчах з прафесіяналамі кінасферы мы імкнёмся рабіць ухіл на практыку і прывязваць тэмы выступленняў да беларускай рэальнасці, просім спікераў расказваць пра магчымасці менавіта беларускіх кінематаграфістаў. Індустрыяльная платформа, такім чынам, — не проста экскурс у тэмы прадзюсавання і структуры фестываляў, а размова аб развіцці нацыянальнай кінаіндустрыі, рэальных варыянтах прасоўвання кінапраектаў. Вядома ж, кожны можа распараджацца гэтай інфармацыяй паводле свайго меркавання.

***— Мэта Індустрыяльнай платформы заяўлена як «абмеркаванне актуальных задач фарміравання нацыянальнай кінаіндустрыі». Ці значыць гэта, што ўдзельнікі будуць працаваць на агульную ідэю? Альбо кожны будзе накіраваны на атрыманне карысці канкрэтна для сябе?***

— Шырокае кола ўдзельнікаў, вядома, атрымае індывідуальную карысць, але мерапрыемствы, прадугледжаныя для прафесіяналаў, накіраваны на карысць калектыўную. Мы ўжо пачалі работу над каталогам беларускіх фільмаў, напярэдадні стварэнне карты кінаіндустрыі, на якой будуць адлюстраваны асноўныя ўдзельнікі рынку (прадзюсары, вытворчыя кампаніі, фірмы, што прапануюць арэнду абсталявання). Індустрыяльная карта дапаможа мясцовым і замежным партнёрам арыентавацца ў тэхнічных і творчых магчымасцях, якія ёсць у Беларусі. Адукацыйны пітчынг і Сцэнарнае сватанне якраз дапоўняць яе новымі кірункамі развіцця.

***— Вучыць беларускіх калег удзельнічаць у пітчынгах будзе праект B2B Doc. Што гэта за праект?***

— Нашы калегі і сябры з B2B Doc расказалі пра сваю ініцыятыву падчас мінулага «Лістапада». Яна аб'ядноўвае дакументалістаў з дзесяці краін ад Балтыйскага да Чорнага мора і стварае платформу для іх творчага ўзаемадзеяння. Яны актыўна ўдзельнічаюць у жыцці дакументальнай кінасуполкі і заўсёды рады дзяліцца практычным вопытам, што і зробяць у Мінску. Фармат пітчынгу распаўсюджаны на ўсіх буйных кінапляцоўках, але не так шмат беларускіх рэжысёраў маюць вопыт і неабходныя навыкі для ўмелага ў ім удзелу, які дапамог бы знайсці партнёраў і фінансаванне. Трэнінг дазволіць набыць гэтыя навыкі, а спікеры падзеляцца карыснай інфармацыяй, дзе іх можна будзе адразу прымяніць.

***— Польскі рэжысёр Павел Лазінскі абмяркуе з маладымі беларускімі аўтарамі іх работы — у якім фармаце гэта будзе праходзіць?***

— Фармат пакуль удакладняецца. Правядзенне майстар-класа стала магчымым дзякуючы падтрымцы польскага боку, для нас яна аказалася, канечне ж, актуальнай, бо Лазінскі — вядомы рэжысёр. Мы атрымалі сем заявак на індывідуальныя сустрэчы адразу пасля абвяшчэння магчымасці з ім пракансультавацца.

***— Што павінна стаць вынікам Сцэнарнага сватання?***

— З той прычыны, што мы праводзім яго ўпершыню, спачатку нам важна зразумець, ці ёсць цікавасць да мерапрыемства і сэнс «сватаць» сцэнарыі такім чынам. Гэта ініцыятыва дасць таксама магчымасць убачыць сцэнарыі патэнцыял беларускіх аўтараў і прадставіць шырокай публіцы актуальныя праекты. У ідэале мы хацелі б зрабіць «сватанне» штогадовым, а ў выніку ўбачыць рэалізаваныя дзякуючы яму кінапраекты.

***— Для ўдзелу ў Сватанні сцэнарыі павінны прайсці папярэдні адбор. Якія перспектывы дае аўтарам удзел у мерапрыемстве?***

— На першы раз мы не прадугледжваем нейкай гарантаванай дапамогі, але ўдзел у Сватанні дазваляе прадставіць сцэнарыі за межамі спецыялізаваных сцэнарных мерапрыемстваў і сцен Акадэміі (у чытаннях будуць удзельнічаць таксама студэнты і магістранты Акадэміі мастацтваў), дае магчымасць атрымаць зваротную сувязь ад аўдыторыі і знайсці партнёраў.

***— Хто будзе ўдзельнічаць у Сцэнарным сватанні?***

— Апроч сцэнарыстаў, мы актыўна запрашаем удзельнікаў усіх трох Нацыянальных конкурсаў «Лістапада», прадзюсараў, студэнтаў і выпускнікоў з кінаспецыяльнасцямі.

***— Колькі заявак ужо пададзена на мерапрыемствы Індустрыяльнай платформы?***

— Мы адкрылі рэгістрацыю толькі 17 кастрычніка і ўжо атрымалі па 86 заявак на асноўныя сустрэчы, пацверджана 150 удзельнікаў Дня віртуальнай рэальнасці (па даных на 27 кастрычніка. — **Аўт.**). У мінулым годзе мы атрымалі 180 заявак на ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах платформы, сёлета гэта лічба ўжо большая ў той час, як на рэгістрацыю застаўся яшчэ тыдзень.

***— Індустрыяльная платформа «Лістапада» грунтуецца, зразумела, на беларускай індустрыі — пры састаўленні праграмы вы адчувалі, што знаходзіцеся ў пачатку яе фарміравання, альбо падмурак, на які можна абаперціся, усё ж ёсць?***

— Існуе шэраг ініцыятыў, якія стартавалі і развіваюцца самастойна. Ёсць дзяржаўная сістэма кінавытворчасці і сістэма развіцця беларускага кіно ад моманту распаду Савецкага Саюза. Увогуле, беларуская кінаіндустрыя, на мой погляд, — гэта разрозненыя кінапрацэсы, узрослая колькасць лакальных фестываляў, ініцыятывы папулярызацыі айчыннага кіно. Але ёй не хапае сістэмнага падыходу, адкрытага дыялогу ўнутры краіны, актыўнага ўзаемадзеяння з дасведчанай і больш у гэтым кірунку развітай еўрапейскай кінасям'ёй. Таму наша мэта — ахапіць тое, што ўжо зроблена, і зразумець, якімі павінны быць наступныя крокі. Калі паглядзець на беларускую кінаіндустрыю ў кантэксце еўрапейскай, становіцца зразумелым, як шмат мы павінны зрабіць. І гэта звязана не з кінавытворчасцю самой па сабе, а з фарміраваннем прывабнага вобразу беларускага кіно для мясцовых гульцоў рынку і замежных партнёраў, даступнасці і празрыстасці інфармацыі пра тэхнічны і чалавечы патэнцыял нашай кінаіндустрыі, якаснага антуражу. У апошняе ўваходзіць атрыманне фінансавання, развіццё кінапраектаў (пітчынг, састаўленне бюджэту, капрадукцыя), іх прасоўванне на лакальных і міжнародных пляцоўках, маркетынгавыя стратэгіі і ацэнка шанцаў акупіць праект. Неразуменне магчымасцяў прасоўвання фільма прыводзіць да таго, што ў аснову ставіцца творчы складнік, што, зразумела, добра, але камерцыйны бок забываецца. За рэдкім выключэннем нашыя аўтары невядомыя за мяжой — выпраўленнем гэтай сітуацыі павінны займацца не асобныя персоны, а ўся кінасупольнасць. Звычайна гэтыя функцыі выконвае National promotion center альбо Film fund, але ў нас нічога такога пакуль няма. Да таго ж не хапае сістэмнай адукацыі ў сферы культурнага і кінаменеджменту. Такія праекты як, напрыклад, School of Film agents (SOFA), займаюцца гэтым і рыхтуюць культурных агентаў, здольных уплываць на структурныя змены ў нацыянальным кіно.

**Фармат пітчынгу распаўсюджаны на ўсіх буйных кінапляцоўках, але не так шмат беларускіх рэжысёраў маюць вопыт і неабходныя навыкі для ўмелага ў ім удзелу, які дапамог бы знайсці партнёраў і фінансаванне.**

***— Індустрыяльная платформа падчас «Лістапада» праводзіцца другі раз. Ці можна казаць аб відавочных выніках мінулага года?***

— Пакуль рана падводзіць колькасныя вынікі: першы год быў адукацыйным, мы, так бы мовіць, намацвалі глебу. Але мы паказалі тыя сферы і адпаведна прафесіі, што ў нас не развіты або знаходзяцца ў пачатку фарміравання — напрыклад, агент па продажах, дыстрыб'ютар, кінаагент ці вопытны капрадзюсар. З практычнага пункту гледжання важнымі сталі індывідуальныя сустрэчы, дзякуючы якім (але не толькі) беларускія работы паўдзельнічалі ў пітчынгах і кінафестывалях краін Балтыі і Усходняй Еўропы. Нашы спікеры далі практычную інфармацыю аб фестывалях, правілах і ўмовах вялікай гульні ў свеце кіно. Усё гэта дапамагло беларускім рэжысёрам лепш зразумець структуру індустрыі, ацаніць свае магчымасці і знайсці новыя спосабы развіцця. Напэўна, таму сёлета колькасць заявак узрасла.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
katsyalovich@zviazda.by



Фота БЕЛТА.

**Наш Максім Багдановіч**



# АСОБНА АД ДРУГІХ...

**Максім Багдановіч**
* * *

Жывеш не вечна, чалавек, —
Перажыві ж у момант век!

Каб хвалявалася жыццё,
Каб больш разгону ў ім было,
Каб цераз край душы чуццё
Не раз, не два пайшло!

Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.

І ў напружэнні паўнаты
Свайго шырокага жыцця
Без болю, ціха зойдзеш ты
Ў краіну забыцця.

«Топавасць» аўтара, яго мэтавая аўдыторыя, прагноз чаканняў чытача — усімі гэтымі паняццямі актыўна карыстаюцца сёння кнігавыдаўцы. Ад водгукаў рэдактараў, крытыкаў залежыць шмат. Ці дадуць твору права на жыццё, ці стане ён запатрабаваным, а, магчыма, і бестселерам?

Для аўтара заўсёды важнай была першая рэцэнзія на яго твор, першае чытацкае захапленне ці абурэнне. Бывае ж і так, што не здараецца пры жыцці гэтага прызнання, пасапраўднаму ацэньваюць толькі наступныя пакаленні...

Як жа ў гэтым сэнсе склаўся літаратурны лёс Максіма Багдановіча? Ці заўсёды творчы імпульс паэта знаходзіў водгук у сэрцах сучаснікаў?

Канечне, каб адказаць на гэтыя пытанні, трэба ўявіць умовы, у якіх пачынаў свой творчы шлях класік айчыннай літаратуры. Пачатак XX стагоддзя ў Беларусі быў перыядам «народніцтва» са сваёй шкалой ацэнкі літаратуры, са сваёй ідэалогіяй творчасці. Быць бліжэй да селяніна, жыць яго праблемамі, размаўляць з ім, як з роўным, — вось кароткі спіс асноўных мастацкіх задач, што ставіліся перад народнымі «песнярамі». Зразумела, што размаўляць з чалавекам працы можна толькі на яго мове. Таму часам і патрабаванні да формы выражэння думкі адыходзілі на другі план. Галоўнае — змест. Абуджальны, які прызывае да разняволення, да змагання за лепшую долю. І заканамерна, што ў гэтым святле кніжнік Максім выглядаў «не-для-народным» аўтарам, мысліў высокімі эстэтычнымі катэгорыямі. Быў занадта «выкшталцоным» у вачах многіх тагачасных крытыкаў.

Як вядома, на старонках «Нашай нівы» пабачылі свет першыя творы юнага Максіма Багдановіча, але і ў рэдакцыйным асяроддзі спачатку яго творчасць была ўспрынята даволі неадназначна. Вацлаў Ластоўскі прыводзіў ва ўспамінах факт аб «канфлікце інтэрпрэтацый», які ўзнік у 1909 г. пасля атрымання ліста Максіма Багдановіча з вершамі фальклорнай тэматыкі. «Верхняя» палата рэдакцыі тады пагадзілася з думкай Ядвігіна Ш. аб тым, што творчыя пошукі маладога аўтара — гэта яўная «дэкадэншчына» і ахрысціла іх «вершамі не для народа». Даказаць неаспрэчны талент паэта змог толькі праз пэўны час Сяргей Палуян. У 1910 г. у той жа «Нашай ніве» ён змясціў першы ў беларускамоўным друку цалкам станоўчы водгук на творы Максіма Багдановіча. З гэтым пагаджаўся і Янка Купала, які, аднак, прызнаваўся, што адразу яго таксама ўводзіла ў зман некаторая неадпаведнасць «нашаніўскім» стандартам: «Вельмі ўжо пароснаму мы пісалі <...> . У мяне матывы грамадзянска-нацыянальныя, у яго — ледзьве не «мастацтва для мастацтва», за малым выключэннем».

Рознасць ва ўспрыманні творчасці Багдановіча захоўвалася і яшчэ шмат гадоў пасля названага «канфлікту». Нават пра адзіны прыжыццёвы зборнік паэта з'явілася ў каталіцкай газеце «Беларусь» наступная інфармацыя: «Новая беларуская кніжка «Вянок» — зборнік вершаў М. Багдановіча, між катораымі ёсць дужа пекныя, але наогул вершы М. Багдановіча зразумелыя толькі для вучоных і начытаных людзей». «Штукарствам для штукарства» называў творы Багдановіча і Л. Гмырак (Мечыслаў Баброві) і ставіў яго «асобна ад другіх» паэтаў свайго часу. Магчыма, калі б не з'яўленне прыхільнай, грунтоўнай рэцэнзіі А. Луцкевіча пад назвай «Пясняр чыстай красы», то многія прыхільнікі «народніцтва» так і не разгледзелі б у вершах Максіма Багдановіча сапраўды нацыянальны, глыбока патрыятычны дух, да таго ж выражаны ў дасканалай, вытанчанай літаратурнай форме. Ды і няўжо «ненароднымі» можна назваць наступныя радкі, поўныя болю за лёс беларускага сялянства:

*Народ, Беларускі Народ!*
*Ты — цёмны, сляпы, быццам крот.*
*Табою ўсягды пагарджалі,*
*Цябе не пушчалі з ярма*
*І душу тваю абакралі, —*
*У ёй нават мовы няма.*
*Збудзіўшысь ад грознай бяды,*
*Увесь поўны смяротнай жуды,*
*Ты крыкнуць не вольны: «Ратуйце!»*
*І мусіш ты «Дзякуй» крычаць.*
*Пачуйце жа гэта, пачуйце,*
*Хто ўмее з вас сэрцам чуваць!*

Бо той, хто сапраўды суперажывае, абвінавачванне ў «слепаце» за абразу не палічыць...

Цікава, што, як часта бывае з геніямі, больш станоўчых водгукаў ужо на пачатку творчага шляху Максім Багдановіч атрымліваў у замежным друку. Напрыклад, неўзабаве пасля першай публікацыі Багдановіча, апавядання «Музыка», украінскі літаратуразнаўца Іларыён Свянцінскі ў кнізе «Відроджэнне білоруського письменства» адзначыў маладога творцу, які і сам, як той музыкант, «усю душу сваю клаў у ігру». А рускі публіцыст А. Пагодзін у артыкуле «Белорусские поэты» дае Багдановічу-паэту яшчэ больш разгорнутую характарыстыку: «М. Богданович — адна са з'яў, якія спадарожнічаюць нацыянальнаму абуджэнню народаў: тонкая і чуйная натура, ахопленая імкненнем вярнуцца да прыніжанага і забытага народа». Адзначае Пагодзін і наяўнасць у творцы «асаблівa інтэлігентнай душы». У 1911 годзе дзейнасць Максіма Багдановіча была заўважана чэшскім друкам. Вядомы славіст Адольф Чэрны пісаў: «Багдановіч — чалавек новай культуры, сюжэты яго нешматлікіх невялікіх вершаў агульначалавечыя».

Як бачым, маштаб творчай асобы Максіма Багдановіча па-сапраўднаму былі ацэнены па-за межамі яго месца і часу існавання. Што рабіць, такі ўжо лёс сапраўды геніяльных людзей, якія апераджаюць, працуюць на будучыню, падштурхоўваюць далейшае развіццё сучаснікаў і дбаюць найперш аб «шыраце духоўнай». А мы, удзячныя нашчадкі, і сёння не спыняемся ў жаданні даследаваць, адкрыць тое, што было схавана ад нас заслонай вечнасці.

**Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

■ Не абмініце

# СКРЫНКІ, ПОЎНЫЯ СКАРБАЎ

## Стартаваў новы праект, скіраваны на папулярызацыю чытання

**Зайсці на сайт movabox.by. Адказаць на пытанні тэста. Даведацца, якім героем у кнізе Людмілы Рублеўскай «Авантуры студыёзуса Вырвіча» (Мінск: Выдавецкі дом «Звязда», 2014) вы маглі б быць. Прыняць удзел у розыгрышы адной з 20 адметных скрынак, напоўненых артэфактамі, непасрэдна звязанымі з сюжэтам згаданага твора.**

Калі вельмі моцна спрасціць, то прыкладна так выглядае алгарытм дзеяння ўдзельніка новага праекта кампаніі velcom з сімвалічнай назвай movabox. Але гэта толькі вяршыня айсберга.

Насамрэч праект мае на мэце не адну тэставанку-забаўлянку, але папулярызацыю сучаснай беларускай літаратуры ў нашым грамадстве. Мяркуецца, што тэст стане першым крокам да знаёмства з кнігай (ён сапраўды складзены так, што не зацікавіцца проста немагчыма), а скрынка-падарунак з сімвалічнымі прадметамі ўзнагародзіць чытачоў. Бо рэчы, змешчаныя ў ёй, набываюць сэнс толькі пасля знаёмства з раманам. Што агульнага, акрамя сюжэта гісторыі пра вандроўку Пранціша Вырвіча і Баўтрамея Лёдніка ў польскі Дракошчын і туманны Лондан, могуць мець наступныя рэчы: набор для стварэння крышталю, мяшэчак з манеткай, карта падарожжа з наклейкамі, нататнік з чорнымі старонкамі, запоўнены загадкавымі рэцэптамі, магніцік з гербам горада і рэцэпт верашчакі? Натуральна, разам з усімі гэтымі прывабнымі рэчамі movabox змяшчае і саму кнігу. Толькі ўважлівы чытач гэтыя кавалачкі пазла складзе ў цэласную карціну.

— Наш новы праект арыентаваны на старэйшых школьнікаў і студэнтаў. Ён спалучае інтэрнэт- і афлайн-часткі. І для пачатку movabox мы спецыяльна падабралі кнігу, што стала б мастком паміж рознымі аўдыторыямі — школьнікамі, падлеткамі і дарослымі, — кажа **кіраўнік аддзела брэнд-менеджменту velcom Зміцер КУРЛОВІЧ.** — Ды і задача праекта — не проста падарыць скрынкі з наборам артэфактаў, а падштурхнуць да чытання кніг.



**Пісьменніца Людміла Рублеўская стала ўладальніцай скрынкі movabox №1 паводле яе рамана «Авантуры студыёзуса Вырвіча»**

«Беларуская літаратура нічым не горшая за іншыя. Яна паўнавартасная, на ўзроўні еўрапейскай, — зазначае **пісьменніца Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.** — Адзінае, чаго нам часта не хапае, — пасрэдніка паміж кнігай і чытачом. Ды і склалася так, што ў беларускай літаратуры існуе мноства стэрэатыпаў пра нуднасць і нецікавасць твораў айчынных аўтараў. Нам увесь час даводзіцца пераконваць чытача ў адваротным. Думаю, што мая кніга «Авантуры студыёзуса Вырвіча» — якраз прыклад той нясумнай беларускай літаратуры. XVIII стагоддзе, авантуры, рыцары, дамы, шляхта, двубоі, алхімікі, містыка, вандроўкі праз усю Еўропу... Хіба не захапляе? Яшчэ адна адметнасць нашага часу — кліпавае мысленне моладзі і патрэба ў абавязковай візуалізацыі. Выдатна, што кніга пра Вырвіча і Лёдніка таксама набыла матэрыяльнае ўвасабленне і дазваляе чытачам прыняць удзел у прыгодах герояў».

Movabox — гэта не толькі скрынкі і 4 абраныя кнігі. Праект мае яшчэ адзін складнік, ён скіраваны на развіццё беларускамоўнага буккросінгу — бясплатнага абмену кнігамі. У кавярнях, крэатыўных прасторах розных гарадоў хутка размесцяцца палічкі з кнігамі. Тут будуць і тыя 4 галоўныя творы, якім прысвечаны тэматычныя movabox, і іншыя выданні на беларускай мове. Усе кнігі пазначаць спецыяльнымі наклейкамі з паведамленнем пра праект і просьбамі вярнуць прачытаныя творы. Таксама чытачы атрымаюць магчымасць дадаваць на паліцы кнігі са сваёй хатняй бібліятэкі, каб у чытанне ўцягвалася ўсё больш і больш людзей».

**«Яшчэ адна адметнасць нашага часу — кліпавае мысленне моладзі і патрэба ў абавязковай візуалізацыі. Выдатна, што кніга пра Вырвіча і Лёдніка таксама набыла матэрыяльнае ўвасабленне».**

Праект доўжыцца 6 месяцаў, за гэты час будуць разыграныя movabox, прысвечаныя чатыром кнігам сучасных беларускіх аўтараў. Назвы наступных трох выданняў арганізатары пакуль трымаюць у сакрэце.

Дарэчы, movabox — не першы праект кампаніі velcom, накіраваны на папулярызацыю беларускай літаратуры і пашырэнне ўжывання беларускай мовы ў нашым грамадстве. Так, летась фестываль velcom-smartfilm быў прысвечаны буктрэйлерам, кароткім ролікам-рэкламам кнігі. Яшчэ адна маштабная ініцыятыва, якая рэалізуецца і сёння, — «чытаем па-беларуску з velcom». Яна накіраваная перш за ўсё на школьнікаў і прадугледжвае правядзенне ў розных гарадах і вёсках краіны адмысловых урокаў беларускай мовы і літаратуры, настаўнікамі на якіх становяцца вядомыя пісьменнікі, спартсмены.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*


Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
27 октября 2016
Красинский А.Д.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного
Общего собрания участников
СООО «ВильнюсСтрой»
от 12 октября 2016 года

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ тринадцатого выпуска**
**Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» г. Минск**

Внести в Проспект эмиссии жилищных облигаций тринадцатого выпуска следующие изменения:

1. в пункте 2.2:

1.1. в подпункте 2.2.1 слова «7 062 000 000 (семь миллиардов шестьдесят два миллиона) белорусских рублей» заменить словами «706 200 (семьсот шесть тысяч двести) белорусских рублей»;

1.2. в части первой подпункта 2.2.2 слова «6 600 000 (шесть миллионов шестьсот тысяч) белорусских рублей» заменить словами «660 (шестьсот шестьдесят) белорусских рублей»;

2. подпункт 2.4.1 пункта 2.4 изложить в следующей редакции:

«2.4.1. Исполнение обязательств по Облигациям обеспечивается поручительством следующих юридических лиц:

● Общества с ограниченной ответственностью «Термосталь» в сумме 198 000 (сто девяносто восемь тысяч) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 28 апреля 2016 года №1/П в редакции дополнительного соглашения от 12 октября 2016 года №1.

Место нахождения Общества с ограниченной ответственностью «Термосталь»: 222122, Минская область, Борисовский район, а/г Лошница, ул. Рабочая, 1; УНП 690658492.

Стоимость чистых активов Общества с ограниченной ответственностью «Термосталь» на 01.07.2016 составляет 865 952,53 (восемьсот шестьдесят пять тысяч девятьсот пятьдесят два) белорусских рубля 53 (пятьдесят три) копейки;

● Закрытого акционерного общества «РосЭнергоМаш» в сумме 508 200 (пятьсот восемь тысяч двести) белорусских рублей в соответствии с договором о предоставлении поручительства от 28 апреля 2016 года №2/П в редакции дополнительного соглашения от 12 октября 2016 года №1.

Место нахождения Закрытого акционерного общества «РосЭнергоМаш»: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, 7А, 1 этаж, каб. 65; УНП 191129754.

Стоимость чистых активов Закрытого акционерного общества «РосЭнергоМаш» на 01.07.2016 составляет 508 252,33 (пятьсот восемь тысяч двести пятьдесят два) белорусских рубля 33 (тридцать три) копейки.

По договорам о предоставлении поручительства поручители обязуются исполнить обязательства по Облигациям перед их владельцами в пределах суммы поручительства, предусмотренной договорами о предоставлении поручительства, в случае неисполнения или ненадлежащего исполнения данных обязательств Эмитентом.

Договоры о предоставлении поручительства вступают в силу с момента их подписания Эмитентом и поручителями и действуют в течение всего срока обращения Облигаций, а также в течение 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций. Действие договоров о предоставлении поручительства прекращается (в зависимости от того, какое событие (срок) наступит ранее) после исполнения обязательств по Облигациям (в том числе досрочного погашения всего выпуска Облигаций) либо по истечении 3 (трех) месяцев после окончания срока обращения Облигаций, если владельцы Облигаций не предъявят в указанный трехмесячный срок требований о выплате денежных средств по Облигациям к Эмитенту или поручителю.»;

3. пункт 2 части второй подпункта 4.2.5 пункта 4.2 изложить в следующей редакции:

«2. Обеспечение эмиссии тринадцатого выпуска Облигаций поручительством в соответствии с заключенными договором о предоставлении поручительства от 28 апреля 2016 года №1/П в редакции дополнительного соглашения от 12 октября 2016 года №1 с Обществом с ограниченной ответственностью «Термосталь» и договором о предоставлении поручительства от 28 апреля 2016 года №2/П в редакции дополнительного соглашения от 12 октября 2016 года №1 с Закрытым акционерным обществом «РосЭнергоМаш».».

ОТ ЭМИТЕНТА:
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская
ОТ ЛИЦ, ПРЕДОСТАВИВШИХ ОБЕСПЕЧЕНИЕ:
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ООО «Термосталь» Л.Б.Кочеткова
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ЗАО «РосЭнергоМаш» Н.В.Дортгольц
ОТ ПРОФУЧАСТНИКА:
Директор ЗАО «Генеральная система инвестиций» Н.Л.Черник

УНП 191434087

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды помещений РУП «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| **Наименование, местонахождение и характеристика объекта** | право заключения договора аренды помещения площадью 524,7 кв.м в здании вокзала станции Пинск (инв. № 130/С-30826) и места на фасаде здания ориентировочной площадью 0,6 кв.м по адресу: ул. Железнодорожная,19 в г. Пинске, *для оказания услуг общественного питания и размещения вывески* | право заключения договора аренды помещений общей площадью 468,1 м кв. на 1-м этаже здания вокзала (инв. № 100/С-47089) по адресу: пл. Привокзальная, 1 в г. Бресте, *для организации услуг общественного питания* | право заключения договора аренды помещений общей площадью 360,4 м кв. на 1-м этаже и в подвале здания багажного отделения (старое) (инв. № 100/С-47084) по адресу: пл. Привокзальная, 2А в г. Бресте, *для хранения продовольственных и непродовольственных товаров (за исключением взрывоопасных, легковоспламеняющихся и строительных материалов)* |
| **Балансодержатель** | «Брестская дистанция гражданских сооружений» УНП 200030555, 8-0162-26-28-42 | Вокзал станции Брест-Центральный УНП 200246556, 8-0162-26-35-31 | |
| **Начальная цена продажи (BYN)** | **1 783 рубля 98 копеек** | **1 591 руб. 54 коп.** | **1 225 руб. 36 коп.** |
| **Сумма задатка (руб.)** | 178 рублей | 159 рублей | 122 рубля |
| **Срок аренды** | **5 лет** | **5 лет** | **5 лет** |
| **Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы** | **3,0** | **2,0** | **3,0** |
| **Условия оплаты** | разовый платеж | разовый платеж | разовый платеж |
| **Размер штрафа, руб.** | 2100 | 2100 | 2100 |
| **Условия продажи** | аренда оборудования в количестве 27 единиц (сумма арендной платы в месяц 1 206 руб. 69 коп.), инвентаря в количестве 237 номенклатурных номеров (сумма арендной платы в месяц (договорная) 65 руб.), запрет на продажу после 23-00 слабоалкогольных напитков и пива | трудоустройство штата работников в количестве 35 человек; заключение договора аренды на оборудование в количестве 54 единицы (сумма арендной платы в месяц ориентировочно составит 3 658 белорусских рублей 13 копеек), инвентарь и хозяйственные принадлежности в количестве 81 номенклатурного номера (сумма арендной платы в месяц (договорная) составит 216 белорусских рублей; запрет на продажу после 22 ч. 00 мин слабоалкогольных напитков и пива | **без условий** |
| **Организатор аукционных торгов** | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. www.bgcn.by** | | |

ПРИМЕЧАНИЕ:
Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:
1. юридическим лицом - резидентом Республики Беларусь: копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом - нерезидентом Республики Беларусь: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем: копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя; копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом - копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.
При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица - доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом - документ, удостоверяющий личность.
Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в ф-ле № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.
Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.
Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

Аукцион состоится 29 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.
Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 31.10.2016 г. до 17.30 23.11.2016 г.
(перерыв с 13.00 до 14.00; выходной день: сб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.
Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. **www.bgcn.by; www.brest-region.gov.by; www.gki.gov.by**

7 декабря 2016 г. **ИЗВЕЩЕНИЕ** №17-А/2016

### о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка: г. Гомель | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Целевое назначение | Наличие ограничений | Срок аренды, (лет) | Начальная стоимость, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Расходы на подготовку докум-ции, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | район индивидуальной жилой застрой "Красный Маяк" (участок № 42 по генплану) | 340100000007005736 | 0,0871 | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | охранная зона сетей и сооружений канализации | 99 | 5 451 р. 76 коп. (54 517 632 р.) | 272 р. 59 коп. (2 725 882 р.) | 1 654 р. 14 коп. (16 541 400 р.) |
| 2 | район индивидуальной жилой застройки Романовичи (участок № 834 по генплану) | 340100000008003207 | 0,0855 | | охранная зона линий связи и радиофикации, сетей и сооружений канализации | 99 | 4 682 р. 66 коп. (46 826 640 р.) | 234 р. 13 коп. (2 341 332 р.) | 1 605 р. 95 коп. (16 059 500 р.) |
| 3 | в районе усадебной застройки Романовичи (позиция № 4 по генплану) | 340100000008003690 | 0,2117 | для размещения здания специализированного для общественного питания | Ограничений нет | 10 | 10 690 р. 69 коп. (106 906 885 р.) | 534 р. 53 коп. (5 345 344 р.) | 282 р. 32 коп. (2 823 210 р.) |
| 4 | ул. Лепешинского (район жилого дома № 161) | 340100000002003093 | 0,0120 | для эксплуатации и обслуживания торгового папильона | охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения | 5 | 811 р. 77 коп. (8 117 686 р.) | 40 р. 59 коп. (405 884 р.) | 2 162 р. 16 коп. (21 621 600 р.) |

1. Организатор аукциона – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).
2. Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» (г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. №2-14)
3. **Аукцион состоится 7 декабря 2016 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г.Гомель, ул.Советская, 16, каб. 115,** при наличии не менее двух участников на каждый лот. Если заявление на участие подано только одним гражданином, юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем, право аренды земельного участка предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.
4. К участию в аукционе допускаются граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», в указанные в извещении сроки, следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка за каждый лот в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа - Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа - оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указание транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка для участия в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).
Необходимые документы: 4.1 граждане - копию документа, содержащего их идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;
4.2 представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь - доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
4.3 идивидуальные предприниматели - копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования;
4.4 представители гражданина или индивидуального предпринимателя - нотариально удостоверенную доверенность;
4.5 представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
4.6 представители иностранного гражданина - легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.
4.7 при подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность и его копию.
5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.
6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».
7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 31 октября по 5 декабря 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00-13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14**
Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.00–20.00 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

## Объявление о торгах

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Изолированное помещение с инв.№200/D-91571, общей площадью 39 кв.м, стоимостью 9 500 бел. рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Знамя индустриализации» (УНП 300200360) |
| Местонахождение (адрес) имущества | г. Витебск, ул.Гагарина, 11Д-3 |
| Наличие обременений | нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | 21.11.2016 в 10.00 часов<br>г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб.1.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210015, г. Витебск, ул.Б.Хмельницкого,10/1.<br>Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович тел/факс. 8(0212)614018, 8(033)6879145 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО СБ «Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 15.00 часов 18.11.2016.<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | капитальное строение, инв. № 400/С-99960 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – баня), площадью 137,6 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, а.г. Путришки, ул. Коммунальная, 13. Составные части и принадлежности: сети электроснабжения, канализационная сеть. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | кадастровый номер 422000000009000162 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания бани), площадью 0,0900, расположенный по адресу: Гродненский р-н, а.г. Путришки, ул. Коммунальная, 13. |
| Начальная цена продажи | 45 240,00 р. (сорок пять тысяч двести сорок рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 2 262,00 р. (две тысячи двести шестьдесят два рубля) |
| Продавец | Учебно-опытный сельскохозяйственный производственный кооператив «Путришки», 231750, Гродненский р-н, а.г. Путришки, ул. Тарханова, 49, тел. 917-147 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел. 41-98-32 |
| Условия аукциона | Аукцион без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/сч для перечисления задатка | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 30 ноября 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)
Последний день приема заявлений – 24 ноября 2016 г. до 15.00**

*Телефоны для справок:45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/*

Усё пра Еву

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

# САМЫ ВАЖНЫ ДЗЕНЬ У ЖЫЦЦІ

## Восеньскае лірычнае



Восень — пара вясельляў. Можа, гэта і не канстатацыя факта, а ўсяго толькі стэрэатып мыслення і, так бы мовіць, сезонны штамп, але што з ім зробіш? Нават калі ты чвэрць стагоддзя знаходзішся ў шлюбе, восенню табе таксама думаецца пра вяселле. Дакладней, пра вяселлі. Пра ўсе вяселлі разам, адначасова. Яны ж, які б ні быў сезон, на вочы не-не ды і трапляюць. І што тады?..

Я не ведаю, якія думкі ўзнікаюць у іншых назіральнікаў за чужымі самымі важнымі днямі ў жыцці, а ў мяне кожны позірк на шчаслівую маладую пару суправаджаецца нечым такім, што апісаць немагчыма. Але я паспрабую.

Кожны раз, калі назіраеш за вяселлем, адчуваеш сябе замяшанай у ім. Быццам цябе асабіста прызначылі адказнай за лёсы ўсіх маладых у свеце. За шчаслівыя лёсы. І табе жыццёва неабходна, каб ніводная з пар не пасварылася праз месяц, не расчаравалася праз год і не думала пра расстанне ўвогуле. Як, скажы, табе гэта зрабіць? Якімі душэўнымі намаганнямі здзейсніць? Якімі крыламі абараніць усіх? Якую ахвяру прынесці?..

Ты глядзіш на жаніха і нявесту, якія перакананы ў тым, што цяпер яны адно цэлае, якіх запэўніла ў гэтым выдадзенае ў загсе пасведчанне, якіх з усіх бакоў наперабой называюць ужо сям'ёй — і не бачыш, як ні стараешся, ні гэтага адзінага цэлага, ні, тым больш, сям'і. Перад вачыма на фоне чалавечай разнастайнасці — проста два прыгожыя стварэнні, якія толькі што, атрымліваючы згаданае пасведчанне, падпісаліся абараняць адно аднаго ад нягод. Табе здаецца, што варта выпусціць іх з-пад увагі — і яны пасварацца, пасля расчаруюцца, пасля пачнуць разважаць пра расстанне. Канечне, ты выпускаеш іх з-пад увагі — яе ім хапае і без цябе. І вось мінае час — яны ўжо сварацца. Нехта ўжо і расчараваўся. Некаторыя думаюць пра расстанне.

І табе, каб пазбавіцца пачуцця асабістай віны за іх сваркі і расчараванні, застаецца толькі распасцерці крылы над тым адзіным, за што ты па-сапраўднаму адказная, — бараніць ад сварак і расстання СВАЁ. Бо ты ўжо ведаеш вагу кожнай сваркі, сто разоў прымярала расчараванне і кожны раз спыняла выбар на надзеі, бо расстання для цябе (можа, адзінай такой у свеце) не існуе.

Ты, канечне, добра памятаеш, калі вы сталі сям'ёй. Не раней, чым тады, калі ён нарэшце склеіў знешнюю рамку тваіх самых любімых пяльцаў (праз пяць гадоў пасля іх паломкі) і роўна ў той дзень, калі ты, стаміўшыся чакаць, выкінула ў смецце... рамку ўнутраную — як ужо непатрэбную. Але ты распасцерла крылы і сказала яму ахвярнае «дзякуй».

Сем'і, ты ведаеш, не спускаюцца з ганка загса ў акружэнні сяброў і кветак. Але яны ўзыходзяць, бывае, на гэты ганак, каб спусціцца чужымі людзьмі. Скажаш, яны і былі чужымі? Хто ведае? Можа, проста не было ў яе любімых пяльцаў?

■ Шукаю цябе...

# У ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ

**«Ева» працягвае складаць своеасаблівы даведнік для тых, хто шукае ідэальнага спадарожніка жыцця. На гэты раз знаёміцца з патэнцыйнымі жаніхамі наш карэспандэнт, авантурыстка з зялёнашэрымі вачыма, спрабавала ў грамадскім транспарце.**

***

— Прабачце, калі ласка, за маю нязграбнасць, — прымаючы 7-сантыметровую «шпільку» з замшавых туфляў мужчыны ў строгім касцюме, — пачала апраўдвацца я. — Дзень неяк з самага ранку не задаўся.

— Нічога, крэм для абутку ў мяне ёсць, — усміхаючыся, адказаў патэнцыйны жаніх.

Мы з кандыдатам выйшлі на адной станцыі метро. Мужчына хвілін пяць ішоў за мной ззаду, а потым дагнаў і ўпэўнена заявіў:

— Я ж ведаю, што вы гэта наўмысна зрабілі. На абцасах вы трымаецеся ўпэўнена, цягнік рухаўся без рэзкіх прыпынкаў, а свабодных поручняў, каб трымацца, было дастаткова.

Да такога я не падрыхтавалася. Пра тое, што ў метро не ездзяць прынцы, я ведала, а вось аб тым, што там можна сустрэць Шэрлака Холмса, нават і не здагадвалася...

— А вы кемлівы, — падхапіўваю размову я. — Значыць, я нават вас не памылілася.

Кампліment Міхаілу спадабаўся, і праз пару хвілін я ўжо дыктавала свой нумар тэлефона новаму знаёмаму.

***

«Сапраўдны мужчына запраграмаваны дапамагаць і забяспечваць, — узгадала я словы сяброўкі, седзячы ў амаль пустым вячэрнім трамваі. — Ён літаральна чакае магчымасці паказаць сваю карыснасць, але асцерагаецца, што табе ўжо дапамагае хтосьці іншы, або ўвогуле ты — заўзятая феміністка». Я вырашыла праверыць тэорыю Кацькі, якая, дарэчы, замужам (!).

— Малады чалавек, прабачце, можна папрасіць Вас зачыніць акно, — звярнулася я да хлопца ў чырвонай куртцы.

Адказу не было. Я паўтарыла просьбу — ніякай рэакцыі. «Вось так, Соня, відаць, справа не ў метадах, а ў тым, хто іх прымяняе», — з расчараваннем думала пра сябе. У гэтыя секунды да акна падышоў высокі бландзін і выканаў маё пажаданне.



Пасля шчырай падзякі (быццам ён выратаваў чалавечае жыццё!) «джын» сеў побач. Не ведаю, ці сапраўды яму трэба было ў той жа гандлёвы цэнтр, што і мне, але мы выйшлі на адным прыпынку і пасля шопінгу нацэліліся на каву. «Метад Каці ўсё ж такі працуе, — разважала я, ідучы дадому. — Але адзіны пункт у гэты пастулат я дадала б: падзякаваўшы мужчыну за дапамогу, не перастаравайце ўсміхацца і падтрымліваць кантакт. Дайце кандыдату магчымасць працягнуць размову, а не проста пайсці з пачуццём выкананага абавязку».

***

Пра тое, чаму мужчына ў чырвоным нават не паглядзеў на мяне, я здагадалася праз дзень, калі ехала ў тралейбусе і сустрэла падобны экземпляр у шэрым паліто. Апошні на працягу дзесяці хвілін усемагчымых знакаў зацікаўленасці з майго боку нават і брывом не павёў! «Куды там, якая дзяўчына, калі на тэлефон новую гульню спампаваў?!» — злавалася я. — Гаджэт — сапернік моцны», — прызнала з жалем. Але тут мая сяброўка прапанавала варыянт, як віртуальнага героя зрабіць рэальным. «Трэба даць яму магчымасць праявіць сябе, — патлумачыла Ксюша. — Для гэтага мы з табой пачынаем дыскутаваць для выгляду, а потым проста прыцягваем патэнцыйнага жаніха ў арбітры».

— Прабачце, мы выбіраем падарунак для сябра і не можам вырашыць: для мужчыны лепш андроід ці айфон?

Некалькі парад ад «прафесіянала» наконт таго, які ноўтбук мне лепш выбраць для работы, патэнцыйны жаніх у паліто прапанаваў даць заўтра. Ёсць!

***

У аўторак пасля цяжкага працоўнага дня знаёміцца з «батанам», што сядзеў у тралейбусе насупраць, сіл не было, але дзеля чысціні эксперыменту я прыпудрыла носік і звярнулася да кандыдата:

— Ой, а мне гэты раман, — паказваючы на кнігу ў руках візаві, — даўно раілі пачытаць, — радасна ўскрыкнула я. — А вам як? Падабаецца?

Хлопец падняў на мяне свае блакітныя вочы, сцвярджальна матнуў галавой і зноў паглыбіўся ў чытанне. «Відаць, твор сапраўды цікавы. Трэба запомніць назву», — «перавярвала» яго паводзіны ў галаве.

Без улову засталася і ў серады.

— Не падкажаце, на якой станцыі лепш выйсці, каб у ЦУМ трапіць? — запытала я ў мужчыны ў стыльных акулярах.

— Я не мясцовы, — суха адказаў кандыдат. — Увогуле для такіх, як вы, схему ліній метро намалявалі, — дадаў негаваркі суразмоўца.

**▸ Месца:**
метро, аўтобус, тралейбус, маршрутка.

**▸ Уваход:**
платны (ад 50 кап.).

**▸ Дрэс-код:**
штосьці яркае, стыльнае і камфортнае.

**▸ Абавязкова для выканання:**
жаноцкія паводзіны ў любой сітуацыі, праніклівы погляд і ўсмешка, усмешка, усмешка...

**▸ Варта пазбягаць:**
мужчын з бацькамі, сяброўкамі, жонкамі, дзецьмі

***

Наўрад ці вось гэты прыгажун з карымі вачыма палезе ў канец салона дзеля знаёмства са мной. Таму скарацiць адлегласць паміж мной і нерашучым шатэнам на пярэднім сядзенні маршруткі я вырашыла сама.

— Можна, я падсяду да вас, — адсюль горад лепш відаць, — пачала я. — Некалькі гадоў жыла за мяжой, за гэты час Мінск так змяніўся...

Далей я даведалася, што Віця скончыў хімічны факультэт, але па гісторыі ў яго заўсёды было «выдатна», і ён з радасцю можа стаць маім гідам.

***

У нядзелю, вяртаючыся з басейна, я «злавіла» ў метро да болю знаёмы водар парфуму: перада мною стаяў Сашка-барадач з курсаў па англійскай мове. Ніводны са спосабаў знаёмства выкарыстоўваць, зразумела, не прыйшлося. Тут ужо патрэбныя іншыя хітрыкі... Хто б навучыў, як лепш паводзіць сябе са старым знаёмым, да якога ты неабыякавая?..

**Сафія ГРОМАВА.**
*gromava@zviazda.by*

**ВЫВАДЫ**

- Пазнаёміцца рэальна ў любым грамадскім транспарце. Галоўнае — даць зразумець мужчыне, што вы таксама ў гэтым зацікаўлены.
- Паказваць, што вам патрэбна дапамога ці парада, трэба далікатна, каб не напалохаць таго, хто спадабаўся, не прыцягнуць непатрэбную ўвагу астатніх.
- Шукаць суджанага ў трамваі, аўтобусе, метро лепей з панядзелка па пятніцу днём.
- Будзьце гатовы да таго, што грамадскі транспарт можа прапанаваць у якасці кандыдата і дворніка з суседняй вуліцы, і бізнесмена, які пакінуў сваё аўто з-за катастрафічных пробак, і старога добрага знаёмага.

■ Гісторыі з канверта

# БЯЛЯВАЯ, ЧАРНЯВАЯ, КУЧАРАВАЯ...

Пачуў нядаўна папулярную песню ў выкананні «Беларускіх песняроў» пра хлопца, які сустракаўся з тройкай дзяўчат. Падумаў — актуальна. Праўда, я ўжо даўно не хлопец, а мужчына ва ўзросце каля 40 гадоў.

Бялявая мне вельмі падабаецца. Прыгожая, дагледжаная сучасная жанчына, з якой не сорамна выйсці ў людзі. Перыядычна мы дзелім з ёю ложак. Ну як вам растлумачыць? У яе няма мужа. Думаю, што і пастаяннага партнёра няма...

Можа, таму, што наконт інтыму бландзінка, можна сказаць, лянівая. Ну бываюць жанчыны, якім здаецца, што сам факт партнёрства з імі — ужо «падарунак нябёсаў».

З брунеткай пазнаёміўся гадоў 7 таму на адпаведным сайце. Падчас непрацяглай асабістай сустрэчы высветлілася, што яна спадзяецца на матэрыяльную падтрымку. Нехта «ўбіў» ёй у галаву, што мужчына абавязаны дапамагаць грашыма.

Праз некаторы час зноў прапанавала сустрэцца. Аказалася жанчынай з фантазіяй. У сексе з ёй не сумна...

Рыжая, як кажуць, «гатовая на ўсё». Грошай не патрабуе. Пасядзець з ёй за сталом, як той казаў, за «чаркай і скваркай» — суцэльная задавальненне. Ёсць пра што пагутарыць, шмат агульных тэм для размоў, як і поглядаў на жыццё.

Дык, скажаце, і сустракаўся б толькі з ёю? Тым больш, што агучыла ідэю «свайго назаўсёды забыць», а мяне — кахаць да труны.

Але... не грэе. Пацалункі «не тыя», як і асалода ад інтыму. Ды яшчэ напружвае яе «манера» ўпрошваць прыйсці да яе, калі мне гэта не зручна: пад ноч або калі хочацца пабыць аднаму. Ды і хатнія жывёлы яе... Ну, не падабаецца мне прымаць душ, калі побач «заапарк»... Колькі разоў даваў сабе слова больш не сустракацца з ёю, аднак... раблю наадварот.

У фільме «Жаніцьба» галоўная гераіня ўголас разважала наконт таго, як было б здорава найлепшыя якасці патэнцыяльных жаніхоў «аб'яднаць». Пра нос, характар і іншае... Я падумаў пра аналагічнае. У прыватнасці, калі б прыгажосць бландзінкі, ідэальны стан яе скуры ішлі ў «камплекце» з формамі брунеткі і яе схільнасцю да гульняў у ложку... Ды каб да гэтага дадаць адэкватнасць і дружалюбнасць кучаравай, яе захапленне ад сустрэч са мной... Быў бы ідэальны варыянт.

Думаю, мужыкі з мяне будуць смяяцца. У прыватнасці, чаго перажываць? Добра ж уладкаваўся! Жарты жартамі, але калі большая палова жыцця пражытая, напэўна, трэба ўжо і вызначыцца.

Шчыра радуюся, калі сярод людзей на вуліцы бачу сем'і з дзецьмі. Ён, яна і малыя. І дарослыя цалуюцца, як у першы раз. Напэўна, гэта і ёсць шчасце. Якое дадзена не ўсім...

**Сяргей**, *Магілёў*.

■ Паміж намі

# ЛАВІСЯ, РЫБКА!..



Фота БЕЛТА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

ІРЫНЕ Андрэеўне «за шэсцьдзясят». Узрост сталасці і спакою. Аб'ектыўна — так, але не ў дачыненні да гэтай жанчыны. Сама прызнаецца: «Эх, каб не хваробы...» Нягледзячы на невялікую пенсію, яна ніколі не забываецца пра фарбу для валасоў і губную памаду. Адкрывае скрынку і з гонарам дэманструе з дзясятак футлярчыкаў: «Вунь у мяне іх колькі, ніяк не магу патрэбны тон падабраць, ведаеш, такі... колеру спелай вішні...»

Яе жыццё можна назваць вясёлым, але ніяк не лёгкім. Такое вось спалучэнне. Муж памёр рана — нават да пяцідзесяці не дацягнуў. Быццам адчуў сваю непатрэбнасць гэтай жанчыне і гэтаму свету. Ён заўсёды быў пры ёй, як шчаня на ланцужку. З дому, акрамя работы, — ні на крок. Ляжаў на канапе, чытаў сваю «газетку» ці выходзіў на двор пакурыць ды згуляць партыю-другую ў даміно з суседам. Знаёмыя мужыкі з яго заўсёды кпілі: маўляў, жонку вартуе.

Аднак не ўкаравуліў. Сваё першае і адзінае дзіця Ірына Андрэеўна нарадзіла ад іншага мужчыны. У Пятра Іванавіча за год да таго пачаліся сур'ёзныя праблемы са здароўем, ён доўга ляжаў у бальніцы, потым — лячыўся ў санаторыі, а вярнуўшыся, знайшоў жонку ў «цікавым становішчы»... Аборты тады былі не ў пашане, ды і Ірына Андрэеўна баялася аперацыі больш, чым мужавага пакарання. Аднак ніякае пакаранне яе не спасцігла: муж успрыняў навіну надзіва спакойна... А калі нарадзілася дзяўчынка, сам выбраў ёй імя — Тамарка, Томачка...

Ірына Андрэеўна нейкі час адчувала няёмкасць з-за сваёй віны. Перастала бываць у кампаніях, наведваць незамужніх сябровак, хадзіць на ўсялякія «мерапрыемствы»... Аднак хапіла яе ненадоўга. То дзень нараджэння загадчыцы магазіна адзначалі, то ў грузчыка сын ажаніўся, то ў спаборніцтвах паміж гандлёвымі пунктамі прызавое месца занялі... Пётр Іванавіч забіраў Тамарку з дзіцячага садка, сядзеў каля малой, калі яна хварэла, гатаваў сняданак і вячэру... Пазней хадзіў на ўсе бацькоўскія сходы, распісваўся ў дзённіку, дапамагаў рашаць задачкі і праводзіў «выхаваўчую работу», калі дадому занадта часта званілі ці прыходзілі хлопчыкі. Іх было шмат, і яны ўвесь час мяняліся. Томачка вырасла не тое каб пісанай прыгажуняй — хутчэй віднай, статнай, словам, у маму. Праўда, валасы былі не мамінымі — ад доўгіх, густых светла-русых хваляў, якія спускаліся па плячах ледзь не да пояса, сапраўды нельга было вачэй адвесці. І кожны раз бацька з маці сварыліся з-за іх: Пётр Іванавіч загадваў заплятаць валасы ў косы, а Ірына Андрэеўна лічыла, што дзяўчына не павінна хаваць такую прыгажосць...

Калі Тамарцы споўнілася сямнаццаць, тата памёр, не дажыўшы крыху да яе выпускнога балю. Перад Ірынай Андрэеўнай паўстала пытанне аб уладкаванні дачкі ў якую-небудзь навучальную ўстанову. Аб вышэйшай адукацыі не магло быць і размовы — за апошні год па некаторых прадметах Тамара з'ехала да троек, але па-ранейшаму больш часу праводзіла перад люстэркам, чым за пісьмовым сталом.

***

Мама купіла даведнік для паступаючых, і ўдзвюх з дачкой яны выбралі фізкультурны тэхнікум у абласным цэнтры. Установа адпавядала многім патрабаванням: там быў не вельмі высокі прахадны бал і не надта складаная праграма. Тым больш, што Тамарка заўсёды любіла баскетбол і ўдзельнічала ва ўсіх школьных спартакіядах.

Пасля першай сесіі дачка патэлефанавала дадому і папярэдзіла, што прыедзе не адна. Ірына Андрэеўна ўвесь дзень насілася па магазінах, каб не ўдарыць тварам у гразь перад патэнцыяльным зяцем — дзякуй богу, калегі-прадаўцы дапамаглі чым маглі... «Зяць» пераступіў парог — і ў Ірыны Андрэеўны апусціліся рукі. Худзенькі, нязграбны, бледны... «Як такіх у фізкультурныя ўстановы прымаюць?» — падумала тады. Але не выганяць жа было... Накарміла, напаіла. Спаць паклала ў сваім пакоі. А Тамарцы палову ночы «ўпраўляла» мазгі: «Ну куды ты глядзела? І выгляду ніякага, і бацькі абы-хто, і ў кішэнях вецер гуляе... Шукай каго-небудзь іншага, а студэнціка-замухрышку кідай!»

Летам праўдамі і няпраўдамі Ірына Андрэеўна дастала дачцэ пуцёўку ў санаторый — дапамагло блізкае знаёмства з выканкамаўскім шафёрам, які вазіў «самога»...

З санаторыя Тома вярнулася сумнай і разгубленай. Жаночая інтуіцыя падказала Ірыне Андрэеўне, што дачка закахалася, і не на жарт. Аднак на шчырую размову з маці яна не ішла, на пытанні не адказвала, і Ірына Андрэеўна махнула на Томку рукой, упэўненая, што на гэты раз у дачкі хопіць розуму не разменьвацца на «драбязу». Да таго ж, шмат часу і ўвагі аднімала ўласнае асабістае жыццё — «афіцыйны» тэрмін жалобы па мужу скончыўся, і Ірына Андрэеўна, маладая яшчэ жанчына, пачала з падвоенай энергіяй навёрстваць упушчанае...

Нішто не прадказвала бяду. У час чарговага прыезду дачкі яны міла пагаварылі, пажартавалі. Тамара нарэшце раскрыла сваю тайну — так, ёсць паклоннік, стаматолаг, на пятнаццаць гадоў старэйшы, разведзены. Кватэру з жонкай яны пакуль не размянялі, але гэта — усяго толькі справа часу... «Дай бог, дай бог», — паўтарала Ірына Андрэеўна, праводзячы Томку на аўтастанцыю. Вярнуўшыся, яна раптам успомніла пра неабходны пасаг і пайшла ў пакой дачкі, каб перагледзець падушкі і коўдры... Адчыніла шафу, выцягнула стос пасцельнай бялізны... і аслупянела: за бялізнай у глыбіні шафы роўненькімі стосікамі ляжалі дзіцячыя пялёнкі і паўзункі... Ірына Андрэеўна кінулася на аўтастанцыю.

Тома прызналася: так, цяжарная, але не можа з упэўненасцю сказаць ад каго. Стаматолаг, з якім пазнаёміліся ў санаторыі, аказаўся не разведзены. Значыць, як сур'ёзная «кандыдатура» адпадае. Быў яшчэ выкладчык тэхнікума — таксама жанаты. Ну, і нарэшце той хлопчык, з якім Тамара прыязджала дадому пасля першай сесіі. «Давай сюды хлопчыка!» — загадала Ірына Андрэеўна.

Сяргей ад бацькоўства не адмаўляўся. Нават узрадаваўся, што ўсё так атрымалася. Ён і не спадзяваўся, што Тамарка пагодзіцца калі-небудзь стаць яго жонкай.

Вяселле было вельмі сціплым — прысутнічала толькі блізкая радня. А праз чатыры месяцы нарадзілася Танечка...

***

Для сямейнага жыцця «хлопчык» аказаўся сапраўдным скарбам. Не стагнаў, калі даводзілася ўставаць сярод ночы да дзіцяці ці вазіць малую па ўрачах. Яшчэ не скончыўшы тэхнікум, пайшоў на таварную станцыю разгружаць вагоны. І пазней, калі ўжо адвучыўся ў інстытуце і ўладкаваўся працаваць трэнерам па дзюдо, калі пачаліся паездкі на зборы і спаборніцтвы за межы краіны, Сяргей увесь час спяшаўся дадому, да жонкі, да Танечкі. Яго чакалі з нецярпеннем — тата ніколі не вяртаўся без падарункаў. Тамара так і казала падчас сустрэчы: «Наш «кашалёк» прыехаў!»

Танечка расла падобнай да мамы — гэтакая ж статная фігурка і доўгія ножкі, гэткія ж «русалчыны» валасы і вялікія наіўныя вочы... На канікулы яе адпраўлялі да бабулі, і тая нарадавацца не магла на ўнучку: сама яе прычэсвала раніцай, карміла ўсялякімі прысмакамі і, як некалі дачку, вучыла розуму: маўляў, калі выглядаеш, як прынцэса, дык і шукаць павінна толькі прынца... А ўсялякія там худасочныя аднакласнікі абыдуцца. «Бабуля, я на дыскатэку!» — паведамляла Танечка і... знікала да раніцы. Спаць Ірына Андрэеўна не клалася — усё чакала, выглядала ў акно, з кім вернецца ўнучка. І аднойчы дачакалася — Танечку прывёў дадому... міліцыянер. Зарумяную, у парванай кофтачцы. Аказваецца, з-за яе, Танечкі, нейкія мужчыны ўчынілі ў гасцініцы бойку. Ірына Андрэеўна вушам не паверыла: якая гасцініца?! Накінулася на ўнучку: «Ты што, у шаснаццаць гадоў нарадзіць захацела?» Думала напалохаць. Танечка ж спакойна дастала з кішэні джынсавай курткі пачак прэзерватываў і пакруціла ім перад бабуліным носам: «А гэта навошта?»

Калі праз некалькі дзён прыехала Тамара, Ірына Андрэеўна ўздыхнула з палёгкай. Зараз жа ўсё ёй расказала, але дачка толькі ўсміхнулася: «Ад гэтага, мама, яшчэ ніводная жанчына не памерла. Цяпер уся моладзь такая. І час такі». Ірына Андрэеўна не знайшла што адказаць.

...Пасля заканчэння школы Танечка не захацела больш вучыцца. Яе і так, без усякай вучобы, прынялі ў начны клуб афіцыянткай. Праўда, плацілі не шмат, але выратоўвалі наведвальнікі — давалі на чай... Пад раніцу хто-небудзь са знаёмых адвозіў яе дадому — «чаявых» цалкам хапала, каб здымаць асобную кватэру.

Тамара не пыталася, адкуль у дачкі новы мабільны тэлефон або гадзіннічак з кавалачкамі каштоўных камянёў замест лічбаў на цыферблаце. Яна па-ранейшаму была ўпэўнена, што ад гэтага «не паміраюць».

Потым Танечку звольнілі за прафнепрыгоднасць — аблічыла кліента на непрыстойна вялікую суму.

Паўгода яна нікуды не магла толкам уладкавацца — то спрабавала сябе ў ролі рэкламнага агента, то гандлявала касметыкай, то падпрацоўвала ў ветлячэбніцы... Пературбацыі і хваляванні не пайшлі на карысць — Танечка раздалася ў плячах і таліі, абрэзала доўгія валасы, перафарбавалася ў брунэтку. І ўжо ў такім выглядзе вярнулася на першапачатковае месца працы, праўда, не афіцыянткай, а прыбіральшчыцай. Але таксама начной. Дадому яе ўжо ніхто не падвозіў, таму часта прыходзілася мерзнуць раніцай на прыпынку, чакаючы першы аўтобус... Праўда, адзін пастаянны «кліент», мужчына ва ўзросце, зваў Танечку замуж, але яна не пайшла. Маці сказала, што гэта «дробная рыбка», і Таня пагадзілася. Ёй жа ўсяго дваццаць два — усё самае лепшае яшчэ наперадзе...

**Ала БЫВАЛАВА** ■

# «Адшыць» паклонніка раз і назаўсёды



**Адчапіцца ад абрыдлага вам бойфрэнда не так і складана — варта толькі праявіць крыху кемлівасці і артыстызму. І... выбраць правільную тактыку.**

## «Міс Неадэкватнасць»

Дзівацтвы і непрадказальнасць жанчыны нічога, акрамя забабоннага жаху, у мужчын не выклікаюць. Таму смела трымайцеся прынцыпу «Не чакайце дзіва — дзівачце самі»: навучыцеся вычварным словам і жэстам, дэманструйце недарэчныя эмоцыі. Напрыклад, гучна рагачыце, калі кавалер расказвае вам пра смерць любімага коціка. Альбо захапіцеся эзатэрыкай і стамляйце яго штодзённым гараскопам або раскладаннем карт таро. А яшчэ вазьміце за правіла тэлефанаваць «каханаму» сярод ночы з просьбай прадэкламаваць што-небудзь з творчасці, скажам, Іосіфа Бродскага. І абавязкова дапоўніце свой вобраз гардэробам а-ля гарадская вар'ятка.

**ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ?** ***Мужчына імкнецца да такіх стасункаў, якія б ураўнаважвалі яго жыццё, давалі магчымасць чэрпаць у іх рэсурсы. А калі з жанчынай не ведаеш, чаго чакаць, — гэта напружвае.***

## «Атэла ў спадніцы»

Галоўны прынцып гэтай стратэгіі — татальны кантроль над жыццём мужчыны. Раўнуйце яго да ўсіх прадстаўніц жаночага полу, якія маюць да яго хоць нейкае дачыненне, — да сястры, калег, прадаўшчыцы ў краме і да т.п. Тэлефануйце яму кожныя 15 хвілін і патрабуйце даць справаздачу, дзе ён і з кім. Штодня праверайце ўсе яго акаўнты ў сацсетках і, вядома, SMS! Прычым кожны раз настойвайце на тлумачэннях у сувязі з усімі выяўленымі там фактамі — дададзенымі сябрамі, фотаздымкамі і інш.

**ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ?** ***У кожнага чалавека павінна быць права на асабістую прастору. А бесперапынныя рэўнасць, пастаянны кантроль, забарона на сустрэчы з сябрамі «забіваюць» нават самыя моцныя пачуцці.***

## «Мамачка»

Мужчынам, безумоўна, падабаецца клопат пра іх, але да таго часу, пакуль ён не перарастае ў звышапеку. Таму ваша мэта — стаць другой маці для свайго паклонніка. Нястомна завіхайцеся на кухні, гатуючы для яго розныя стравы. А калі раптам ён скажа, што не галодны, страшна пакрыўдзіцеся! Дакучліва цікаўцеся станам яго здароўя: ці не схуднеў ён; чаму такі бледны; ці ўсё ў парадку з кішэчнікам... Пры няназначаным скарзе бойфрэнда на недамаганне адразу з заклапочаным выглядам бяжыце ў аптэку — яго трэба ратаваць!

**ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ?** ***«Жанчына-маці» заўсёды ставіць мужчыну ў зневажальнае становішча маленькага бездапаможнага дзіцяці. І пры такім раскладзе ў яго проста атрафіруецца любая цяга да яе.***

## «Свой хлопец»

У гэтым выпадку вам варта пазбавіць сябе якой бы там ні было жаноцкасці і сексуальнасці. Насіце мешкаватае адзенне, забудзьцеся пра макіяж. А сваю раптоўную «змену» растлумачце тым, што не жадаеце марнаваць час на ўсялякае глупства.

Хадзіце разам з «каханым» і яго сябрамі на спартыўныя матчы і ў клубы. І адрывайцеся там на роўных з усімі.

**ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ?** ***У такіх стасунках сціраюцца ўсе палавыя адрозненні. Апроч таго, падобная «аголенасць» у бытавым плане пазбаўляе жанчыну загадкі, чароўнасці. Мужчына пачынае ўспрымаць яе як сябра або суседку па кватэры.***

## «Меркантыльная блудніца»

Гэта толькі ў эратычных фільмах мужчыны любяць распусных дзяўчат у латэксе, а на справе такія дамы адштурхоўваюць іх не менш, чым мужчынападобныя. Таму старайцеся адзявацца як мага больш вульгарна: чырвоная памада, глыбокае дэкальтэ, калготкі ў сетачку і лакавыя батфорты — хай усяго будзе шмат!

Пры гэтым падкрэслівайце, што ў вас у прыярытэце толькі заможныя паклоннікі, таму і яму ндрэнна было б раскашэліцца.

**ЯК ГЭТА ДЗЕЙНІЧАЕ?** ***У сур'ёзных адносінах мужчыну ніколі не задаволіць той факт, што ён усяго толькі перавалачны пункт, які, да таго ж, выкарыстоўваюць.***

Калі ж вам трапіўся зусім ужо «моцны арэшак» і ніводны з прапанаваных спосабаў не дзейнічае, можа, варта прыгледзецца да яго лепш? Раптам гэта тое самае, сапраўднае каханне?

**Вера ФЕМІНА.**

## Уладзімір КАРЫЗНА:

Асоба

# «ДОБРАЯ МУЗЫКА ВЫХОЎВАЕ ЧАЛАВЕКА»



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Аўтар больш як сотні песень, вядомы кампазітар Уладзімір Карызна ўжо амаль тры дзесяцігоддзі вучыць маладых людзей выканальніцкаму і сцэнічнаму майстэрству ў студыі «Салаўіная калыска».
А яшчэ Уладзімір Уладзіміравіч — прадстаўнік знакамітай творчай дынастыі. Яго бацька, паэт Уладзімір Іванавіч — аўтар многіх выдатных твораў, у тым ліку слоў Дзяржаўнага гімна Беларусі.
А сын Іван — славуты ва ўсім свеце віяланчэліст, выпускнік Парыжскай кансерваторыі і аспірантуры, лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў.
Пра ўплыў песні на выхаванне асобы, важнасць падтрымкі таленавітых выканаўцаў і сакрэты напісання шлягера — наша гутарка з Уладзімірам КАРЫЗНАМ.**

***— Мы часам прыводзім нейкую класіфікацыю песень: народная, бардаўская, папулярная, прафесійная. Менавіта ў галіне напісання апошніх вы і працуеце шмат гадоў. Але калі акрэсліць дакладна, якім крытэрыям павінна адпавядаць песня, каб лічыцца прафесійнай?***

— Тут не маецца на ўвазе прыналежнасць аўтараў да творчых саюзаў. Але кампазітар павінен ведаць ноты, інакш музыку пісаць немагчыма. Таксама на ўзроўні павінны быць і вершы, каб не было памылак у кожным радку. Бардаўская песня — гэта выдатна, але прафесійная стаіць на больш высокім узроўні, яе стварэнне патрабуе, каб аўтар ведаў асновы гармоніі, поліфаніі, валодаў прафесійнымі прыёмамі напісання музыкі. Кампазітар — чалавек, які ведае не толькі песенны жанр, ён ведае таксама і асновы класічнай музыкі — оперы, балета, сімфоніі. Я ўсё жыццё пішу песні, але вельмі люблю і харавую музыку, якая па сутнасці — таксама спеў і таксама будзіць душы людзей, але робіць гэта на зусім іншым узроўні. Я лічу, калі чалавек ходзіць на канцэрты класічнай музыкі, слухае хор, гэта яго ўзвышае. Ёсць нават такі прыклад: я неяк прачытаў, што ў Расіі сярод падлеткаў, якія знаходзяцца ў калоніях, няма ніводнага, хто скончыў музычную школу. Эстэтычнае выхаванне ўплывае і на паводзіны чалавека ў грамадстве.

***— А якія ў вас любімыя паэты, на чые вершы песні пішуцца найлепш?***

— Перш за ўсё — Максім Багдановіч. Маім першым сур'ёзным творам быў харавы цыкл на яго вершы. Гэта недасягальны паэт. Таксама вельмі люблю вершы Янкі Купалы. Але большасць маіх вакальна-харавых, песенных твораў напісана на вершы майго бацькі, Уладзіміра Карызны. Гэта чалавек, які вельмі дасканала адчувае слова, якое потым добра кладзецца на музыку. Бо не кожны верш можа стаць песняй, не кожная фраза, сказ кладуцца на музыку. Таксама вельмі люблю паэзію Сяргея Ясеніна, Аляксандра Пушкіна.

***— Ёсць песні, якімі вы асабліва ганарыцеся?***

— Я кажу так: нейкія больш удалыя, а нейкія — менш. А любімыя вызначыць цяжка. Вось атрымалася песня, і падаецца, што яна абавязкова павінна стаць шлягерам. Але час ідзе — а шлягерам твор не назавеш. І наадварот, песня, якой не ўдзяляеш асаблівай увагі, набывае неверагодную папулярнасць. Магу нават прыклад прывесці. На «Белую яблыню», якую цяпер выконвае Валянціна Альшанская, я не ўскладаў напачатку вялікіх надзей. А яна часта гучыць па радыё па заяўках слухачоў. Цяжка прадказаць дакладны лёс песні.

***— Ад чаго залежыць, ці стане песня шлягерам? Ёсць сакрэт?***

— Думаю, перадусім гэта залежыць ад таленту аўтара, яго прафесіяналізму. Таксама важную ролю адыгрывае выканаўца. Калі ён падыходзіць песні — гэта дае вялікі працэнт поспеху. Таксама не на апошнім месцы і папулярызацыя. Якая б добрая песня ні была — яна не набудзе папулярнасці, калі яе ніхто не чуе. Бывае, што яе трэба расслухаць, бо пры першым праслухоўванні твор не напоўніцу спрацоўвае. Прывяду класічны прыклад: калі ў савецкія часы яшчэ працавалі камісіі на радыё, якія вырашалі, што пойдзе ў эфір, то песню «Дзень Перамогі» Давіда Тухманава з першага разу не прынялі. А сёння — гэта проста класіка жанру!

***— Калі пішаце песню, бачыце адразу чалавека, які будзе яе выконваць на сцэне?***

— Часцей за ўсё так. Раней амаль на сто працэнтаў я адразу бачыў, хто будзе выконваць песню, для каго пішу. Тут таксама варта ўлічваць асаблівасці: у кожнага выканаўцы свой дыяпазон голасу, тэмбр. Цяпер працэнт «траплянння» зменшыўся, бо на эстрадзе вельмі мала асоб, якія маюць індывідуальны стыль выканання. Усё больш спевакоў паўтараюць адзін аднаго. Калі мы слухалі Яраслава Еўдакімава, Якава Навуменку, адразу разумелі, што гэта яны і ні з кім іх не маглі паблытаць. Цяпер часам слухаем маладых спевакоў і не можам зразумець, хто гэта.

***— Як лічыце, у чым прычына?***

